КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 29 (252) ◂ 22 ліпеня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**АЛЕГ РУДАКОЎ**

Стар. 6

**ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ ЦІ КАМЕРЦЫЙНЫЯ ІНТАРЭСЫ?**

Сталічны парк з «баявой» назвай Севастопальскі ўжо пятнаццаць гадоў ёсць прадметам канфлікту гарадскіх уладаў і жыхароў прылеглых дамоў

Стар. 5

**МАСКВЕ НАДАКУЧЫЎ СМІРНОЎ**

Пра тое, чаму прэзідэнт Прыднястроўя Ігар Смірноў, які кіраваў краем 20 гадоў, трапіў у апалу, журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з малдаўскім журналістам Сяргеем Дворскім

Стар. 29

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**

**НАСТУПНЫ НУМАР ГАЗЕТЫ ВЫЙДЗЕ 19 ЖНІЎНЯ!**

▸ **З НАГОДЫ**

# ЗАКОН І ЯГО ВЫКАНАННЕ

*Генадзь КЕСНЕР*

**Генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч прыехаў у Нацыянальны прэс-цэнтр 20 ліпеня, каб зрабіць справаздачу пра вынікі дзейнасці свайго ведамства за апошнія шэсць месяцаў. Але кіраўніку Генпракуратуры не ўдалося пазбегнуць адказаў на вострыя пытанні, якія цікавяць грамадства.**




Спачатку галоўны пракурор краіны, як і належыць высокапастаўленаму беларускаму чыноўніку, амаль паўгадзіны распавядаў пра дасягненні.

Напрыклад, у Беларусі, па словах Рыгора Васілевіча, за першае паўгоддзе бягучага года на 14% скарацілася агульная колькасць злачынстваў параўнальна з адпаведным перыядам года мінулага. На 8,8% менш стала забойстваў, што не можа не радаваць шараговага беларуса. Цікавым фактам стала і тое, што Беларусь займае першае месца ў СНД па раскрывальнасці злачынстваў — 65%! Гэта, як падкрэсліў генпракурор, супастаўляльна з Японіяй, а іншыя развітыя краіны кшталту Германіі і некаторых іншых па гэтым паказчыку знаходзяцца за намі. Як адзначыў Рыгор Васілевіч, толькі ў пазасудовым парадку пракурорскім працаўнікам удалося кампенсаваць матэрыяльныя страты ў бюджэт на 62 мільярды рублёў.

Аднак многіх журналістаў, якія прысутнічалі на прэс-канферэнцыі, цікавілі іншыя пытанні. Асабліва што тычацца іх магчымасцяў выканання прафесійных абавязкаў падчас вулічных акцый. Падчас несанкцыянаваных мерапрыемстваў у розных рэгіёнах Беларусі невядомыя асобы ў цывільным, не прадстаўляючыся, перашкаджалі працы журналістаў, хапалі іх, псавалі дарагую прафесійную тэхніку, затрымлівалі і дастаўлялі карэспандэнтаў як беларускіх, так і замежных СМІ ў пастарункі. Ад дзеянняў такіх «праваахоўнікаў» пацярпелымі толькі крыху больш за месяц апынуліся амаль дзевяноста журналістаў, некаторыя нават прайшлі праз адміністратыўныя арышты.

13 ліпеня трыццаць журналістаў накіравалі зварот да генпракурора і міністра ўнутраных спраў (з копіямі старшыні Вярхоўнага суда і міністру інфармацыі) з патрабаваннем даць адказы, хто нападае на карэспандэнтаў пры выкананні імі прафесійных абавязкаў і рэдакцыйных заданняў, а таксама пакараць вінаватых у супрацьзаконных дзеяннях. Рыгор Васілевіч адзначыў, што Генпракуратура аператыўна адрэагавала на зварот, і ўжо 15 ліпеня кіраўніцтву Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі быў накіраваны адпаведны ліст за подпісам генеральнага пракурора.

«У лісце я падкрэсліў, што ёсць Закон «Аб сродках масавай інфармацыі», што ёсць правы журналістаў, гарантаваныя артыкулам 34 Закона «Аб СМІ». Я ў лісце адзначыў, што правы журналістаў не павінны парушацца. Правы журналістаў павінны выконвацца, і гэта даўно павінна было ўвайсці ў практыку і стаць добрай традыцыяй. Я нават лічу, што прысутнасць на акцыях журналістаў можа змусіць супрацоўнікаў праваахоўных органаў дзейнічаць больш карэктна. Але і я вас заклікаў бы не перашкаджаць праваахоўнікам пры выкананні імі службовых абавязкаў», — сказаў генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь.

Адносна жорсткіх дзеянняў невядомых асоб у цывільным падчас акцый маўклівага пратэсту генпракурор заўважыў, што, па-першае, супрацоўнікі органаў унутраных спраў павінны быць у форме, але могуць быць і выключэнні ў залежнасці ад задач, якія перад імі ставяцца. «Яны мусяць папярэджваць, што парушаецца парадак, калі ён насамрэч парушаецца. Калі яны не ў форме, то, прынамсі, вы павінны ведаць, хто выстаўляе вам патрабаванні», — сказаў галоўны пракурор Беларусі.

Па словах Рыгора Васілевіча, зараз вядзецца праверка наконт гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да журналістаў падчас вулічных акцый. Тым не менш, прысутныя на прэс-канферэнцыі так і не пачулі канкрэтнага адказу генпракурора на галоўнае пытанне: якую структуру прадстаўляюць невядомыя ў цывільным, што ажыццяўляюць гвалтоўныя затрыманні як журналістаў, так і простых грамадзян.

Што да расследавання тэракту на станцыі метро «Кастрычніцкая», то Рыгор Васілевіч паведаміў, што абодва падазраваных — Канавалаў і Кавалёў — 14 ліпеня ўжо пачалі знаёміцца з матэрыяламі справы, ім для гэтага па закону адведзены месяц. Супраць службовай асобы, па віне якой у 2008 годзе былі страчаны адбіткі пальцаў аднаго з фігурантаў справы, заведзена крымінальная справа.

Цікавіла журналістаў і справа па трагедыі на «Пінскдрэве», у выніку якой загінулі людзі. «Па Арынічу (былы генеральны дырэктар прадпрыемства — заўв. Г. К.). Наколькі я ведаю, ён зараз знаходзіцца ў Польшчы. У вышук яго не абвяшчалі, бо пакуль няма звестак, што ён ухіляецца ад яўкі. Што тычыцца выстаўлення абвінавачання, то я не магу проста сказаць, каму яно будзе выстаўлена. Але некалькім чалавекам, відаць, яно будзе прад'яўлена», — сказаў Рыгор Васілевіч.

На пытанне, што чуваць пра асоб, якія 19 снежня 2010 года, яшчэ да завяршэння прэзідэнцкіх выбараў, збівалі экс-кандыдата на пасаду кіраўніка дзяржавы Уладзіміра Някляева, то зразумелага адказу ад генпракурора таксама не прагучала. Паводле Васілевіча, праверку ажыццяўляе пракуратура горада Мінска. «Пасля завяршэння праверкі і па яе выніках будзе прынята адпаведнае рашэнне», — запэўніў Рыгор Васілевіч.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ВЫЙСЦІ НА СВАБОДУ Ў КАЛОНІІ

Таццяна ШАПУЦЬКА

**Цяжка ўявіць, што, знаходзячыся ў турме, чалавек можа быць на свабодзе. Тым не менш, ужо трэці месяц палітвязень Мікіта Ліхавід не выходзіць на свабоду ў наваполацкай калоніі — не выходзіць з карцару, ці, як афіцыйна называецца гэтая турэмная камера — штрафнога ізалятара (ШІЗА).**



І гэта сапраўдная шыза. Карцар забірае ў зэкаў усе тыя маленькія радасці, якія хоць неяк палягчаюць іх турэмнае жыццё: спатканні, тэлефонныя размовы, «шопінг» у турэмнай краме, атрыманне перадач, шпацыры на свежым паветры, ліставанне, гулянне ў настольныя забаўкі — спрадвечны ўлюбёны занятак вязняў! У штрафным ізалятары нават не выдаецца пасцельная бялізна!

Напэўна, працей пералічыць тое, што дазваляецца тым гаротным, хто праштрафіўся. Умовы ўтрымання вязняў у штрафным ізалятары, апісаныя ў «Крымінальна-выканаўчым кодэксе» выглядаюць зусім інакш, калі думаеш, што 20-гадовы танклявы Мікіта Ліхавід вымушаны ім падпарадкоўвацца дзень за днём, тыдзень за тыднем, месяц за месяцам…

Вы ўяўляце, як гэта — праводзіць доўгія дні, якія немагчыма скараціць напісаннем лістоў ці гульнямі, на голых нарах, без магчымасці ўбачыць ці хаця б патэлефанаваць маці? Як гэта — месяцамі не выходзіць з цёмнай камеры і не бачыць сонца з небам? Як распавёў Мікіта адвакату, яны з таварышамі па камеры дасталі шкло з вакна карцара, каб атрымаць хоць глыток свежага паветра. Выглядае на змрочную фантазію, але гэта — рэальнасць на адлегласці пару соцень кіламетраў ад Мінска.

Мікіта Ліхавід трапляе пад жорсткія меры з-за таго, што публічна называе сябе «незаконна асуджаным» і адмаўляецца выконваць зарадку нароўні з іншымі вязнямі — проста стаіць на месцы. Адміністрацыя калоніі трактуе гэта як парушэнне правілаў адбыцця пакарання. Паводле словаў юнака, ён не можа паводзіць сябе інакш, бо гэта будзе азначаць, што ён здаўся.

Аднак далей Ліхавіда можа чакаць заключэнне ў памяшканне камернага тыпа (накшталт СІЗА), адзіночную камеру ці новая крымінальная справа. У нашых сілах спыніць гэты нарастаючы ком гвалту — неабходна лістамі, паштоўкамі, тэлеграмамі даказаць хлопцу, што ён ужо праявіў сябе годным і мужным барацьбітам, што мы клапоцімся пра ягонае здароўе і жыццё, якое без перабольшання знаходзіцца пад пагрозаю.

Важна пісаць і кіраўніку наваполацкай калоніі сп. Сівоху, матывацыя якога зразумелая — не дапусціць бунту вязняў, якія могуць паследаваць прыкладу Мікіты. Але ж аналагічны бунт можа наступіць і зараз, калі зэкі бачаць несупынныя катаванні 20-гадовага хлопца. Сп. Сівоха, за ўсё, што адбываецца з Мікітам Ліхавідам, адказнасць ляжыць персанальна на вас — дык можа не так і важна, ці робіць ён практыванні зранку?

Адрас калоніі: 211440 Віцебская вобл., г. Наваполацк, вул. Тэхнічная, 8, папраўчая калонія № 10.

САЮЗНІКІ

# ПУЦІН ШКАДУЕ

**Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін выказвае шкадаванне ў сувязі з напружанасцю, што ўзнікла ў адносінах паміж Расіяй і Беларуссю. Пра гэта ён заявіў 19 ліпеня ў Маскве на сустрэчы з прадстаўнікамі рэлігійных і грамадскіх арганізацый Расіі.**



«Мне толькі застаецца шкадаваць аб гэтым. Мы са свайго боку робім і будзем рабіць усё, каб гэтага ніколі не было. Але мяне сапраўды непакоіць гэта. Я бачу, што цяпер, нават на бытавым узроўні, ужо ўзнікаюць праблемы. Гэта вельмі дрэнна», — цытуе Пуціна РІА «Новости».

Заява Пуціна прагучала ў адказ на словы старшыні Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Валерыя Казакова, які выказаў занепакоенасць напружанасцю, што ўзнікла ў апошні час у расійска-беларускіх адносінах. «Нашы суайчыннікі вельмі занепакоеныя тым, што эканамічныя і іншыя дзяржаўныя нестыкоўкі выходзяць у публічную плоскасць», — сказаў Казакоў.

БелаПАН

АКЦЫЯ

# СВЯТА БЕЛАРУСІ АДСВЯТКУЮЦЬ У КІЕВЕ

**27 ліпеня 2011 года ў Кіеве каля помніка Уладзіміру Караткевічу побач з амбасадай Рэспублікі Беларусь адбудзецца акцыя, прысвечаная 21-й гадавіне абвяшчэння Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі.**



Заяўнікамі акцыі выступаюць старшыня Руху Салідарнасці «Разам» Вячаслаў Сіўчык і старшыня «Правага Альянсу» Юрась Карэтнікаў, якія вымушаны зараз знаходзіцца на Украіне.

Палітык Вячаслаў Сіўчык адзначыў: «Сёння ў нашай краіне пануе антыбеларускі рэжым, які адмяніў святкаванне Дня Незалежнасці як дзяржаўнага свята, абвясціўшы вайну свайму народу. Толькі за апошнія месяцы тысячы беларусаў былі арыштаваныя за свае перакананні і волю; больш за 40 грамадзян-палітвязняў адбываюць турэмныя пакаранні ад 2 да 6 гадоў. Акцыя 27 ліпеня ў Кіеве — гэта праява салідарнасці з тымі, хто пакутуе за Беларусь».

Нагадаем, Дэкларацыя ад 27 ліпеня 1990 года абвясціла Беларусь суверэннай дзяржавай, «усталяванай на аснове здзяйснення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, верхавенства народа ў вызначэнні свайго лёсу». Згодна з Дэкларацыяй, носьбітам суверэнітэту краіны і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады з'яўляецца беларускі народ. 25 жніўня 1991 года Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце набыла статус Канстытуцыйнага Закону.

У акцыі прымуць удзел беларусы, прадстаўнікі ўкраінскіх палітычных партый, грамадскіх арганізацый, грамадзяне Украіны. Пачатак акцыі запланаваны на 12.00.

Андрэй Качаткоў

ЭКСПАРТ

# ЗБРОЯ З БЕЛАРУСІ

**У 2010 годзе Беларусь прадавала звычайнае ўзбраенне ў Емен, Судан, Нігерыю, Уганду і Азербайджан.**

У Рэгістры ААН па звычайных узбраеннях з'явіліся звесткі пра здзелкі Беларусі на сусветным збраёвым рынку. Так, у Емен у 2010 годзе было пастаўлена 66 танкаў Т–80, у Судан — адзін штурмавік Су–25, у Нігерыю — два ўдарныя верталёты Мі–24, на Уганду — адзін Мі–24, у Азербайджан — адзін штурмавік Су–25 і 30 122-міліметровых гаўбіц Д–30, што буксіруюцца. Уся зброя — вытворчасці Расіі (СССР). Сумы кантрактаў не называюцца.

Нагадаем, у 2009 годзе Беларусь паставіла ва Уганду 23 танкі Т–55, у Азербайджан — пяць штурмавікоў Су–25 і дзевяць самаходных гаўбіц 2С7 «Пион» 203 мм, у Судан — тры штурмавікі Су–25.

У 2008 годзе ў Азербайджан былі пастаўлены тры самаходныя гаўбіцы 2С7 «Пион» 203 мм. У Сірыю прададзена 33 шматцэлевыя знішчальнікі са зменнай стралападобнасцю крыла МіГ–23. 11 штурмавікоў Су–25 пастаўлена ў Судан. Расія закупіла ў Беларусі 15 ракет «паветра-паветра» Р27–Р для знішчальнікаў Су–27 і МіГ–29.

У 2007-м Беларусь прадала ў Судан два бронетранспарцёры БТР–70, мадэрнізаваныя да ўзроўню «Кобра К2К» і «Кобра К2». У Арменію — 10 122–міліметровыя гаўбіцы Д–30, якія буксіруюцца, у Эрытрэю — дзевяць рэактыўных сістэм залпавага агню «Ураган».

У 2006-м — у Азербайджан 41 танк Т–72.

У 2005-м — у Азербайджан 19 танкаў Т–72, у Славакію — два ваенна-транспартныя верталёты Мі–8, у Джыбуці — два ўдарных верталёты Мі–24.

Гэта інфармацыя была змешчана ў Рэгістры ААН па звычайных узбраеннях у пачатку чэрвеня 2006 года. Потым даныя пра здзелкі са Славакіяй зніклі.

У 1996–2004 гадах— у Перу (самалёты), Конга (артсістэмы), Папуа — Новую Гвінею (верталёты), Сьера-Леонэ (верталёты), Эфіопію (танкі), Заір (артсістэмы), Уганду (верталёты), Марока (танкі), ААЭ (баявыя браніраваныя машыны), Украіну (самалёты), Іран (танкі), Алжыр (самалёты), Судан (артсістэмы, баявыя браніраваныя машыны), Кот-д'Івуар (баявыя браніраваныя машыны, артсістэмы, мінамёты, верталёты, самалёты), Швецыю (ракеты да ПЗРК).

Вячаслаў Будкевіч, БелаПАН

ЦЭНЫ

# ЖЫЦЦЁ ДАРАЖЭЕ

**Паводле інфармацыі, апублікаванай Міністэрствам эканомікі, з пачатку года прырост індэксу спажывецкіх цэн склаў 38,5%. У студзені чэрвені гэты паказчык склаў 36,2%. Пры гэтым за першы тыдзень чэрвеня прырост склаў 2,6%, за другі — 4,1%, за трэці — 5,4%, за ўвесь чэрвень — 8,6%.**

За першы тыдзень ліпеня цэны на харчовыя тавары вырaслі на 1,7%, у тым ліку на мяса і мясапрадукты — на 2,2%, рыбу і рыбапрадукты — 4,4%, малако і малочныя прадукты — 0,6%, яйкі курыныя — 2,6%, алей — 4,5%, крупы — 1,6%, хлеб і хлебабулачныя вырабы — на 1,4%, кандытарскія вырабы — на 4,2%, алкагольныя напоі — на 1,8%, чай — на 2,2%.

Нехарчовыя тавары падаражэлі на 1,3%, у тым ліку медыкаменты — на 5,6%. Кошт паслуг вырас на 2%, у тым ліку сувязь — на 7,2%, медыцынскія — на 6,1%.

БелаПАН

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# КОШТЫ РАСТУЦЬ, ЧЫНОЎНІКІ МРОЯЦЬ

Генадзь КЕСНЕР




**Што б ні казалі высокапастаўленыя чыноўнікі айчыннай эканоміцы, кшталту загадаў «стаяць» ці яшчэ якіх, перастала гэтая самая эканоміка іх слухацца. Кошты растуць, а тут яшчэ і ўласны «плебс» спакою не дае. Серада ўжо, бадай, сталася праклятым днём для беларускіх уладатрымцаў.**

Дзявятым разам праходзіла 20 ліпеня «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» ў розных рэгіёнах Беларусі. Пра плён падобных акцый аўтар гэтых радкоў разважаць не збіраецца, аддаўшы права на гэта калегам. Толькі адзначу: зноў амбалы ў цывільным хапалі людзей. Зноў апладысменты сталіся прычынай для затрыманняў. На што нават пасол нашай усходняй саюзніцы Аляксандр Сурыкаў адрэагаваў заўвагай, што хапаць за тое людзей — перабор беларускіх уладаў і што ў яговай краіне апладысменты не з'яўляюцца чымсьці забароненым.

Той жа Сурыкаў чарговым разам апусціў беларускае начальства на зямлю. Гэта ўжо пра эканоміку, хоць і з палітычным адценнем. Зноўку гаворка вялася аб продажы Расіі «Белтрансгазу». Тутэйшы ўрад спіць і бачыць, як бы загнаць айчынную газатранспартную сістэму па найлепшым кошце, ды яшчэ і цэны на будучыя пастаўкі блакітнага золата абумовіць сабе на карысць.

А вось усходняя сястрыца стала ў позу, не вельмі прывабную для беларускага кіраўніцтва. То віцэ-прэм'ер расійскага ўраду, які лічыцца правай рукой Уладзіміра Пуціна, Ігар Сечын заяўляе, што і раней за 50 працэнтаў «Белтрансгазу» Расія пераплаціла, а зараз і пасол Сурыкаў кажа, што Беларусі няма чаго патрабаваць ад Расіі нават за тыя вайсковыя базы, што месяцца на нашай тэрыторыі. Маўляў, Расійская Федэрацыя выплачвала пазыкі СССР, у тым ліку і беларускія (БССР), так што сядзіце і маўчыце.

А калі сур'ёзна, то, на думку расійскага дыпламата, 2,5 мільярда долараў, якія Беларусь магла б атрымаць за другую палову акцый «Белтрансгаза», зараз былі б ёй вельмі дарэчы: «Інфляцыя, падзенне рэальных прыбыткаў насельніцтва, хоць эканоміка, відаць, працуе… Добра грамадству? Кепска. Улада губляе свой давер у грамадстве. Што рабіць у такой сітуацыі? Эканоміка — яна інерцыйная. Пакуль набярэ вагу экспарт, колькі гадоў трэба чакаць. Таму мой пункт гледжання такі: вось гэтыя два з паловай мільярды долараў за «Белтрансгаз» былі б вельмі патрэбныя цяпер. І, на мой погляд, перамовы мусяць быць завершаны як мага хутчэй. Частку атрыманых грошай варта было б накіраваць у залатавалютныя рэзервы, а частку — у інтэрвенцыі на валютны рынак, каб прывесці беларускі рубель да адзінага курса. Няхай нават і да гэтага, які Нацбанк лічыць аб'ектыўным, — 5 тысяч рублёў за долар. І пачнецца адлік у росце прыбыткаў насельніцтва. Вось што важна для краіны зараз, і гэтыя рэсурсы маглі б такую задачу вырашыць».

Калі слухаеш расійскага пасла, такое ўражанне, што ўсё проста і ўсё ляжыць на паверхні. Дык чаму тады відавочнае не бачна беларускім чыноўнікам? Прэм'ер Беларусі кажа пра гатоўнасць прадаваць беларускія прадпрыемствы і нават называе канкрэтныя расійскія кампаніі, гатовыя хоць заўтра набыць тутэйшую ўласнасць, а расіяне тым часам наўскапыта імкнуцца абвергнуць заявы беларускіх урадоўцаў. Хто каго трымае за дурня? А беларускія чыноўнікі, тым часам, не перастаюць мроіць пра мільярды крэдытных ці прыватызацыйных долараў…

Чарговы сюрпрыз для беларускіх аўтааматараў. Ад чацвярга падаражэла паліва — і бензін, і дызель. Прычым, дызель зноўку апярэдзіў свайго больш светлага і складанага ў вытворчасці сваяка. Так, цяпер літр АІ-95 каштуе 4650 рублёў (быў 4500), АІ-92 — 4300 (быў 4200), дызпаліва — 4650 (было 4450). Бензін Н-80 цяпер абыходзіцца ў 4200 айчынных грашовых адзінак (быў 4000). Такім чынам, ад новага года паліва падаражэла ў сярэднім у два разы. Прыўкрасна, як казаў наш славуты Уладзімір Караткевіч.

20 ліпеня споўнілася трыццаць гадоў Змітру Дашкевічу, імя якога добра вядома ў беларускіх палітычных колах. Свой юбілей лідар зарэгістраванай у Чэхіі Міжнароднай моладзевай арганізацыі «Малады фронт» сустрэў у карцэры Горацкай калоніі агульнага рэжыму, куды актывіста на два гады ўпяклі за быццам бы збіццё двух асоб, якія на судовым працэсе нават не паказалі сваіх твараў. Яшчэ адзін малады актывіст — сябра Руху «За свабоду» Мікіта Ліхавід, якога асудзілі за ўдзел у падзеях 19 снежня 2010 года і які дагэтуль не прызнаў сваёй віны, у карцэры правёў ужо 55 (!) дзён. А яго маці Алена 20 ліпеня аказалася ў ліку затрыманых удзельнікаў акцыі маўклівага пратэсту. Проста прыклады гуманізму з боку ўладаў!

І яшчэ падзея, пра якую грамадскасці стала вядома 20 ліпеня. Прыведзены ў выкананне расстрэльны прысуд у дачыненні да 28-гадовага і 29-гадовага грамадзян Беларусі, жыхароў Гродна. Абодва шукалі літасці ў кіраўніка дзяржавы, але памілавання не дачакаліся. Не прыводзіць смяротны вырак беларускіх уладоўцаў заклікалі айчынныя і замежныя праваабаронцы. Безвынікова.

Можна па-рознаму ставіцца да забойцаў трох чалавек, але трэба і памятаць, што Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе, дзе існуе смяротнае пакаранне ў якасці найвышэйшай меры. З гэтай прычыны Беларусь — адзіная краіна на кантыненце, якая не ёсць сябрам Савета Еўропы. Ці можам мы ганарыцца гэтым фактам? Дарэчы, помста, няхай і такім замацаваным законам дзікунскім чынам, ніколі не была лекам для грамадства. Чалавечае жыццё — дар Божы, і не чалавеку яго адымаць, няхай ён і у судзейскай мантыі. Бо ёсць яшчэ і Суд, непадуладны чалавеку.



## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### СЯРГЕЙ ГАЙДУКЕВІЧ



Лідар Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Сяргей Гайдукевіч у чарговы раз зрабіў правакацыйную палітычную заяву. Ён заклікаў Аляксандра Лукашэнку адправіць у адстаўку ўрад, прызнаць Паўднёвую Асецію з Абхазіяй, правесці датэрміновыя парламенцкія выбары, вызваліць палітвязняў. «Здыміце і адпраўце ў адстаўку ўрад, які ў народзе атрымаў назву «часовы». Яны давялі эканоміку да крызісу», — заявіў Сяргей Гайдукевіч у інтэрв'ю агенцтву Інтэрфакс. Палітык таксама заклікаў Лукашэнку ўсталяваць адзіны курс валюты. «Гэта трэба рабіць сёння. Чакаць, нічога не робячы, — дурасць. Курс будзе і далей падаць, і гэта зразумела ўсім», — падкрэсліў ён.

Гайдукевіч мяркуе, што Лукашэнка павінен нарэшце «павярнуцца тварам да Расіі». «Падзякуйце Расіі за вялікую дапамогу, якую яна заўсёды аказвала і дзякуючы якой быў магчымы так званы наш беларускі эканамічны цуд», — сказаў палітык.

Гайдукевіч таксама заклікаў Лукашэнку сесці за стол перамоваў з ЕС і памілаваць «усіх затрыманых і пасаджаных за краты за падзеі 19 снежня 2010 года». «І не трэба пераследаваць няшчасных людзей, даведзеных да адчаю бяздарнай эканамічнай палітыкай ураду», — дадаў Гайдукевіч.

Палітык прапануе прызначыць на вясну 2012 года парламенцкія выбары па партыйных спісах. А не так даўно Гайдукевіч выказваўся наконт вулічных мірных акцый пратэсту, што ладзяцца па ўсёй краіне кожную сераду. «Я доўга маўчаў. 29 красавіка я заклікаў кіраўніцтва краіны да адстаўкі. Казаў, што гэтыя людзі не могуць кіраваць краінай, паабяцаў, што я не буду карыстацца сітуацыяй. Але тое, што зараз адбываецца, калі па рэспубліцы за 30 дзён затрымана больш за 800 чалавек... Я гэтага трываць больш не магу!.. Цярпенне маё і маіх прыхільнікаў на зыходзе. У сераду спыняць сваіх людзей я не буду, я не маю маральнага права. Людзі нічога не робяць. Я папярэдзіў улады, тое, што яны робяць, дабром не скончыцца. Гэта ўсё выльецца восенню», — цытуе «Еўрарадыё» палітыка.

### АЛЯКСАНДРА НЯХАЙ



Прадстаўніца Беларусі Аляксандра Няхай увайшла ў лік лаўрэатаў трэцяй прэміі IX Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск–2011». Дзевяцігадовая салістка хору «Малінкі» пры музычнай школе № 4 Мінска і салістка ансамбля танца «Равеснік» падзяліла гэтую ўзнагароду ў тысячу долараў з удзельніцай з Украіны Мар'янай Шчарбак і канкурсантам з Балгарыі Марцінам Йарданавым, — перадае БелаПАН.

Другую прэмію ў дзве тысячы долараў міжнароднае журы таксама вырашыла падзяліць. Яна дасталася прадстаўніцы Латвіі і выканаўцу з Азербайджана.

Першая прэмія ў тры тысячы долараў адправіцца ў Казахстан разам з юнай спявачкай Куралай Мейрамбек, якая кранула журы і гледачоў выдатным выкананнем песні на беларускай мове. Многіх здзівіла, што дзевяцігадовая дзяўчынка, пераможца і лаўрэат розных фестываляў дзіцячай творчасці ў сябе на радзіме, спявала без характэрнага акцэнту, які звычайна бывае ў выхадцаў з неславянскіх дзяржаў.

Гран-пры цяперашняга дзіцячага конкурсу, як і летась, з'едзе ў Румынію. Гэтым разам яго заваявала 10-гадовая Ралука, неаднаразовая пераможца розных нацыянальных і міжнародных пеўчых конкурсаў. У мінулы раз перамогу на віцебскім конкурсе святкаваў яе суайчыннік Марыё. Вышэйшая ўзнагарода дзіцячага конкурсу складае пяць тысяч долараў.

У IX Міжнародным дзіцячым музычным конкурсе «Віцебск–2011» удзельнічалі 23 юныя выканаўцы з 20 краін. Беларусь, Расію і Украіну традыцыйна прадстаўлялі па два канкурсанта. Журы конкурсу ўзначальваў заслужаны артыст Расіі Сяргей Шусціцкі. Беларусь у судзейскай камісіі прадстаўляў уладальнік Гран-пры дарослага конкурсу ў 2004 годзе Пётр Ялфімаў.

Леташні дзіцячы конкурс прынёс Беларусі аналагічны вынік: Злаце Ларчанка ўдалося падняцца толькі на трэцюю прыступку.

### АЛІНА ТАЛАЙ




Беларуска Аліна Талай атрымала званне чэмпіёнкі Еўропы сярод моладзі ў бегу на 100 метраў з бар'ерамі. Спаборніцтвы чэмпіянату Еўропы па лёгкай атлетыцы сярод моладзі (да 23-х гадоў) праходзілі ў Астраве (Чэхія). На трэці дзень спаборніцтваў, званне чэмпіёнкі Еўропы ў бегу на 100 метраў з бар'ерамі заваявала Аліна Талай з вынікам 12,91 хвіліны. «У паўфінале Аліна Талай, якая стартавала ў трэцім забегу, упэўнена выйграла і з другім вынікам выйшла ў фінал, — распавялі ў федэрацыі лёгкай атлетыкі. — Лідарам па выніках паўфіналу стала швейцарка Ліза Урэх з вынікам 13,01 хвіліны».

У Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі адзначылі, што ў скарбонцы беларускай каманды тры медаля: 1 залатая (Аліна Талай — 100 метраў з бар'ерамі) і 2 срэбныя (Анастасія Каштанава — кіданне дыска, Эдуард Міхан — дзесяціборʼе).

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ



# СІЛА ЁСЦЬ…

Сяргей НІКАЛЮК

**Там, дзе дзяржава выведзена па-за межы дзеяння ўніверсальных законаў, не можа скласціся сучасная нацыя.**



Пачну з анекдота. Неяк Вовачка, падгледзеўшы, чым бацькі займаюцца ў ложку, усклікнуў: «І гэтыя людзі забараняюць мне калупацца ў носе!» Абурэнне дзіцяці зразумелае. Патрэба ў справядлівасці — адна з базавых. Калі яна не задавальняецца, то разлічваць на сацыяльную стабільнасць не даводзіцца. Беларусам у гэтым сэнсе пашанцавала: справядлівае размеркаванне матэрыяльных выгод ім гарантуе «беларуская эканамічная мадэль развіцця». Гэта ёй яны абавязаны зарплатай у 500 долараў. У беларусаў на варце палітычных правоў, прапісаных у Канстытуцыі, стаіць самыя шматлікія ў Еўропе (у пераліку на душу насельніцтва) сілавыя структуры.

Свой унёсак ў прававую гармонію ўносіць і судовая сістэма. Як тут ні ўспомніць словы, што прагучалі на яе адрас на трэцім з'ездзе суддзяў: *«Наши суды сумели избежать политизации и коммерциализации в своей работе и при рассмотрении дел основываются исключительно на принципах законности и справедливости»*.

## Універсальнасць крайняга выпадку

У прыведзенай вышэй цытаце побач са словам «справядлівасць» апынулася слова «законнасць». Хочацца верыць, што не выпадкова. Палітолагі вызначаюць тры асноўныя злучальныя субстанцыі, што ўтрымліваюць людзей у межах вялікіх грамадстваў, прыватным выпадкам якіх з'яўляюцца дзяржавы. Гэта сіла, вера і закон. Зразумела, што іх суадносіны змяняліся ў працэсе гістарычнага развіцця. Першапачаткова панавала сіла. Са з'яўленнем сусветных рэлігій рэзка павялічылася значэнне веры. Закон выйшаў у лідары ўжо ў Новы час.

Сам па сабе закон не з'яўляецца выключна прадуктам Новага часу. Дастаткова ўзгадаць законы Хамурапі, якім каля 4 тысяч гадоў. Аднак заканадаўцы Месапатаміі стваралі законы ў першую чаргу як інструмент рэалізацыі і абароны дзяржаўных інтарэсаў, а не як інструмент рэалізацыі прынцыпаў справядлівасці ці абароны правоў шараговых грамадзян.

Кажучы сучаснай мовай, такія законы не валодалі ўніверсальнасцю (лац. «universalis» — «агульны»). На думку нямецкага філосафа Карла Ясперса, для надання ўніверсальнасці юрыдычным законам чалавецтву спатрэбілася два інтэлектуальныя прарывы. Першы быў здзейснены высілкамі Канфуцыя ў Кітаі, Буды — у Індыі, філасофамі — у Грэцыі, прарокамі — у Ізраілі. «У эту эпоху были распрацаваны асноўныя катэгорыі, якімі мы мыслім і зараз, закладзены асновы сусветных рэлігій, якія і сёння вызначаюць жыццё людзей».

Гэта ўніверсальнасць, паводле меркавання Ясперса, стварыла духоўную вось першага восевага часу, што кансалідуе чалавецтва. Другі восевы час бярэ свой пачатак ад эпохі Адраджэння. Менавіта ў той час побач са статычнай універсальнасцю Бога ўзнікае ўніверсальнасць чалавечых ведаў, арыентаваных на сталае развіццё. Адсюль ужо рукой дастаць да ўніверсальнасці грамадзянскіх правоў.

Але гэтага жэсту беларуская ўлада зрабіць так і не здолела. Яна затрымалася ў першым восевым часе і спрабуе адтуль кіраваць працэсам мадэрнізацыі эканомікі. Вазьміце любы выступ «адзінага палітыка» (АП), да прыкладу, на тэму дарагоўлі газетнай паперы: *«В Беларуси и России все надо продавать по одной цене. В крайнем случае, для государственных газет — так как это госпредприятия, мы в них вложили деньги — можно предоставить скидку…»*

Адчуваеце подых сярэднявечча? «Мы ў іх (дзяржпрадпрыемствы) уклалі грошы». Прабачце, а чые грошы вы ўклалі? Дзяржаўныя? Адкрыйце Канстытуцыю і прачытайце артыкул пад нешчаслівым 13-м нумарам. Ён пра тое, што «дзяржава дае ўсім роўныя правы для ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці».

**Калі людзі ў цывільным без «апазнавальных знакаў» здзяйсняюць затрыманні ўдзельнікаў мірных акцый, гэта індыкатар няздольнасці дзяржавы выконваць свае функцыі**

Што да дзяржаўных грошай, то не варта блытаць божы дар з яечняй. Сваіх грошай у дзяржавы няма, хіба што чыноўнікі адмовяцца ў абед ад кампоту з сухафруктаў, а зэканомленыя такім чынам сродкі пачнуць пераводзіць у фонд падтрымкі дзяржаўнай прэсы.

## Што вядзе да багацця?

Закон як універсальнае панцце не здольны функцыянаваць у палітычных сістэмах, якія не выконваюць прынцып падзелу ўладаў. Усё роўна, ці ідзе гаворка пра класічнае самадзяржаўе, ці пра яго сучасныя варыянты, якія рэалізуюцца ў суперпрэзідэнцкіх рэспубліках. Калі кіраўнік дзяржавы сам з'яўляецца крыніцай права, то законы пазбаўляюцца свайго ўніверсальнага значэння. «Строга кажучы, — адзначае палітолаг Ігар Клямкін, — паслядоўнае правядзенне прынцыпу законнасці не ў стане забяспечыць ніякая ўлада, якая прэтэндуе на манаполію».

З года ў год беларускія чыноўнікі зрываюць планы па прыцягненні замежных інвестыцый. Чым толькі інвестараў не заваблівалі! Тым часам рынкавая эканоміка — гэта законна народжанае дзіця другога восевага часу. Рынак сам па сабе з'яўляецца «эмпірычнай універсальнасцю», яго на льготах, гарантаваных указамі першай асобы дзяржавы, не пабудаваць.

У свеце сёння прастойвае каласальная колькасць вытворчых магутнасцяў, і сотні мільярдаў непрыкаяных долараў цыркулююць па сусветнай фінансавай сістэме ў пошуку годных аб'ектаў для інвеставання. Чым можа быць цікавая «беларуская эканамічная мадэль» для гэтай збытковай грашовай масы? Можа, унікальным па ўзроўні прафесіяналізму ўрадам, ад якога *«спички в доме надо прятать»*?

Там, дзе дзяржава выведзена за межы дзеяння ўніверсальных законаў, не можа скласціся сучасная нацыя. Для разумення гэтай азбукавай ісціны дастаткова звярнуцца да досведу Савецкага Саюза з яго атамізаваным насельніцтвам. Савецкі чалавек для рашэння сваіх праблем не адчуваў патрэбы ў аб'яднанні ні з суседзямі па пад'ездзе, ні з калегамі па працы. Ён шукаў выхад на патрэбнага чыноўніка і вырашаў з ім свае праблемы ў індывідуальным парадку.

Ці варта пасля гэтага дзівіцца, што ў 1993 годзе сярод адказаў на пытанне «Што часцей за ўсё вядзе да багацця?» у лідарах апынуліся асабістыя сувязі (72%), на другім месцы — несумленнасць (56%), на трэцім з вялікім адставаннем размясцілася праца (37%), а на апошняе беларусы паставілі адукацыю — 22% (па дадзеных НІСЭПД). Вось і думай пасля гэтага, чаму ў спаборніцтве двух сістэм перамаглі амерыканцы, а не дзяржава працоўных і сялян.

Калі людзі ў цывільным без «апазнавальных знакаў» здзяйсняюць затрыманні ўдзельнікаў мірных акцый, гэта індыкатар няздольнасці дзяржавы выконваць свае функцыі ў рамках ёй жа створаных законаў. З такой дзяржавай у беларусаў няма шанцаў не толькі на дасягненне еўрапейскага ўзроўню жыцця, але і на тое, каб сфармаваць сучасную нацыю.

## Урокі грузінскага

У ліпені расійская кансалтынгавая кампанія ФБК апублікавала аналітычны даклад «Рэйтынг прагрэсу». Расія ў гэтым рэйтынгу заняла 97-е месца з 101-го, а Грузія — першае. На апошнім месцы апынулася Балівія, што і не дзіўна. Краіна імкліва дэградуе пасля перамогі на прэзідэнцкіх выбарах у 2006 годзе чалавека з народа Эва Маралеса. Гэта па яго ініцыятыве была прынята новая канстытуцыя, якая істотна пашырыла паўнамоцтвы выканаўчай улады, былі усталяваны дзяржаўны кантроль за прыроднымі рэсурсамі і пераразмеркаваныя землі на карысць дзяржавы.

У Грузіі паступілі з дакладнасцю да наадварот. Беларусы, якія калоцяцца над сваім «фамільным срэбрам», будуць здзіўленыя, калі даведаюцца, што электрычнасць у Тбілісі пастаўляе кампанія ТЭЛАС, што належыць на 80% расійскай «ІНТЭР РАО ЕЭС», асноўным акцыянерам якой з'яўляецца расійская дзяржава. Міністр Грузіі па пытаннях эканамічнай рэформы Каха Бендукідзэ мяркуе: «Нягледзячы на вайну і акупацыю, у нас ёсць расійскія інвестыцыі, якія існуюць, якія добра працуюць, зарабляюць прыбытак, і нічога з ім не адбываецца. І гэта якраз, мне здаецца, адзін з важных довадаў, які разглядае кожны інвестар, калі прыходзіць у нашу краіну».

Мне не раз даводзілася адзначаць, што сіла беларускай дзяржавы вызначаецца яе здольнасцю канцэнтраваць рэсурсы. У 1995 годзе, калі ўлада яшчэ не была паднятая з бруду, у якім яна апынулася ў гады Перабудовы, прыбытковая частка кансалідаванага бюджэту ў Беларусі складала 29% ВУП, а ў 2008 годзе, паслядоўна нарошчваючы сваю ролю ў эканоміцы, родная дзяржава давяла дадзены паказчык да 51%.

Зразумела, і Грузія без бюджэту жыць не можа. У 2003 годзе пры Шэварнадзэ здолелі сабраць 13% ВУП. Такі нізкі паказчык азначае крайнюю ступень дэградацыі дзяржавы (грузінскі варыянт улады, якая валяецца ў брудзе). Новая каманда пад кіраўніцтвам Саакашвілі пачала сваю рэфарматарскую дзейнасць са зніжэння падаткаў і сабрала ў 2004 годзе 22% ВУП. У паўтара разы больш! Чаму? «Таму што, — паводле меркавання Бендукідзэ, — паралельна з эканомікі быў зняты вось гэты гнёт карупцыі і гнёт вось гэтага залішняга бессэнсоўнага рэгулявання, якое карупцыю, у тым ліку, і спараджала».

У грузінскай мадэлі маюцца і апаненты. Напрыклад, экс-спікер парламента Ніно Бурджанадзэ мяркуе, што яна паводле ўсіх параметраў саступае беларускай. Спасылаючыся на афіцыйныя дадзеныя, спадарыня Бурджанадзэ прывяла 8 ліпеня наступнае параўнанне ў эфіры «Эхо Москвы»: «Мінімальная пенсія ў Грузіі — 50 лары, гэта прыкладна 25 еўра, у Беларусі — гэта дзесьці 125–130 еўра. Сярэдняя зарплата ў Грузіі — 500 лары, гэта прыкладна 250–230 еўра, а ў Беларусі — 560 долараў, гэта значыць у паўтара разы больш».

Вуснамі экс-спікера добра мёд піць. На 1 ліпеня сацыяльная пенсія ў рэспубліцы склала 287 тысяч рублёў, што адпавядае 40 еўра па афіцыйным курсе, але дзе сёння ў Беларусі па такім курсе можна набыць еўра? Што да сярэдняй зарплаты, то ў маі ад былых 536 долараў засталося 326 (233 еўра па афіцыйным курсе).

* * *

Беларуская мадэль здольная хоць неяк функцыянаваць толькі пры льготных коштах на расійскія энерганосьбіты. Грузінская мадэль развіваецца ва ўмовах эканамічнай блакады з боку Расіі. Але галоўныя поспехі Грузіі вымяраюцца не працэнтамі росту ВУП. Хто б мог уявіць, што самая карумпаваная з савецкіх рэспублік, якая ўпэўнена лідзіруе па колькасці злодзеяў у законе на душу насельніцтва, сёння ў стане дарыць кожнаму першакласніку ноўтбук і запрашаць у краіну паўтары тысячы выкладчыкаў англійскай мовы з англамоўных краін.

ДЭТАЛІ

# ТАКАЯ РОЗНАЯ САЦЫЯЛОГІЯ

Марыя КАРОЛЬ

**Ад пачатку лета ў краіне кожны тыдзень адбываюцца маўклівыя акцыя пратэсту. Незадаволенасць уладамі, калі меркаваць па рэпліках і крэпкіх слоўцах, што сыплюцца на адрас кіраўніцтва краіны ў крамах, на рынках, у грамадскім транспарце, з кожным днём расце. Але афіцыйныя органы ўсяляк імкнуцца стварыць новы міф: нават у крызіснай Беларусі людзі жыццём задаволеныя і больш таго — багацеюць!**

Інфармацыйна-аналітычны цэнтр (ІАЦ) пры адміністрацыі прэзідэнта Беларусі ў чэрвені бягучага года правёў тэлефоннае апытанне. Атрыманыя вынікі як мінімум месяць выклікаць гонар за стойкасць беларусаў. Амаль 60 працэнтаў рэспандэнтаў «задаволеныя сваім жыццём» нават ва ўмовах эканамічнага крызісу. Колькасць незадаволеных жыццём з мая 2011 года, паводле версіі ІАЦ, нават скарацілася на 4,5% і склала 39%. Яшчэ 9 працэнтаў беларусаў ва ўмовах крызісу адзначылі паляпшэнне свайго матэрыяльнага становішча! Атрымліваецца, што амаль кожны дзясяты беларус на крызісе, дэфіцыце і дэвальвацыі багацее — краіна цудаў!

У такіх варунках натуральным падаецца, што абсалютная большасць апытаных — 95,6% — не маюць намеру нават «у выключных абставінах» выходзіць на акцыі пратэсту. Трэба думаць, што беларусы паводле сілы духу — спартанцы, і ніяк не менш. Бо гаварыць праўду ў тэлефонным апытанні пра свае намеры выйсці на пратэстныя акцыі могуць толькі абсалютна мужныя людзі. Таму што для ўсіх ужо ясна, што нарвацца на штраф або патрапіць «на суткі», асабліва па серадах, нават выпадковым мінакам, а не тое што ўдзельнікам акцый, праблемы не складае. Але, магчыма, сацыёлагі з ІАЦ усё зразумелі і палічылі правільна. Бо, паводле іх інфармацыі, з мая 2011 года на 6,5% павялічылася колькасць грамадзян, упэўненых у сваёй будучыні, няўпэўненых стала менш на 5%.

Для балансу прывядзем аналітычную інфармацыю Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (BISS), што грунтуецца на апытанні грамадскай думкі, праведзеным Незалежным інстытутам сацыяльна-палітычных і эканамічных даследаванняў (НІСЭПД). Паводле іх звестак, у беларускім грамадстве ў чэрвені 2011 года пераважалі песімістычныя настроі. Больш за 60% апытаных упэўненыя, што сітуацыя ў Беларусі развіваецца ў няслушным кірунку. Гэта рэкордная колькасць ад 2003 года. І ўпершыню за апошнія 10 гадоў больш за палову насельніцтва (55%) мяркуе, што сацыяльна-эканамічнае становішча ў Беларусі цягам бліжэйшых гадоў пагоршыцца (толькі 12% спадзяюцца, што палепшыцца).




Нават падзеі 2009 года, на які прыпаў пік сусветнага эканамічнага крызісу, не выклікалі гэткай хвалі песімізму ў беларускім грамадстве, як некалькі апошніх месяцаў

Узровень падтрымкі Аляксандра Лукашэнкі, які па-ранейшаму застаецца дамінантнай палітычнай фігурай, упаў з 55% у снежні 2010 года да 33% у чэрвені 2011-га. Гэткае істотнае падзенне ўзроўню падтрымкі назіраецца ўпершыню за ўвесь час, што Лукашэнка знаходзіцца ва ўладзе. Доля рэспандэнтаў, якія прылічваюць сябе да апазіцыі цяперашняй уладзе, павялічылася з 19% у снежні 2010 года да 26% у чэрвені 2011.

Нават падзеі 2009 года, на які прыпаў пік сусветнага эканамічнага крызісу, не выклікалі гэткай хвалі песімізму ў беларускім грамадстве, як некалькі апошніх месяцаў ці нават тыдняў — пішуць аналітыкі BISS. Але, на погляд экспертаў, пакуль не ясна, ці дасягнулі рэйтынгі падтрымкі Лукашэнкі свайго дна або падзенне працягнецца. Занадта рана казаць, ці зможа большасць беларусаў адаптавацца да новага, паніжанага ўзроўню чакання або беларускі рэжым сутыкнуўся з першымі праявамі сапраўднага крызісу даверу ці нават не лаяльнасці большасці. Уяўляецца, што сістэма «сацыяльнага кантракта» паміж рэжымам і грамадствам у Беларусі разбурылася.

Вядома, гэта не сведчыць, што сённяшні дзень азначае завяршэнне цэлай эпохі. BISS мяркуе, што ва ўлады з'явілася б магчымасць аднавіць давер грамадства, калі б яна ўшчыльную занялася вырашэннем эканамічных пытанняў, то бок змагла б фінансаваць эканамічную мадэль. Аднак пры адсутнасці дзейснай стратэгіі выйсця з крызісу рэжым відавочна звяртае асноўную ўвагу на пытанні бяспекі/палітыкі і шукае ворагаў, на якіх можна было б ускласці віну. Чым далей гэта будзе працягвацца, тым менш будзе людзей, якія давяраюць дзейнай уладзе.

ЗМАГАННЕ

# ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ ЦІ КАМЕРЦЫЙНЫЯ ІНТАРЭСЫ?

Вольга ХВОІН

**Сталічны парк з «баявой» назвай Севастопальскі ўжо пятнаццаць гадоў ёсць прадметам канфлікту гарадскіх уладаў і жыхароў прылеглых дамоў. Цяпер спрэчкі скіраваліся ў воднае рэчышча — мінчукі перажываюць, што чыноўнікі ціха хочуць закрыць свідравіны з артэзіянскай вадой, каб мець законныя падставы для забудовы немалой тэрыторыі ў цэнтры Мінска.**



Для пачатку трэба нагадаць гісторыю доўгага змагання мінчукоў за захаванне зялёнай зоны ў цэнтры сталіцы. Парк быў закладзены ў 1954 годзе. Афіцыйны яго статус — «ландшафтна-рэкрэацыйная зона». Тут размяшчаюцца восем свідравін водазабору «Зеляноўка». Некаторыя з іх, паводле афіцыйнай інфармацыі, ужо не працуюць. Аднак жыхарам прылеглых кварталаў чыноўнікі часам пішуць лісты, у якіх сцвярджаецца адваротнае. Наяўнасць артэзіянскага водазабору на тэрыторыі парка акурат і забараняе там любыя будаўнічыя, прамысловыя працы.

У 1996 годзе ў Севастопальскім парку планавалі пабудаваць рэлігійны цэнтр «Гефсіманія». Аднак мясцовыя жыхары ўзбунтаваліся з прычыны парушэння прыродаахоўнага заканадаўства. Потым у 2003-м прадухілілі спробу будаўніцтва элітных дамоў з падземнымі гаражамі. У 2007 праз парк хацелі правесці трэцяе аўтамабільнае кальцо сталіцы. Жыхары зноў дамагліся свайго — праект хуткаснай аўтамагістралі быў «замарожаны» да 2020 года. У 2008-м улады горада хацелі распачаць рэканструкцыю парка, якая прадугледжвала будаўніцтва тэнісных кортаў, кафэ і рэстаранаў. Ізноў успыхнула хваля пратэстаў. Галоўны архітэктар праекта Севастопальскага парку Андрэй Каравянскі запэўніваў: «Свідравіны застаюцца! Мы не чапаем іх і ніяк не ўплываем на іх працу».

Валянціна Шалейнікава жыве ў доме побач з паркам. Яна ўжо шмат гадоў займаецца перапіскай з дзяржаўнымі інстанцыямі, ходзіць на прыёмы да чыноўнікаў, каб дамагчыся захавання паркавай зоны і свідравін артэзіянскай вады. Аднак, калі меркаваць па дзяржаўных лістах-адказах, частку свідравін усё ж ужо прыкрылі. «Якасць вады стала горшай. Але нам даюць адказы, што вада адпавядае санітарным нормам. У нас восем свідравін у парку, гэта адзінае месца ў Мінску, дзе на такой невялікай тэрыторыі знаходзіцца столькі свідравін. Самая чыстая вада была, — дзеліцца сваімі назіраннямі Шалейнікава. — А справа ў тым, што некаму прыглянуўся ласы кавалак зямлі ў горадзе плошчай 74 гектары. І спробы тычыся цягнуцца ад 1995 года».

Жыхары раёна сваімі сіламі сабралі больш за паўтары тысячы подпісаў за тое, каб Севастопальскі парк пакінулі ў некранутым выглядзе. У 2008-м далучыліся актывісты руху «За свабоду» і сабралі яшчэ паўтары тысячы. З гэтымі подпісамі жыхары Першамайскага раёна Мінска, дзе месціцца парк, дайшлі ажно да Адміністрацыі прэзідэнта. Цяпер перапіску з чыноўнікамі дапамагае весці кіраўнік ініцыятывы «Еўрапейская перспектыва» Віктар Янчурэвіч. Ён мяркуе, што ўсе звадкі вакол Севастопальскага парку абумоўленыя чыімсьці камерцыйным інтарэсам. «Нехта з чыноўнікаў у пэўны момант скажа: «Ведаеце, мы выявілі, што свідравіны не працуюць пэўны час. Мы накажам тых, хто давёў іх да такога стану. Але аднавіць іх немагчыма. Бо ўжо пабудаваны водазабор Вязынка, Волма. А ў Першамайскім раёне сталіцы чарга на жытло вялікая, ужо цяпер у чарзе стаяць трынаццаць-чатырнаццаць тысяч сямей, таму давайце мы лепш парк забудуем», — разважае Янчурэвіч. Ён мяркуе, што акурат з такімі праблемнымі пытаннямі і трэба працаваць суб'ектам палітычнага поля — працы шмат, і гэта дае магчымасці для рэальных спраў.

Валянціна Шалейнікава ў абарону свідравін з артэзіянскай вадой прыводзіць экалагічныя і эканамічныя аргументы. Так, дырэктар УП «Мінскводаканал» Іосіф Герасімёнак заяўляў, што праект пераводу сталічных спажыўцоў на водазабеспячэнне з падземных крыніц, паводле дзяржпраграмы «Чыстая вада» на 2011–2015 гады і адпаведнай гарадской праграмы, ацэньваецца ў 680 мільярдаў рублёў у бягучых цэнах. Каб забяспечыць увесь горад артэзіянскай вадой, неабходна перабудаваць сістэму водазабеспячэння. Цяпер мінчане атрымліваюць ваду з дзвюх крыніц — падземнай і паверхневай. У апошнім выпадку вада пасля спецыяльнай апрацоўкі паступае жыхарам Маскоўскага, Фрунзенскага і часткі Кастрычніцкага раёнаў. Пры гэтым, па словах Герасіменкі, кошт вады для насельніцтва, якое атрымлівае ваду з паверхневых крыніц, павялічыцца на 50 працэнтаў.

Цяпер Севастопальскі парк знаходзіцца ў даволі дзікім, запушчаным стане. Ён не расчышчаны, сустракаюцца сляды адпачынку на прыродзе — бутэлькі з-пад гарэлкі, пластыкавы посуд. Атрымліваецца, што будаўніцтва ў парку гарадскія ўлады не вядуць, але і за чысцінёй, ахайнасцю зялёнай зоны не сочаць.

У Севастопальскім парку расце больш за 28 тысяч дрэў. Некалькі гадоў таму была праведзена чыстка, высеклі частку дрэваў. Жыхары таксама гэта ўспрынялі «ў штыкі». Маўляў, гэта былі здаровыя дрэвы, і высякаць іх не было патрэбы. Афіцыйная пазіцыя такая: рэкамендаваная шчыльнасць паркавых пасадак не павінна перавышаць 170 дрэў на 1 гектар. У Севастопальскім парку, наадварот, надзвычай густыя лесапасадкі, і для нармальнага росту дрэў парк трэба прарэджваць.

Валянціна Шалейнікава з прыкрасцю гаворыць, што «заканадаўства ў нас зусім не працуе», таму з такімі цяжкасцямі і даводзіцца адваёўваць Севастопальскі парк. Цяпер прадстаўніца грамадскага актыву распачынае новы этап перапіскі з дзяржчыноўнікамі і вельмі спадзяецца, што зможа адстаяць і свідравіны з артэзіянскай вадой, і Севастопальскі парк.

ДЫЯСПАРА

# Алег Рудакоў: ЗГУБІМ ЦІ ЗАХАВАЕМ І ПЕРАДАДЗІМ?

**Быць беларусам немагчыма толькі з факту нараджэння на тэрыторыі нашай дзяржавы. Гэта вялікая праца і свядома абраная грамадзянская пазіцыя. І няважна, дзе чалавек жыве: у Беларусі ці ў далёкім Іркуцку. Алег Рудакоў ужо пятнаццаць гадоў з'яўляецца старшынёй Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага, якое ён заснаваў у сярэдзіне 1990-х гадоў. Імпэт, энергетыка, адданасць справе гэтага чалавека не толькі ўражваюць, але і надаюць надзею — з такімі асобамі ў Беларусі ёсць будучыня. З іркуцкім беларусам размаўляла журналіст «НЧ» Вольга Хвоін.**

— Я заўжды, хоць знаходжуся за шэсць тысяч кіламетраў ад Беларусі, назіраю за падзеямі, што тут адбываюцца. Раней дык увогуле моцна перажываў. Бо, на мой погляд, тут не адбывалася сапраўдная адраджэння беларускай культуры. Я пятнаццаць гадоў кірую Іркуцкім таварыствам беларускай культуры імя Яна Чэрскага. Для нас галоўная мэта — адраджэнне, развіццё і захаванне беларускай традыцыі, мовы, культуры. І калі мы ў Іркуцку гэта робім на аматарскіх пачатках, то нам падаецца, што ў самой Беларусі гэта мусіць рабіцца на дзяржаўным узроўні. На жаль, мінулыя гады я заўважаў, што да беларускай мовы і традыцый ставіліся абыякава. Апошнія гады, мне падаецца, справа трохі зрушылася. Нават тое, што цяпер пры Міністэрстве культуры створаны кансультацыйны савет па беларускай дыяспары, сведчыць: пайшло разуменне таго, што трэба ўзаемадзейнічаць з беларусамі, якія жывуць за мяжой.

Мы лічым сябе паспяховай грамадскай супольнасцю, якая ганарыцца сваім паходжаннем, сваёй гісторыяй, сваёй культурай, сваёй мовай. Добра было б, каб такіх адданых беларускай справе людзей было як мага больш.

Мы зладзілі першы фестываль беларусаў замежжа ў межах Славянскага базару. Нашы гурты спявалі песні, аўтэнтычныя тым, што спявалі нашы бабулі, якія перасяліліся ў Сібір у сталыпінскія часы. Іншыя гурты спявалі песні, напрыклад, эстрадныя. Але галоўнае — гэты фестываль быў на чысцюткай беларускай мове. Гэта ёсць паказчыкам таго, што ў дзяржаве ёсць разуменне — трэба супрацоўнічаць. Але зноў жа — усе гурты мусілі былі прыехаць за свой кошт. Праўда, нам забяспечылі пражыванне-харчаванне. У нашых людзей было вялікае жаданне прыехаць на радзіму продкаў. Нашы дзяўчаты вучаць беларускую мову, між сабой мы гаворым па-беларуску. І яны так рыхтаваліся, чыталі слоўнікі, у мяне пыталіся, як тое ці іншае слова па-беларуску. Хваляваліся, бо хацелі прыехаць сюды і адчуць, што знаходзяцца ў дзяржаве сваіх продкаў. Але прыехалі і былі трохі расчараваныя. Іншым разам яны былі як замежнікі: у краме пытаюцца па-беларуску, а ім адказваюць: «Скажите по-нормальному, по-русски». Гэта ж таксама дзяржаўная палітыка. Усё ж мы адчуваем, што часам тутэйшыя людзі, не скажу што варожа ставяцца, але ёсць напружаныя адносіны да той жа беларускай мовы.

Я гляджу, як да сваёй дыяспары ў Іркуцку ставяцца Польшча, Літва. Беларусаў, паводле перапісу, пяцьдзесят тысяч. Палякаў — тры тысячы, літоўцаў — усяго паўтары. Але там ёсць консульствы Польшчы і Літвы, ёсць дзяржаўная палітыка падтрымкі, фінансавая падтрымка на правядзенне сваіх мерапрыемстваў. А ў нас такога няма.

***— Ужо не першы год гавораць, што трэба прыняць закон аб беларусах замежжа. Нашто вам гэты нарматыўны акт?***

— Як закон ён мне не патрэбны. Але ёсць прыклад — тая ж Польшча. Яны зрабілі карту паляка. І вось каб было нешта падобнае — карта беларуса, нейкае пасведчанне. Каб была пэўнасць, што дзяржава вылучае тых, хто займаецца беларускай спадчынай. Нават карту паляка ўсім не даюць. Аднойчы я быў сведкай размовы палякаў у Іркуцку. Да нас прыйшла кіраўніца мясцовай польскай суполкі, і ёй нехта пазваніў з просьбай выдаць карту паляка. І яна зрабіла заўвагу, што гэты чалавек не ўдзельнічаў у культурным жыцці суполкі, нічым не дапамагаў. Паабяцала дапамагчы атрымаць карту паляка, але авансам, з умовай, што ён будзе рабіць пасільны ўнёсак у жыццё суполкі. Цяпер мы вядзём актыўную працу, але ўсё на аматарскіх пачатках, ніякіх стымулаў апроч гэтага няма. Усё трымаецца на энтузіязме, на апантанасці. Калі б такі закон быў прыняты, мы б мелі праграмы па ўзаемадзеянні, тут даведваліся, што нам насамрэч патрэбна. Бо мы прыехалі, а нам надарылі кніжак, якія можа і сто год не патрэбныя. Вось падарылі пераклад Ван Гюста. Але што мне гэтая мастацкая кніга, можа б мы хацелі кнігі па гісторыі, па арнаменту, слоўнікі. Запытайцеся нас, чым мы займаемся і што нам патрэбна. Трэба, каб гэты закон меў канкрэтныя пункты, якія б падкрэслівалі ўзаемавыгаднасць супрацоўніцтва, каб мы адчулі, што Беларусь пра нас ведае і ставіцца да нас паважліва.

***— Да вас прыходзіць столькі моладзі, інфармацыі пра таварыства многа ў медыях. У чым сакрэт паспяховасці?***

— Два месяцы таму я сустракаўся са старшынёй украінскага цэнтру культуры. І ён мне гаворыць: «Слухай, Алег, чаму ў цябе так шмат моладзі, а ў мяне адны бабкі ды дзедкі прыходзяць?» Яны раз на год ладзяць «Шаўчэнкаўскія чытанні». Чытаюць творы Шаўчэнкі, далей стол накрываюць, Украіну паўспамінаюць, нехта «Дніпро широкі» праспявае. І ўсё. Дык гэта нецікава моладзі. Мы ладзім нашыя традыцыйныя святы — Купалле, гуканне вясны. Мы робім якую-небудзь праграму. Гэта не проста пасядзець каля вогнішча. У нас ёсць карагоды, гульні, ёсць секцыя па вывучэнні народных танцаў. Ад самага пачатку я думаў: мы стварылі Іркуцкае таварыства беларускай культуры, але ўсе людзі розныя, з рознымі інтарэсамі, як іх аб'яднаць? Трэба было стварыць праграму развіцця, і цяпер у нас каля дваццаці кірункаў працы. Усе нашы святы праходзяць у інтэрактыўнай форме. Не будзеш жа праз вогнішча на Купалле ў джынсах скакаць! З'явіўся кірунак па аднаўленню народных строяў, потым пачалі займацца народнымі рамёствамі, танцамі... Праводзім абрадавыя святы. Працуе літаратурна-гістарычны клуб «Спадчына», дзе вывучаюць гісторыю Беларусі, развіццё беларускіх рамёстваў. Ёсць секцыя па вывучэнню беларускіх бытавых танцаў і шмат іншага. Моладзь, якая прыходзіць да нас, узгадвае свае карані, з задавальненнем вывучае этнаграфічныя факты. У нас цяпер вельмі добры актыў!

***— Ці дапамагае вам мясцовая адміністрацыя?***

— Нічым не дапамагае, але, дзякуй, і не пярэчыць. На пачатку чэрвеня быў дзень горада, і мы ўдзельнічалі ў святочным шэсці — самі падрыхтавалі строі, афармілі машыну, зрабілі шыльду. Прайшліся па галоўнай вуліцы з нашымі песнямі-карагодамі. За гэта атрымалі падзяку ад мэра і нават падарунак — карціну нашых мясцовых мастакоў. Ведаю, што ў Томску, Новасібірску, Цюмені ёсць нават стаўкі для цэнтраў беларускай культуры. А ў Іркуцку, як і ў Беларусі, няма разумення, што трэба дапамагаць беларускаму цэнтру культуры. У нас толькі бураты маюць стаўку ў адміністрацыі, бо гэта карэнныя жыхары.

***— Покліч продкаў, генетычная памяць — гэта міф, ці насамрэч людзей нават праз пакаленні цягне на родную зямлю?***

— Наша таварыства абуджае зацікаўленасць у людзей да сваёй традыцыі, каранёў. І я ўжо магу назваць шмат прозвішчаў людзей, якія, пабыўшы ў нашым таварыстве, так натхніліся, што пераехалі ў Беларусь. У нас ёсць адна дзяўчына, якая вучылася тут, жыла, але вярнулася ў Іркуцк, маўляў, у Беларусі вельмі цяжка, эканамічнае становішча такое-сякое. Праз пару год зноў прыехала ў Беларусь: «У Беларусі лепш, людзі больш добрыя, надвор'е цяплейшае». Потым прыехала ў Іркуцк, але зноў вярнулася ў Беларусь, выйшла замуж, нарадзіла дзіця і сказала: «Усё, цяпер буду жыць тут». Мяркую, што краіна пражывання — не самае галоўнае. Важна, ці зможа чалавек уладкаваць сваё жыццё — стварыць сям'ю, знайсці добрую працу. У Беларусі, і праўда, надвор'е лепшае, адносіны людзей адзін да аднаго таксама больш прыязныя. Сібір — гэта кацёл, намяшана ўсё, кожны сам па сабе. А калі ідзеш па вуліцы ў Беларусі і спытаеш, як прайсці, то, даведаўшыся, што з Іркуцку, нават правядуць да патрэбнага месца. У цэлым, што ў Іркуцку, што ў Беларусі, аднолькава жыць: і тут і там свае цяжкасці ёсць.

***— Чаму вы ўзяліся за стварэнне Іркуцкага таварыства беларускай культуры?***

— З маральнага пункту мне гэтае дае толькі адно — галава баліць. Я гэтым пачаў займацца таму, што з дзяцінства ў мяне было шмат выпадкаў, калі мне хацелася абараняць беларускую мову. Я жыў у вёсцы, пасля сёмага класа мы паехалі на экскурсію ў Ленінград. Жылі мы ў інтэрнаце, а елі ў сталоўцы. Аднойчы чакалі сваёй чаргі на абед, а побач стаяла купка школьнікаў, якія размаўлялі паміж сабой на незразумелай мове. І нешта так прыкра стала, то мы пачалі паміж сабою пабеларуску гаварыць. Абы што плялі, толькі б беларускія словы былі: «Цыбулю маеш? А бульбу, а навошта?». Урэшце і тыя дзеці на нас звярнулі ўвагу, пазнаёміліся з намі і былі вельмі здзіўленыя таму, як гучыць беларуская мова. Калі прыехаў у Іркуцк, то сутыкнуўся з тым, што ніхто ўвогуле нічога пра Беларусь не ведае. Мне проста прыкра стала. Але, калі цяпер вы прыедзеце ў Іркуцк і запытаецеся пра беларусаў, вам адразу раскажуць пра наша таварыства. Быў смешны выпадак: арнітолаг ехаў у Манголію, але нешта з пашпартам у яго было не тое. І ў чыгуначнай касе ён спытаў, ці ёсць у горадзе якое консульства, то касірка яго адправіла ў наша таварыства. Мы ўжо грымім у Іркуцку, кожны месяц нейкія мерапрыемствы ладзім, імкнёмся быць навідавоку. І мы паднялі прэстыж беларускага народа. Раней нават пра беларускія сталыпінскія вёскі гаварылі «там хахлы жывуць».

Шмат слоў гавораць пра братэрства рускіх і беларусаў. Але беларусы ведаюць пра Пушкіна і Лермантава, а ці ведаюць рускія беларускіх класікаў? На адным прыёме ў губернатара я пажартаваў, што ёсць закон, паводле якога ва ўсіх беларускіх школах будзе вывучацца руская мова і літаратура, а ў расійскіх школах — беларуская. Першую палову жарту ўспрынялі добра, а пасля другой — мову ім заняло. Якое можа быць братэрства ў такіх варунках?! Я ў Іркуцку адчуваю сябе як на перадавой: трэба ўвесь час нешта адстойваць, весці вялікую асветніцкую працу. У Льва Гумілёва ёсць твор пра пасіянарнасць. Ён гаворыць, што народ, які пачынае знікаць, мусіць мець пасіянарных людзей, які ахвяруюць сваім жыццём, сваімі грашыма, сваімі асабістымі справамі дзеля таго, каб народ наш паўстаў. Чым больш народаў са сваімі традыцыямі, асаблівасцямі, тым больш цікава. Гэта выдатна! Чалавек, калі не ведае сваёй гісторыі, то ён сарамлівы. Наша гісторыя вельмі гераічная. Нашы продкі ўсё ж захавалі для нас, перадалі нам культуру, традыцыю. Цяпер нашая чарга, што мы зробім — ці згубім, ці захаваем і перададзім далей гэта.



Алег Рудакоў нарадзіўся ў полацкай вёсцы Бяздзевічы. Скончыў ваеннае вучылішча, а пасля арміі — гістфак Іркуцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1996 годзе стварыў і дагэтуль узначальвае Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага. Яно — буйнейшае сярод сарака нацыянальна-культурных утварэнняў у рэгіёне і адно з лепшых у Расіі сярод беларускіх.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 25 ліпеня, панядзелак

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**08.30** Дакументальны серыял «Гараджане-2011»: Любляна.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна). Фільм «Выжыць і пераадолець».
**11.05** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.10** Камедыйная меладрама «Апельсінавы сок» (Расія).
**13.50** Сінематэка.
**14.30** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Здароўе».
**16.05** Патрабуецца.
**16.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда». Фільм «Уладзімір Преснякоў».
**17.10** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**18.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 00.40** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Дакументальны серыял «Гараджане-2011»: Менск.
**20.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама».
**21.40** «Камандзіроўка».
**21.55** Камедыйны дэтэктыў «Дрэнны добры паліцыянт» (Канада).
**00.10** Дак. цыкл «У пошуках праўды» (Украіна). Фільм «Праклятыя скарбы Мазепы».
**00.45** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Атлантыда». Расія, 2007.
**23.05** « Я - супермэн».
**00.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Вялікі горад».
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50** «Зорны рынг».
**14.45** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**16.00** «Я-вандроўца».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Альпініст». Украіна, 2008 г.
**22.00** «Рэпарцёр СТБ».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

### ЛАД

**07.00** «Добрая раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**09.55** Альбарутенія.
**10.25** Пра мастацтва.
**10.50** Жансавет.
**11.25** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення». 10-я класы. Першы паўфінал.
**12.25** Прыгодніцкі фільм «Легенда выспы Двід» (Расія).
**14.20** «Навіны надвор'я».
**14.45** Рэальны свет.
**15.15** «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
**16.15** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Трылер «Падвойны пралік» (ЗША).
**23.15** Бітва экстрасэнсаў.
**00.10** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Пакой смеху».
**10.20** «Ранішняя пошта з Л. Грыбалёвай».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весці.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Рытм сэрца Азіі». Дак. фільм.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новым домам!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.55** Серыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Смерць шпіёнам. Крым».
**23.20** Першая ліга «КВЗ». Лепшае.
**23.40** Навіны - Беларусь.
**23.50** «Весці.ru».
**00.10** «Таямніца сямейнага жыцця педагога Макаранкі». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Кулінарны паядынак» з Дзянісам Ражковым.
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі».
**11.10** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Мужы».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Масква. Тры вакзала».
**21.20** Серыял «Гадзіна Волкава».
**23.30** Серыял «Справа Крапівіных».
**00.25** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

### EUROSPORT

**04.00, 09.45, 13.00, 18.00, 01.00** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 10-ы.
**09.30** Матаспартовы часопіс.
**11.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Скачкі ў ваду. 10 м. Фінал (Кітай).
**12.00** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 9-ы.
**12.45** Плаванне. (Італія). Часопіс.
**14.45** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». 21-ы этап.
**16.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету сярод юніёраў (Талін, Эстонія).
**17.45** Лёгкая атлетыка. «Фотафініш».
**19.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Фінал.
**20.55** Навіны.
**21.00** Наймоцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Фінляндыя.
**21.45** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс».
**00.30** Веласпорт. "За кулісамі «Тур дэ Франс». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30, 13.40, 17.30** «Час гонару», серыял: 39 серыя.
**07.15, 14.25, 18.15** Чаму дэмакратыя? 8 серыя: «Мы за вамі назіраем».
**09.10** Басанож па свеце.
**09.35, 15.20** На колах.
**10.10, 16.20** Прыватная калекцыя.
**10.35, 16.45** «Бульбаны», мультсерыял.
**10.40** МакраФон: Канцэрт гурта «Ляпіс Трубяцкой».
**11.20, 15.45** Без рэтушы: «Бывай, зброя?.», дак. фільм, рэж. Андрэй Шобін, 2010 г., Беларусь.
**11.40, 16.05, 20.40** Эксперт.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Судовы выканаўца», маст. фільм, рэж. Фэлікс Фальк, 2005 г., Польшча.
**16.50** Сцяна, дак. цыкл.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 26 серыя.
**19.10** Побач з намі.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**20.15** Еўропа сёння.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Хто ёсць кім?: «Валерый Леванеўскі».
**21.45** «Судовы выканаўца», маст. фільм, рэж. Фэлікс Фальк, 2005 г., Польшча.
**23.15** Аб'ектыў.

## 26 ліпеня, аўторак

### 1

**06.00, 07.00, 08.00 (з сурдаперакладам), 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 22.45** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** Дакументальны серыял «Гараджане-2011»: Барселона.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** «Камандзіроўка».
**12.10** «Сваты-3». Камедыйны серыял.
**13.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Я з няпоўнай сям'і».
**14.05** «Эпоха». Марк Крочыў. Фільмы 1 і 2.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Школа доктара Камароўскага.
**16.05** Прыгодніцкі серыял «Тры талера» (Беларусь). 1-я серыя.
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.35** «Ведай нашых: мастак Вікторыя Каваленчыкава».
**18.50, 01.35** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Сфера інтарэсаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** «Сваты-3». Камедыйны серыял.
**23.00** Крымінальная меладрама «Фатальная сувязь» (ЗША-Канада).
**01.40** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць выдатна!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Хірамант. Лініі лёсаў». Закл. серыя.
**22.10** Прэм'ера. «Атлантыда». Расія, 2007.
**23.05** «Сведкі».
**00.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Захавай свой край».
**08.50** «Кіно»: «Альпініст». Украіна, 2008 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Кіно»: «Да мяне, Мухтар!». СССР, 1964 г.
**15.15** «Далёкія сваякі».
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Кіно»: Жан Рэно ў фільме «Нікіта». Францыя - Італія, 1990 г.
**22.10** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла 4». Серыял.
**23.55** «Водбліскі». Серыял.

### ЛАД

**07.00** «Добрая раніца».
**08.00, 21.15** Тэлебарометр.
**08.05, 17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**08.55, 19.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**10.00** Альбарутенія.
**10.25** «Лабірынты гісторыі беларускіх татараў». Частка першая.
**10.55** Жансавет.
**11.30** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення». Дзясятыя класы. Другі паўфінал.
**12.30** Лірычная меладрама «Двое на выспе слёз» («Беларусьфільм»).
**14.05** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**14.45** Рэальны свет.
**15.15** «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
**16.15** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Моладзевая камедыя «Патрапіць у дзясятку» (Вялікабрытанія - ЗША).
**23.10** Бітва экстрасэнсаў.
**00.00** Спорт-кадр.
**00.30** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Хай заўсёды буду я. Леў Ашанін». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весці.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** «На сонечным боку вуліцы».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новым домам!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.55** Серыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Смерць шпіёнам. Крым».
**23.20** Першая ліга «КВЗ». Лепшае.
**23.40** Навіны - Беларусь.
**23.50** «Весці.ru».
**00.10** «Таямніца згубы самалёта «Максім Горкі». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.05** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Мужы».
**15.05** «Справа густу».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Масква. Тры вакзала».
**21.20** Серыял «Гадзіна Волкава».
**23.30** Серыял «Справа Крапівіных».
**00.25** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

### EUROSPORT

**04.00, 09.30, 13.00, 18.00** Плаванне.Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 11-ы.
**11.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Крэтей - Парыж. Францыя.
**12.00** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай).
**15.00, 19.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Чэхія - Ірландыя. Румынія.
**16.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Сербія - Іспанія. Румынія.
**17.45** Плаванне. (Італія). Часопіс.
**20.55, 01.25** Навіны.
**21.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Турцыя - Іспанія. Румынія.
**23.00** Бокс. Супербай Рой Джонс - Майкл Мурер - Фернанда Варгас. ЗША.
**00.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Фінал.
**01.30** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 11-ы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Побач з намі.
**07.40** «Ранча Піковая Сямёрка» серыял: 26 серыя.
**07.10** «Палкоўнік Квяткоўскі», маст. фільм, рэж. Казімеж Куц, 1995 г., Польшча.
**10.15** Еўропа сёння.
**10.40** «Ранча», серыял: 25 серыя.
**11.40** Эксперт.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Чаму дэмакратыя? 8 серыя: «Мы за вамі назіраем».
**12.55** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 26 серыя.
**13.25** «Палкоўнік Квяткоўскі», маст. фільм, рэж. Казімеж Куц, 1995 г., Польшча.
**15.25** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**15.55** Побач з намі.
**16.20** Хто ёсць кім?: «Валерый Леванеўскі».
**16.35** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**16.50** Сцяна, дак. цыкл.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 27 серыя.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 49 серыя.
**18.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Урок беларускай мовы», дак. фільм, рэж. Міраслаў Дэмбінскі, 2006 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**20.15** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Паляванне на дзівосы (спазнавальная праграма).
**21.40** Невядомая Беларусь: «Амаль забыты фатограф», дак. фільм, рэж. Галіна Адамовіч, 2010 г., Беларусь.
**22.10** «Дэтэрмінатар», серыял: 4 серыя.
**22.55** Аб'ектыў (галоўнае выданне).

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 27 ЛІПЕНЯ, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00 (з сурдаперакладам), 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 22.45** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтарэсаў».
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Відэафільм АТН «Бялыніцкія таямніцы» цыкла «Зямля беларуская».
**12.10** «Сваты-3». Камедыйны серыял).
**13.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Мой муж - сынок-пестунок».
**14.00** «Эпоха». Марк Крочыў. Фільмы 3-і і 4-ы.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Школа доктара Камароўскага.
**16.05** Прыгодніцкі серыял «Тры талера» (Беларусь). 2-я серыя.
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.35** Адмысловы рэпартаж АТН «Дзяцінства на мыліцах».
**18.50, 01.30** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** «Сваты-3». Камедыйны серыял.
**22.55** Трылер «Страшней за шторм» (ЗША).
**01.35** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць выдатна!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Апошняя сустрэча». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Атлантыда». Расія, 2007.
**23.05** «Пастка ў крэдыт».
**00.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Кіно»: «Нікіта». Францыя - Італія, 1990 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Халасцякі». Серыял.
**14.40** «Забойная сіла 4». Серыял.
**15.40** «Next 3». Серыял.
**16.50** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск». Радыё Online.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Кіно»: «Кароль, Дама, Валет». Расія - Украіна, 2008 г.
**22.10** «Калі ласка, скардзіцеся».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла 4». Серыял.
**23.55** «Водбліскі». Серыял.

### лад

**07.00** Добрая раніца.
**08.00, 21.15** Тэлебарометр.
**08.05, 17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05, 19.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**10.05** Альбарутенія.
**10.35** «Лабірынты гісторыі беларускіх татараў». Частка іншая.
**11.00** Жансавет.
**11.35** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення». Дзясятыя класы. Трэці паўфінал.
**12.35** Камедыя «Патрапіць у дзясятку».
**14.15** Спорт-кадр.
**14.40** Рэальны свет.
**15.10** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**16.15** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**16.55** Бітва экстрасэнсаў.
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** Камедыя «Прывітанне, Біл! (ЗША).
**23.10** Бітва экстрасэнсаў.
**00.05** Рэальны свет.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Узлёты і падзенні Марыса Ліепы». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весці.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** «На сонечным боку вуліцы».
**13.50, 16.50, 19.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новым домам!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Серыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** «Смерць шпіёнам. Крым».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весці.ru».
**23.45** Урачыстае адкрыццё Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў «Новая хваля-2011». Трансляцыя з Юрмалы.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**10.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў з Веніямінам Смехавым.
**11.10** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Мужы».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Масква. Тры вакзала».
**21.20** Серыял «Гадзіна Волкава».
**23.30** Серыял «Справа Крапівіных».
**00.25** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

### EUROSPORT

**04.00, 09.30, 13.00, 18.00** Плаванне.Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 12-ы.
**11.00, 16.30, 00.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Турцыя - Іспанія. Румынія.
**12.00** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 11-ы.
**12.45** Плаванне. (Італія). Часопіс.
**15.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Фінал.
**19.00** Навіны.
**19.05** Рэгата Балатон. Часопіс.
**19.15** Абранае па серадах.
**19.25** Конны спорт. Міжнародны турнір па конкуру (Ахен, Германія).
**20.25** Конны спорт. Міжнародны турнір па аб'ездкванні Мастерс (Швецыя).
**20.55** Навіны коннага спорту.
**21.00** Гольф. Тур PGA. Адкрыты чэмпіянат Канады (Таронта, Канада).
**22.00** Гольф. Еўратур. Scandinavian Masters (Стакгольм, Швецыя).
**22.30** Гольф. Эвіан Мастерс (Францыя).
**23.30** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.35** Ветразевы спорт. Экстрэмальная серыя (Стамбул, Турцыя).
**00.05** Яхт-клуб. Навіны ветразнага спорту.
**00.25** Катамаран. Часопіс.
**00.30** Навіны.
**01.30** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 12-ы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25, 12.55** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 27 серыя.
**07.50, 13.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 49 серыя.
**07.55, 14.15** Праект «Будучыня».
**09.25, 15.00** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Урок беларускай мовы», дак. фільм, рэж. Міраслаў Дэмбінські, 2006 г., Польшча.
**10.25** «Ранча», серыял: 26 серыя.
**11.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**11.30** Невядомая Беларусь: «Амаль забыты фатограф», дак. фільм, рэж. Галіна Адамовіч, 2010 г., Беларусь.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Прыватная калекцыя.
**12.25** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**14.45, 19.45** Паляванне на дзівосы.
**16.00** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 23 серыя.
**16.50** Сцяна, дак. цыкл.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 28 серыя.
**17.30** «Дэтэрмінатар», серыял: 4 серыя.
**18.15** «Белы ветразь над Прыпяццю», дак. фільм, рэж. Уладзімір Колас, Беларусь.
**19.10** YoLife!
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** На колах.
**20.35** Басанож па свеце.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Побач з намі.
**21.45** Вагон.
**21.50** «Quo Vadis», тэлесерыял: 5 серыя.
**22.40** «Euromaxx».
**23.05** Аб'ектыў.

## 28 ЛІПЕНЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00** (з сурдаперакладам), 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.00 Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.10** «Сваты-3». Камедыйны серыял.
**13.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «У маёй сям'і - двайняты».
**14.05** Шэф-кухар.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Школа доктара Камароўскага.
**16.05** Прыгодніцкі серыял «Тры талера» (Беларусь). 3-я серыя.
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.45** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.35** Адмысловы рэпартаж АТН «Фруктовы рэйс».
**18.50, 01.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**21.55** «Сваты-3». Камедыйны серыял.
**23.10** Новае расійскае кіно. Маладзёвая камедыя «Зачыненыя прасторы» (Расія).
**01.50** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць выдатна!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Апошняя сустрэча». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Атлантыда». Расія, 2007.
**23.05** Тэорыя неверагоднасці. «Шосты акіян».
**23.50** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Калі ласка, скардзіцеся».
**08.50** «Кіно»: «Кароль, Дама, Валет». Расія - Украіна, 2008 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Халасцякі». Серыял.
**14.40** «Забойная сіла 4». Серыял.
**15.40** «Next 3». Серыял.
**16.50** «Мінск і мінчукі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Кіно»: «Люстэрка». ЗША - Германія - Румынія, 2008 г.
**22.10** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла 4». Серыял.
**23.55** «Водбліскі». Серыял.

### лад

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**10.00** Альбарутенія.
**10.25** «Лабірынты гісторыі беларускіх татараў». Частка трэцяя.
**10.55** Жансавет.
**11.25** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення». 10-я класы. Чацвёрты паўфінал.
**12.30** Драма «Чорная бяроза. 1-я серыя.
**13.40** Дакументальны фільм «Выпуск напярэдадні вайны» («Беларусьфільм»).
**14.00** Дак. фільм «Маладосць мая».
**14.30** «Рэальны свет».
**15.00** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**15.10** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**16.15** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Крымінальная камедыя «Больш Бэна» (Вялікабрытанія).
**23.00** «Час футбола».
**23.40** Бітва экстрасэнсаў.
**00.35** «Рэальны свет».

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Манастыр». Дак. фільм.
**11.00** Весці.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** «На сонечным боку вуліцы».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весці.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новым домам!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весці.
**17.55** Серыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весці.
**20.30** Тэлесерыял «Смерць шпіёнам!».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весці.ru».
**23.45** «Новая хваля-2011». Трансляцыя з Юрмалы.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** Дак. цыкл «Уласны гонар».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Мужы».
**15.10** «Справа густу».
**15.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** серыял «Масква. Тры вакзала».
**21.20** Серыял «Гадзіна Волкава».
**23.05** Сёння.
**23.30** Серыял «Справа Крапівіных».
**00.25** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

### EUROSPORT

**04.00, 09.30, 13.00** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 13-ы.
**11.00** Плаванне. Часопіс.
**11.15** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 12-ы.
**15.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Чэхія - Грэцыя. Румынія.
**16.45** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Фінал.
**18.00** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 13-ы.
**20.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Турцыя - Іспанія. Румынія.
**20.55** Навіны.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**00.40** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.40** Навіны.
**01.45** Веласпорт. «За кулісамі «Тур дэ Франс». Часопіс.
**02.15** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 28 серыя.
**07.50** «Дэтэрмінатар», серыял: 4 серыя.
**07.40** Паляванне на дзівосы.
**07.55** Побач з намі.
**09.10** На колах.
**09.40** «Белы ветразь над Прыпяццю», дак. фільм, рэж. Уладзімір Колас, 2009 г., Беларусь.
**10.35** «Ранча», серыял: 27 серыя.
**11.30** «Euromaxx».
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 23 серыя.
**12.50** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 28 серыя.
**13.15** «Дэтэрмінатар», серыял: 4 серыя.
**14.05** Побач з намі.
**14.20** На колах.
**14.45** Басанож па свеце.
**15.10** YoLife!
**15.25** «Белы ветразь над Прыпяццю», дак. фільм, рэж. Уладзімір Колас, 2009 г., Беларусь.
**16.20** «Euromaxx».
**16.50** Сцяна, дак. цыкл.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «100 хвілін вакацыяў», тэлесерыял: 1 серыя.
**17.30** «Quo Vadis», тэлесерыял: 5 серыя.
**18.20** «Дзе цяпер той мур?» дак. фільм, рэж. Ганна Майснэр, 2009 г., Германія.
**19.10** YoLife!
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Навігатар.
**19.55** «Euromaxx».
**20.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Паранены», дак. фільм, рэж. Яраслаў Каменьскі (Jarosław Kamieński), Анджэй Панкевіч, 2005 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Беларусы ў Польшчы.
**21.45** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 16 серыя.
**22.35** Рэпартэр.
**23.00** МакраФон: «Троіца», фільм-канцэрт: ч. 2.
**23.35** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №7 (59) (ліпень)

www.lit-bel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб’яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


Анонс


«ГРАМАДА»: літаратурна-грамадскае жыццё ліпеня .... с. 2
«ЮБІЛЕЙ»: прысвячэнні Уладзіміру НЯКЛЯЕВУ .... с. 3
«ПУБЛІЦЫСТЫКА»: Аляксей ДУБРОЎСКІ пра беларускі «дачарнобыльскі палігон» .... с. 4
«СЯБРЫНА»: Алесь КАСКО пра Васіля ГАДУЛЬКУ і «СВЯТАЯ ПАРА» Івана АРАБЕЙКІ .... с. 5
«ПРОЗА»: апавяданне Анатоля САНАЦЕНКІ .... с. 6
«ПАЭЗІЯ»: «ЧАРГОВАЕ ЛЕТА» Аксаны ДАНІЛЬЧЫК .... с. 7
«ПРОЗА»: апавяданні Паўла КАСЬЦЮКЕВІЧА .... с. 8–9
«ПЕРАКЛАД»: Войцэх БОРАС вачыма Сяргея ПАНІЗЬНІКА .... с. 10
«ЧЫТАЛЬНЯ»: Ігар ТУМАШ пра сучасны візантызм .... с. 11
«ЛЕКТОРЫЙ»: Аляксей РАГУЛЯ пра Кандрата КРАПІВУ .... с. 12
«КРЫТЫКА»: пра Алеся РАЗАНАВА-перакладчыка .... с. 13
«НАРЫС»: «Станаўленне асобы» — Арсен ЛІС пра Рыгора ШЫРМУ .... с. 14–15
«ДРУК»: агляд чарговага нумара часопіса «ДЗЕЯСЛОЎ» .... с. 16


ПАМФЛЕТ

## РЭВАЛЮЦЫЯ ЗЯЛЁНАГА ЗМІЯ

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

**У краіне рэзка падаражэла ўсё: што ў два разы, што ў пяць, а што і ў дзесяць. І толькі спіртное, другі наш хлеб, — на сціплыя 10%. Давайце ўявім, што бутэлька белай падскочыла ў цане да 40-50 тысячаў і што з гэтага можа атрымацца.**



Фота www.stihi.ru

Ля віна-гарэлачных крамаў і аддзелаў зранку адбудуцца стыхійныя мітынгі непахмеленых. Міліцыянтаў, што пастаўлены ахоўваць пункты, тут жа паб’юць і возьмуць у закладнікі. Самыя гарачыя і не зусім адпітыя галовы захочуць узяць паліцы штурмам. Далей — болей. Арганізм, атручаны шматгадовым злоўжываннем, падніме бунт і павядзе мужчын хоць куды — хоць на Дразды, хоць на мясцовую адміністрацыю. Пачнуцца такія любімыя ўладай вулічныя беспарадкі. Далучацца беспрацоўныя, лёгкая на пад’ём моладзь і футбольныя фанаты. Аднекуль возьмуцца не толькі сацыяльныя, але і палітычныя лозунгі. Неяк самі па сабе ўсплывуць у памяці злачасныя выбары ды іх наступствы. Тэмпература пратэсту рэзка падскочыць угору.

Крэўна зацікаўленая армія будзе трымаць нейтралітэт — з надзеяй сэканоміць у будучым частку заначкі. Міліцыю кінуць на ахову спіртова-гарэлачных складаў. Жонкі інсургентаў падзеляцца на дзве групы. Тыя, хто мужам налівалі, падтрымаюць іх: выйдуць на марш з пустымі каструлямі. Тыя, што беспаспяхова ваююць з зялёным змієм, будуць лічыцца «пятай калонай».

Натоўп, самаарганізаваўшыся, выбера кіраўнічы штаб. Мысляры з інтэлігенцыі тут жа прапануюць новыя сцяг і герб: сцяг — зялёны з белым (гэта значыць змій з намёкам на каня), а герб — з вяршнікам сярод пшаніцы. (Бо з канюшыны ды лёну яшчэ ніхто нічога талковага не выгнаў.) Увойдуць у моду зялёныя шалікі — тыпу як у «Беларусбанку». Адбудзецца дыскусія адносна новага гімна: адны прапануюць вядомы хіт «Ой ты віно, гаркота...», другія — «народную» песню «А я лягу, прылягу...». Пытанне застанецца адкрытым. Дэвізам стыхійнага руху выберуць слоган «Алкаголікі ўсіх краін, яднайцеся!».

Сябры па няшчасці з Летувы і Польшчы папаўзуць да нас гужом цераз мяжу, а расейцы і ўкраінцы прыедуць на цягніках з цяжкімі сумкамі, з якіх будуць спакусліва вытыркацца родныя пробачкі. На спецаўтобусах падвязуць працве\-разелую і не менш агрэсіўную правінцыю. Па БТ зноў раскажуць, што ва ўсім вінавата заходняя прэса, якая раздзімае ажыятаж, і што ў крамах дастакова разнастайных якасных напояў на душу насельніцтва.

Усе сінюшныя з урада і парламента, патаемна радуючыся, пойдуць на саступкі сасмяглым братам-пралетарыям. Гэта будзе першая ў свеце рэвалюцыя пітушчых.

Дэкрэт № 1 «Аб урэгуляванні цэнаў на спіртныя напоі» стане першым і апошнім дэкрэтам часовага ўрада. Рэвалюцыйны натоўп самараспусціцца і будзе доўга, шумна і зноў з беспарадкамі адзначаць сваю перамогу. Тады нарэшце з бункера, які ахоўвалі дзве верныя палкі спецназу, выйдзе і...

...«Досыць», — кажу я сваёй багатай фантазіі. Бо рэчаіснасць даўно пераўзыходзіць самыя крутыя антыўтопіі.

І ці тое яшчэ будзе?!

http://bchd.info

ВЕРШАСЛОЎЕ

## БЫКАЎ — ГЭТА ЛЕТА

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

**Дзень нараджэння і тут жа дзень смерці, дзень пачатку вайны і дні летняга сонцастаяння… Усе гэтыя дні дзіўным чынам сышліся на цесным часавым пятачку пад знакам Васіля Быкава.**




*Быкаў — гэта лета*
*з яго вышынёй, шырынёй,*
*Быкаў — гэта лета*
*з яго цішынёй і вайной.*

*Быкаў — гэта лета,*
*дзе то мір, то смерч.*
*Быкаў — гэта лета,*
*дзе то жыццё, то смерць.*

*Быкаў — гэта лета.*
*У бліках яго святла*
*бачная яўна адмета*
*змагання праўды і зла.*

*Быкаў — гэта лета.*
*Вялікі-вялікі дзень.*
*Ранак сустрэчы светлай*
*і развітання цень.*

*Быкаў — гэта лета,*
*дзе то быль, то легенда,*
*то мроя, то ўспамін,*
*то «станься», то «амін».*

*Быкаў — гэта лета.*
*Лета зямнога света.*
*Нябёс васількавая сінь.*
*Быкаў Васіль…*

Чэрвень 2011 г.

РОЗГАЛАС

# СЛОВЫ ПАДТРЫМКІ

**Рускія пісьменнікі «абураныя рэпрэсіўнай палітыкай беларускіх уладаў».**

«Мы... заклікаем калег ва ўсім свеце узняць голас пратэсту супраць падаўлення асноўных свабод у Беларусі», — гаворыцца ў заяве Рускага ПЭН-цэнтра, размешчанай на сайце расійскага аддзялення гэтай сусветнай арганізацыі пісьменнікаў.

«Мы таксама заклікаем урад Расіі строга рэгламентаваць эканамічныя прывілеі, што даюцца рэжыму Лукашэнкі, і паставіць іх у прамую залежнасць ад выканання правоў чалавека беларускімі ўладамі», — падкрэсліваецца ў заяве.

Як зазначаюць члены арганізацыі, «апошнім часам з Беларусі пастаянна прыходзяць паведамленні аб жорсткім насіллі над тымі, хто спрабуе так ці інакш выказаць сваю думку аб палітыцы ўладаў. Вядома, што свабода слова ў гэтай краіне падаўлена даўно».

Былі асуджаны пісьменнікі і журналісты Уладзімір Някляеў, Ірына Халіп, Павел Севярынец, Аляксандр Фядута, Дзмітрый Бандарэнка і іншыя, канстатуецца ў заяве. «Зараз размова ўжо нават не пра свабоду слова, але пра свабоду жэсту (забароны апладысментаў), пра права проста знаходзіцца на вуліцах Мінска. Немагчыма абыякава глядзець, як мажныя супрацоўнікі бяспекі ўчатырох-упяцёх накідваюцца, збіваюць і зацягваюць у «варанкі» безабаронных жанчын і старых, якія ўсяго толькі падазраюцца ў нязгодзе з палітыкай Лукашэнкі. Мы, пісьменнікі Расіі, выказваем сваё спачуванне і падтрымку ўсім, хто зведае насілле ў Беларусі», — гаворыцца ў заяве.

Пад дакументам падпісаліся члены выканкама Рускага ПЭН-цэнтра, вядомыя пісьменнікі Андрэй Бітаў, Аляксей Сіманаў, Леў Цімафееў, Юна Морыц, Аляксандр Гарадніцкі, Людміла Уліцкая, Ігар Ірценьеў.

**БелаПАН**

## ПАЛІЦА

### ЭДГАР ПО ПА-БЕЛАРУСКУ

**Эдгар ПО. Маска Чырвонае Смерці: выбраныя навелы, вершы, эсэ. — Мінск: Кнігазбор, 2011. — 472 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; Бібліятэка часопіса «ПрайдзіСвет» «PostScriptum».)**

У зборнік Эдгара По «Маска Чырвонае Смерці» ўключаны не толькі шырока вядомыя дэтэктывы — адны з першых узораў гэтага жанру ў сусветнай літаратуры — і жахлівыя апавяданні («арабескі»), але і значна менш вядомыя гратэскі пісьменніка — творы, што паказваюць «бацьку дэтэктыву» зусім з іншага, іранічнага, боку. У кнігу таксама ўвайшлі вершы і два самыя вядомыя эсэ Эдгара По: «Паэтычны прынцып» і «Філасофія кампазіцыі». Абсалютная большасць змешчаных у зборніку перакладаў друкуецца ўпершыню.

«На небасхіле сусветнай літаратуры зорка Эдгара Алана По — адна з найярчэйшых і найзагадкавых, — адзначыла ў прадмове да кнігі Нарынэ Шахназаран. — Паэт, навеліст, журналіст, філосаф, літаратурны крытык, Эдгар По — прыклад самаадданага служэння мастацтву, найвялікшай сілы духу мастака, які перамог трагедыю жыцця чарадзейнасцю творчай энергіі. Літаратурная спадчына Эдгара По — унікальная, хаця і невялікая па аб'ёме. Цяжка назваць тую сферу мастацтва слова, у якой ён не здзейсніў адкрыццяў, што натхнялі некалькі пакаленняў еўрапейскіх пісьменнікаў (сімвалізм у паэзіі, дэтэктыўны, навукова-фантастычны, псіхалагічны жанры ў навелістыцы, тэорыя «чыстага мастацтва» ў літаратурнай крытыцы). <…>

Эдгар По сваімі мастацкімі здзяйсненнямі ў паэзіі і навелістыцы здолеў выйсці за межы актуальных задачаў нацыянальнай літаратуры і пракласці дарогу новым кірункам і жанравым формам у развіцці еўрапейскай і сусветнай літаратуры».

**Прэс-служба СБП**

### «ПОЛЫМЯ РОДНАЕ» УЛАДЗІМІРА ГАЙДУКА

**У Беластоку ў бібліятэцы беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа» пабачыла свет новая кніга беларускага паэта з Польшчы Уладзіміра Гайдука.**

Кніга мае шчырую назву — «Полымя роднае», рэдагаваў яе Ян Чыквін. Чытаю радкі з верша, які адкрывае кнігу выбраных твораў: «А людзям хопіць адной слязы — на ўсё жыццё». Магчыма. Але я не пра сумнае, бо паэт у сваіх радках не плача, не наракае на ўласны лёс, бо думка паэта, якая «паліць сум», таксама «дорыць шчасце».

Уладзімір Гайдук на Беласточчыне жыве ў сельскай мясцовасці, як кажуць беларусы — «гаспадарыць на хутары». А Міра Лукша ў Беластоку неяк пры сустрэчы сказала: «Давай возьмем добрую пляшку і паедзем да Валодзі». Валодзем называюць яго ўсе сябры і паэты, нягледзячы на 70-гадовы ўзрост. А тыя, хто пісаў пра Уладзіміра Гайдука, заўсёды падкрэслівалі, што ён паэт-селянін (Уладзімір Конан), што яго матэрыяльныя ўмовы моцна трымаюць пры зямлі, прыніжаюць яго, ставяць у недарэчную залежнасць (Ян Чыквін). Тым не менш, Уладзімір Гайдук даўно вырваўся з гэтай мякка кажучы матэрыяльна-фізічнай сялянскай прыгнечанасці. Зямля, вёска, праца, хутар — гэта ўсё не пры чым. Галоўнае, што ёсць паэт — шчыры, светлы, адкрыты, просты, лёгкі, паэт — якому можна толькі верыць:

На лясы, на луг шырокі
Сонца падаюць праменні,
А дзяўчынка сінявока
Ловіць «зайчыка» у жменю...

**Сяргей ЧЫГРЫН, «Ніва»**

ПРЫСВЯЧЭННЕ

# АДПАВЕДНЫ ЖЫЦЦЮ

**Валярына**


Photo.ByMedia.Net

**Уладзіміру Пракопавічу Някляеву споўнілася 65 гадоў. Ну хто яму столькі дасць!? Ніхто. Маючы гэткае насычанае жыццё па ўсіх франтах, ён застаўся адпаведным жыццю. Яшчэ гадоў дзесяць таму ён — як прадчуваў сваю прышласць — хітра ўсміхаючыся, казаў: у мяне будзе старасць непадобная да старасці. Працей кажучы — яе не будзе. Так і сталася.**

Ніхто з памерлых, жывых, а, магчыма, і яшчэ не народжаных беларускіх літаратараў аніколі не меў і, верагодна, ужо ніколі не займее гэткую насычаную біяграфію, як Някляеў. Ён адзін. І большы за аднаго. А перад тым і пасля таго — неверагодная колькасць пасадаў, званняў, медалёў, узнагародаў і намінацый ва ўсемагчымых галінах на найвышэйшым узроўні, знітаваных з незлічонымі здрадамі, якія заўжды ідуць поруч са славай...

Апроч таго, Пракопавіч круты і харызматычны. Таго не адняць.

Някляеў мае некалькі іпастасяў. Здараецца — тыя бытнуюць у ім перыядычна, пераважаючы адна адну. Апошнім жа часам усё часцей і часцей спрабуюць суіснаваць: паэтычная, чалавечая, палітычная. Але падзел душэўнай тэрыторыі не спыняецца: кожная штохвілінна вядзе барацьбу за тое, каб заняць месца іншай.

Ды як ні круці — Някляеў найперш паэт, паэт ва ўсім, што ён робіць, што рабіў, што палёсіць яшчэ яму зрабіць. І ў прозе, і ў жыцці, і ў палітыцы, і ў каханні… І жыве ён паводле самім жа напісанага: «А вершы пішуць, як жывуць, як дыхаюць, як паміраюць…».

Шмат што яму можна (што нельга іншым) і даравальна, шмат чаго забаронена — але ён усё адно робіць. Але менавіта таму і менавіта цяпер Някляеў зрабіўся большым за сябе самога.

Някляеў заўжды пісаў няшмат, не спяшаўся пісаць. І не памыліўся з гэтым. Ягоныя кнігі канцэнтраваныя, зараджаныя невымоўнай энергетыкай, надзеленыя надзвычайнай сілай. І менавіта ў іх — адказы на галоўныя пытанні, што вызначаюць далейшы шлях паэта. У вершах ён размаўляе з Вечнасцю, спрабуе зазірнуць па той бок вечнасці паэта і вечнасці чалавека, па той бок сябе самога. «Так, як напісана, я і жыў. І быць так і таму, як напісана, з усёй маёй біяграфіяй, з усім маім жыццём…» — напісаў у «Замест Прадмовы» (аўтабіяграфіі для прыёму ў беларусы) Някляеў. Але вось як яно ўсё крутанулася.

*Усім на волю Бог дае іспыт —*
*І не займець збавення ад іспыту:*
*Адзін раз воля — калі ты з нябыту,*
*Другі раз воля — калі ты ў нябыт.*

З нябыту ці ў нябыт? Можна хіба падзівіцца ўспрыняццю жыцця дый жыццю Някляева.

*Ва ўсім, што ёсць, было і будзе —*
*Ані ў чым цябе магло не быць.*
*Цуды ўсе ў адным-адзіным цудзе:*
*У неверагодным цудзе*
*Жыць.*

Паэзія яго — наканаваная. Такі ў яго паэзіі лёс (ці «не лёс» — як любіць паўтараць Някляеў) — здзяйсняецца яна, спраўджваецца, прабіраецца ў жыццё, з жыцця забраная. Ад самага пачатку і да самага канца — лёсіцца…

*Калі пісаць, дык толькі*
*так пісаць,*
*Як бліскавіцу доўжыць бліскавіцай,*
*Як з вены ў вену кроў пераліваць…*
*Пісаць, як спавядацца і маліцца.*

У паэзіі Някляеў шчыры. Ад таго ён ёсць і будзе, наш Някляеў.

Дарагога любімага Пракопавіча — з Днём народзінаў! Паэзіі і Жыцця — каб быць у іх доўга і па праўдзе, як мы любім!

*Пазбыўшы нябыт, ты з'явіўся*
*на свет,*
*Каб свету здзівіцца.*
*Калі ты званар ці калі ты паэт,*
*Жыві на званіцы.*

*Няхай на зямлі хоць патоп, хоць*
*пажар,*
*Хоць ліха ды войны,*
*Калі ты паэт ці калі ты званар,*
*Ты лішні, ты вольны.*

MEMORIA

# СПАЧЫЎ РАМАН ТАРМОЛА-МІРСКІ

**25 чэрвеня на 76-ым годзе жыцця адышоў у вечнасць беларускі паэт Раман Тармола-Мірскі.**



Развітанне з Раманам Якубавічам адбылося ў Мінску. Пахаванне прайшло ў Міры.

Раман Тармола-Мірскі нарадзіўся 04.04.1936 года ў гарадскім пасёлку Мір Карэліцкага раёна Гарадзенскай вобласці.

У 1960 г. скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута. Працаваў старшым рэдактарам, загадчыкам літаратурна-мастацкага аддзела, галоўным рэдактарам літаратурна-драматычных праграм, каментатарам па літаратуры і мастацтву Беларускага тэлебачання. З 1977 г. сябра сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі мастацкіх фільмаў кінастудыі «Беларусьфільм», з 1980 г. — сябра сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі тэлевізійных фільмаў Беларускага тэлебачання.

Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1964 г.

Першыя творы апублікаваў у 1957 г. («Настаўніцкая газета», «Чырвоная змена»). Пры жыцці паэта выйшлі яго зборнікі паэзіі «Асколкі і росы» (1964), «Поўня» (1966), «Абнаўленне» (1968), «Пабач» (1974), «Толькі б дагаварыцць» (1986) і іншыя.

Саюз беларускіх пісьменнікаў выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім паэта.

РОЗДУМ

# ПЛАН НЯКЛЯЕВА

Анатоль ІВАШЧАНКА

*Палітыка ёсць найвышэйшай формай любові*
*Папа Павал VI*

*Палітыка — паралітыка*
*Лявон Вольскі*



Photo.ByMedia.Net

У гэтым «юбілейным» тэксце (у ліпені паэту споўнілася 65) будзе болей не пра паэтыку Уладзіміра Някляева, а — пра палітыку. Не, гэта не аналіз палітычнай праграмы Някляева-кандыдата альбо разбор памылак і поспехаў кампаніі «Гавары праўду» (якога, што праўда, бракуе дасюль). Хутчэй гэта спроба зірнуць на пэўныя працэсы, што пачаліся ў нашым — і незалежным, і залежным — грамадстве, праз прызму грамадскай дзейнасці У. Някляева. Думаецца, што і працэсы гэтыя, і дзейнасць — рэчы ўзаемазалежныя.

Уладзімір Някляеў, з'явіўшыся ў палітычным полі, адразу стаў нязручным усім — і сваім, і чужым. «Свае», як гэта ў нас прынята, адразу пачалі яго «мачыць» (каб чужыя баяліся) — бязлітасна й бязглузда жабіць, шукаючы ў кожным руху Някляева-палітыка руку Крамля, «ганаравалі» званнем першага блазна перадвыбарчай кампаніі, жывадзёрам і г.д. Чужыя ж неўзабаве падхапілі гэтую рыторыку, сыйшоўшыся з першымі ў адзіных жарсных абдоймах (пазней, калі някляеўская проза будзе вылучацца на Нобелеўскую, сітуацыя, па сутнасці, паўторыцца, але пра тое крыху ніжэй)… Як спяваў БГ, «на хрена нам враги, когда у нас есть такие друзья?».

Тым часам караван ішоў. Някляеў упарта гуляў не па правілах гадамі абкатаных і адпрацаваных сцэнараў трохграшовае оперы пад назовам беларускі апазіцыйны супраціў, стаўшы галоўным ньюсмэйкерам гэтае прэзідэнцкае кампаніі, робячы ўсё, каб разварушыць і сваіх ёдадэфіцытных суграмадзянаў, і калег-кандыдатаў: ад правядзення альтэрнатыўнага ўсенароднага хуралу, закліку зняцца, каб «даць яму магчымасць абірацца самому з сабой» — да выстаўлення трыбуны для дэбатаў насупраць рэзідэнцыі і крэатыўных флэшмобаў ды крычалак на рэдыё (гэтая драбяза, непазбежная для любой еўрапейскай перадвыбарчай кампаніі, як вядома, фактычна каштавала апошняму закрыцця).

Шмат каму і сам удзел Някляева ў г. зв. выбарах, і яго месца ў іх падаюцца даволі спрэчнымі і супярэчлівымі асобе гэтага чалавека. Так, Някляеў як асоба — як паэт і інтэлектуал — нашмат глыбейшы і аб'ёмнейшы за постаць Някляева-палітыка, што нібыта прыводзіць да немінучай супярэчнасці паміж гэтымі іпастасямі. Так, у вылучэнні Някляева ад пачатку было штосьці ненатуральнае. Нярэдка даводзілася чуць тады і ад літаратараў, і ад нелітаратараў: нашто ён палез у гэты бруд, усё адно нічога не дадуць зрабіць, толькі вады набаламуціць ды запляміцца. Лепш бы, маўляў, новую паэму напісаў. Ці раман. І ў такіх разважаннях, вядома ж, шмат рацыі. Але, стаўшы палітыкам, Някляеў не перастаў быць паэтам. Магу перафразаваць: калі б ён не стаў палітыкам, то, пэўна, страціў бы сябе як Паэт.

На пачатку 1920-х гадоў Яўгеній Замяцін так пісаў пра «ерэтыкоў» у літаратуры: «Для всякого сегодня, для всякой эволюции, для трудной, медленной, полезной, созидательной, коралловой работы еретики вредны: они нерасчетливо, глупо вскакивают в сегодня из завтра, они — романтики. Бабефу в 1797 году справедливо отрубили голову: он заскочил в 1917 год, перепрыгнув через полтораста лет. Справедливо рубят голову еретической, посягающей на догмы, литературе: эта литература — вредна. Но вредная литература полезнее полезной, она — средство борьбы с обызвестлением, склерозом, корой, мхом, покоем. Она утопична, нелепа — как Бабеф в 1797 году: она права через полтораста лет».

Някляеў — безумоўна «ерэтык» і для нашай літаратуры, і для нашага палітычнага мыслення.

У Някляева быў план: ён хацеў здзейсніць рэвалюцыю. Гаворка, вядома ж, не пра біццё шыбінаў, захоп тэлеграфа і стрэл з танка каля Дому афіцэраў. Яго мэтай была, паводле іншага расійскага класіка, рэвалюцыя ў галовах. Пасля Плошчы-2010 шмат абмяркоўвалі, што было б, калі б ён дайшоў да гэтай самай плошчы (якая, карыстаючыся яго ж паэтычным тэзаўрусам, была для Някляева Прошчай, да якой паэт спусціўся са сваёй званарні — месцам казані, сумоўя і са сваім народам, і, наважымся сказаць, з высокім небам). Дык вось, умоўны лад тут зусім недарэчны. Які алгарытм дзеянняў быў бы, чым бы ўсё скончылася, калі б… Няма ў гісторыі ўмоўнага ладу. Ды і ці не дайшоў ён напраўдзе да тае плошчы? Хай сабе й не фізічна, але, так бы мовіць, духова? Думаецца, што дайшоў.

І тыя, хто не далі яму дайсці фізічна, выдатна разумелі, чаго чакалі і што спадзяваліся пачуць людзі, выйшаўшы на плошчу 19-га…

*І ўпершыню, маўкліва сціяўшы рот,*
*З натоўпу глянуў люд.*
*Амаль народ.*

Дзеля адмены гэтага «амаль», дзеля адчування сябе як народу — хай сабе яно доўжылася ўсяго гадзіну таго сапраўды народнага, нават сямейнага шэсця — і працаваў Някляеў-паэт і Някляеў-чалавек. Прычым — задоўга да стварэння сваёй грамадзянскай кампаніі.

Гэта і ёсць той экватарыяльнай нітаю, на адным полюсе якой — водар рубінаўскага «туалетішча», а на другім — глыбока нацыянальная й народніцкая (не магу падабраць лепшага слова) па духу творчасць Някляева; бязглуздая коўзанкавая папсень і выступ Паэта, які ссумаваўся за 20 гадоў па стадыёнах і якому сапраўды ёсць што сказаць…

У сваім эсэі, прысвечаным 65-годдзю У. Някляева (гл.: «Дзеяслоў» №52), Рыгор Сітніца, абураючыся з нагоды таго, што «той-сёй з газетчыкаў» называе паэта палітыкам, піша: «Ты [Ул. Някляеў] не палітык. Для гэтага трэба, як мінімум, нарадзіцца не паэтам». То бок, з гледзішча мастака, гэтыя дзве іпастасі — рыхтык як геній і ліхадзейства — несумяшчальныя.

Але ўсё залежыць ад таго, што ўкладаецца ў найменне «палітык». Мы дагэтуль верныя забабону, што ўлада псуе чалавека; што прыстойным людзям няма чаго рабіць у палітыцы, а сама прыстойнасць сінанімічная дысідэнцтву… Так, валадарамі думак у цяперашні час становяцца не пісьменнікі, а спіч-райтары. І Някляеў востра разумеў, што выступаў у няхай і бітма набітых, але цесных літаратурных зальчыках недастаткова. Бо па іншы бок — уся моц ідэалагічнай машыны са сваім бачаннем сітуацыі. Вуснамі персанажаў сваёй новай паэмы «Армагедон» (друкавалася ў часопісе «Дзеяслоў», №№ 44-47) Някляеў гэтае бачанне красамоўна праілюстраваў:

*Апендыцыт*
— Ды псіх ён! Ён дурэе,
А нам капец?..
*(На Пустога)*
Як бочку, пакачу!
*Тэлевізар крычыць, закашляўшыся*
— Народны бунт!..
*Армагедон*
— Што гэта з ім?
*Доктар*
— Хварэе.
*Армагедон*
— Дык падлячыце.
*Доктар*
— Я народ лячу.
*Пусты*
— На-род-ны лекар…
Я лячу народ,
Які за мной на захад і на ўсход
Ідзе — абы карміцца!
*Армагедон*
— Ён галодны?..
*Пусты*
— Баіцца быць галодным!
І свабодным
Баіцца быць!
І ўсё, што мне заўгодна,
Як з гліны,
я зляпіць магу з народа,
Які, куды ліхтарыкам свячу,
Туды ідзе, і ўсё, што захачу,
Я буду мець з такім народам, от
Сабе свячу, а думае народ:
Яму свячу! За мной ідзе ў паход,
Святло маё нясе,
што характэрна, от,
Не па зямлі ідзе, па прамяню
Ліхтарыка, а я яму маню,
Што па зямлі, а ўвогуле народ
Да ліхтара, да лямпачкі мне, от,
Г...но — народ…

Паэт і палітык — дыялектычная пара. Палітык ніколі не скажа ўсяе праўды пра свой народ, бо апошні яго цалкам і ва ўсім задавальняе ў сваім існым выглядзе. Дыялектыка ж пачынаецца, калі паэт, ведаючы, што ён яшчэ й палітык, гэтую праўду ўсё адно гаворыць. Бо, паўторымся, — не казаць не можа.

Можа падацца, што гэты тэкст — юбілейны панегірык, дзе зробленае Някляевым і яго кампаніяй ідэалізуецца. Гэта не зусім так. Але для мяне няма аніякага хістання ў тым, што Някляеў — палітык менавіта ў такім, найвышэйшым разуменні. А для кожнага палітыка галоўнае акурат тое, банальнае, як любая ісціна і агучанае ў адным з перадвыбарчых тэлезваротаў, — здольнасць слухаць і чуць. І рэзкая метамарфоза стылю паводзінаў, якую мы ўбачылі на нядаўняй прэс-канферэнцыі — ад усведамлення абсалютнага да ўсёведання, але ўсё ж не абсалютнага — гаворыць, што да кагосьці той зварот усё-такі дайшоў.

Што да вылучэння У. Някляева на Нобелеўскую прэмію, то ў гэтай гісторыі бачыцца адна прыкрая непазбежнасць. Цяпер шмат тых, хто раней ніколі не ўзяў бы прозу Някляева ў рукі, і перадусім — «браты па пяру», якія па вызначэнні адзін аднога не чытаюць (некаторыя з іх адразу ж публічна пачалі казаць пра неадпаведнасць творчасці Някляева такой высокай адзнацы), захоча пазнаёміцца з творчасцю вылучэнца. І гэта нагадвае тое, як чытаюць у школе зададзеныя да ўроку тэксты: не проста так, а праз прызму адказу настаўніку (чытай: «адэкватнасці» высокай узнагародзе).

Нашая сітуацыя крышачку нагадвае гісторыю вакол Пастарнака — маю на ўвазе шматлікія спекуляцыі пра «заслужанасць» і «адпаведнасць». На жаль, як бы там яно ні скончылася, пазатэкставыя фактары ўздымаюцца над тэкстам… Між тым, мяне ўжо чалавек пяць папракнула, што я «бараню сваіх», праяўляю нейкую карпаратыўную этыку (хаця ні ў якія карпарацыі не запісваўся), бо з якіх жа яшчэ меркаванняў гэта можна хваліць прозу Някляева? Вось жа, адказваю ўсім тутака, што лічу яе, гэтую самую прозу, найбольш адметным з'явішчам у беларускім літпрацэсе. Я нічога не ведаю пра адэкватнасць і адпаведнасць. Я здагадваюся, што ў пэўны момант тэкст і сапраўды стаецца другасным. Я б з задавальненнем, калі б мог, аддаў прэмію спачатку Разанаву, а пасля Барадуліну, Бабкову і яшчэ дзясятку нашых літаратараў… Але гаворка не пра Нобеля і нават не пра Някляева, а — пра нашае стаўленне да свайго й пра той сумны прынцып, які канстатаваўся ў першым абзацы гэтага артыкула.

**Люты — ліпень 2011 г.**

ФРАШКА

## «НЯКЛЯЕЎ НАЗАД НЕ ВЯРТАЕЦЦА»

Анатоль ІВАШЧАНКА

Колькі гадоў таму мой дарагі кум у кубе Сева Сьцебурака ладзіў у Вялейцы прэзентацыю сваёй першай кніжкі. На прэзу Сева запрасіў у якасьці разагрэву не абы каго, а Уладзіміра Някляева, Алеся Пашкевіча, Барыса Пятровіча ну і мяне. Вечарына прайшла дужа душэўна, другая яе чаканая-непазбежная частка яшчэ лепш: у хлебасольны дом Севусевых бацькоў, апроч вялейскіх, панаехала гасцёў і з Менску, і з Маладэчна, і з Астраўца… (Памятаецца, галоўны герой перыядычна выкрадаў аўтара свайго ўлюбёнага «Паланэзу» на вулку, дзе пад калючымі зімовымі зорамі, трэба думаць, паказваў мэтру свежыя вершы.)

Словам, завершылася свята — калі месяц у марозным вялейскім небе ўжо на коміне драмаў.

На зваротны шлях да нас у самоход падсеў яшчэ адзін таварыш з Менску.

Ад'ехаўшыся кіламетраў дваццаць, наш кіроўца (і «па сумяшчальніцтве» рэдактар аднаго някепскага часопіса) заўважыў, што забыўся сярод застольнае мітусні свой піжмак. Ну, піжмак яшчэ паўбяды, але ж тамака засталіся й правы кіроўцы. Што рабіць — трэба вяртацца. І вось тут Уладзімір Пракопавіч прамовіў фразу, якая калі-небудзь увойдзе ў падручнікі для малодшых класаў: «Някляеў назад не вяртаецца». Прамоўлена гэта было спакойна, без лішняе помпы, але гэтак цвёрда, што нікому й да галавы не прыйшло аспрэчваць рашэнне. Спыніліся ля нейкага мясцовага клубу, дзе была ціскатэка, і пакінулі таварыша з Менску (каб не сумна) плюс пляшку (каб не змерзлі).

Пінжак чакаў гаспадара на крэсле ля стала, а прычыну казусу патлумачыла Севава матуля: маўляў, яна ўсіх перахрысціла на дарогу, а на кіроўцу забылася (ці тое ён сам нейк ухіліўся?).

«Дзе ж вы так доўга?» — сустрэў нас сп. Уладзімір, занёс таварыша з Менску ў салон і ўвесь астатні час не збіўшыся й не схлусіўшы вёў спеўны рэй. Памятаю, адной з фінальных думак таго вечара было: «Шэсцьдзясят? Не, гэтага не можа быць»…

▸ АКТУАЛІІ

# ТАЯМНІЦЫ МЯРЛІНСКІХ БАЛОТАЎ,
## АБО ДАЧАРНОБЫЛЬСКІ «ПАЛІГОН»

Аляксей ДУБРОЎСКІ

**Мы шмат даведаліся аб эксперыментах над людзьмі ў савецкія часы, звязаныя з уплывам «малых дозаў радыяцыі» на чалавека. На жаль, усе палешукі, як у Беларусі, так і ва Ўкраіне і часткова ў Расіі, былі ў першай палове 60-ых паддоследнымі...**



Менавіта тады з'явілася на Палессі паняцце «памёр ад белакроўя». У нашыя дні беларускія дактары, абследуючы дзяцей у Столінскім раёне, разводзяць рукамі ў здзіўленні: чаму тут такі вялікі адсотак хворых пры адносна невялікай забруджанасці раёна радыяцыяй. Мяне, радавога інжынера-эколага, на пачатку 90-х выклікалі ў Мінск у камісію па экалогіі, каб даў тлумачэнне прычынаў Столінскай трагедыі. Там жа я і даведаўся, што сітуацыя з дачарнобыльскай радыяцыяй дагэтуль трымаецца ў сакрэце.

У 1991 г. мне ў рукі трапіла навуковая праца «Глабальныя выпадзенні цэзія 137 і чалавек», выдадзеная ў 1974 г. для «Службовага карыстання». У атамнае стагоддзе такія працы па атаме натуральныя. Толькі ненатуральна, над кім праводзілі доследы.

Пасля таго, як у 1962–63 гадах на галовы палешукоў абсадзілі радыёактыўныя аблокі, у 1967-м на чатыры гады прыехала на Палессе праводзіць даследаванні сакрэтная экспедыцыя Інстытута біяфізікі пры Міністэрстве здароўя СССР. Бралі пробы вады, глеб, раслін, малака, мяса, даследавалі групы насельніцтва на наяўнасць цэзія і стронцыя ў арганізме…

…Каля Крэменчуга яшчэ ў 1958 г. быў створаны аэрадром, як бы для назірання за метэаабстаноўкай. А яшчэ з 1954 г. пачалі паволі высяляць хутаранцаў з так званых Мярлінскіх хутароў (Столінскі раён Беларусі). У 1962-м іх не стала, нягледзячы на пасіўны супраціў жыхароў. Спачатку афіцыйна планавалі выкарыстаць тэрыторыю як палігон для выпрабаванняў ракет сярэдняй дальнасці, але з-за вялікай колькасці вёсак вакол палігона і недакладнасці ракет задуму спынілі — і палігон стаў выкарыстоўвацца дзеля паветраных бамбаванняў па наземных цэлях.

Першая спроба пракрасціся на «Мярлінскі» палігон з сябрам была нелегальнай. «Экскурсія» скончылася ў штабе палігона. Дзяжурная змена нас выявіла на аб'екце, і давялося прыкінуцца аматарамі дзікай прыроды.

І вось паступаюць найноўшыя дадзеныя: на меліярацыйным аб'екце «Пачапова» ў прыгарадзе Пінска плутоній у глебе перавышае дапушчальны ўзровень у шэсць разоў, у вёсцы Белавуша Столінскага раёна — у дзесяць. Але плутоній выпаў ад ЧАЭС не далей 15 км. Чаму тады мы спажываем яго ўжо больш 30-і гадоў?

Далей… Урад СССР у шкоду расійскаму Нечарназем'ю раптам вылучыў перад 70-мі гадамі нам, палешукам, 2 мільярды рублёў на меліярацыю. Ці ўвязваецца гэты факт з узнятай праблемай? Аказваецца, наўпрост. Згаданая вышэй экспедыцыя Інстытута біяфізікі ў 1970 годзе на падставе даследаванняў па Брэсцкай вобласці прыйшла да нечаканай высновы: пры аднолькавай колькасці цэзія-137 у глебах з асушаных балот ён трапляе ў расліны і далей у малако ад 3 да 10 разоў менш, чым з цаліннага балота. І тут жа ў згаданай вышэй кнізе, у раздзеле «Пытанні прафілактыкі», члены экспедыцыі высоўваюць на першае месца… меліярацыю. А як жа яшчэ можна засцерагчы мільёны людзей?

На сёння практычна 70 % балотаў Палесся асушаны. Пацверджанне такім паводзінам цэзія выявілася ўжо ў новым «Руководстве по ведению агропромышленного производства в условиях радиоактивного загрязнения земель Республики Беларусь на 1993–1995 гг.». Цытую: «Уздым узроўня грунтавых вод на глыбіню 40–50 см ад паверхні глебы прыводзіць да павелічэння паступлення радыёнуклідаў у расліны ў 5–20 разоў, а яго паніжэнне да 150–200 см у 1,5–2 разы».

Урадавая газета «Звязда» раптам прыўзняла таямнічую заслону дачарнобыльскай радыяцыі і паведаміла, што на Палессі да 1965 г. праводзіліся выпрабаванні нейтроннай зброі. Мала таго, саюзныя «браты» палічылі, што Палессе — неперспектыўны сельскагаспадарчы раён і пачалі «асаджваць» тут радыёактыўныя аблокі, што ішлі на Заходнюю Еўропу ці на Маскву з палігонаў на Новай Зямлі і Сяміпалацінску, дзе тады праводзілі выпрабаванні атамных бомбаў у стратасферы. Я бачыў лісты ў райвыканкамах, у якіх старшыня Дзяржкамгідрамета СССР Ю. Ізраэль папярэджваў аб гэтых акцыях. Вось адкуль ёдзістыя таблеткі ў школах, якія выдаваліся ў тыя — дачарнобыльскія — часы! Ну чым не генацыд? Экспазіцыйныя ж дозы былі не 10–20 мікрарэнтген, як паведамілі з Цэнтра, а 120. Здавалася б, публікацыя ў «Звяздзе» хоць і не прыводзіць дакументаў, а толькі асабістае сведчанне, пацвярджае мае здагадкі. Але тут жа ў наступным нумары газеты з'яўляецца абвяржэнне сп. Несцярэнкі: «брудныя» аблокі туды выпадкова прыляцелі з… Кітая. Гэта яшчэ раз пераканала мяне, што кірунак пошуку — правільны. І я зноў засабіраўся ў дарогу на палігон.

Маімі спадарожнікамі гэтым разам былі карэспандэнт беларускага радыё У. Макаўчук і загадчык аддзелам газеты «Пінскі веснік» У. Меляшэнка. Узялі афіцыйны дазвол у Мінабароны на ўезд на «Мярлінскі» палігон і — паехалі…

Першым суразмоўцам стаў вядомы ў акрузе чалавек, былы дырэктар школы, вялікі знаўца гісторыі краю М.У.Шэлехаў. Сітуацыю ён нам не патлумачыў. Успомніў толькі, што ў 60-ыя гады пару разоў вылятала шкло ў вокнах ад выбухной хвалі, а гэта 20 км ад палігона, і тады ж узмоцнена давалі дзецям таблеткі. Часта прыязджалі дактары правяраць здароўе дзяцей. Нашае знаёмства з Міхасём Уладзіміравічам дало магчымасць выйсці на больш дасведчаных людзей. І адным з іх быў пенсіянер Е.М.Герасімовіч. Ён працаваў на палігоне з 1959 г., займаючы пасады ад ляснога тэхніка да галоўнага ляснічага Палескага ваенлясгаса. Родам быў з выселенай вёскі Вілля. Жыццё да высялення было вельмі своеасаблівым і амаль вольным, бо аніякія ўлады да іх не маглі дабрацца. За час вайны не бачылі немцаў. Ніхто не ведаў, колькі ў людзей зямлі. А ў 1961 г. прыехала сур'ёзная камісія і стала апісваць маёмасць, пабудовы, сады, а ў восеньскую слоту і вайсковыя машыны наляцелі. Пачалося высяленне трох вёсак і больш тысячы сядзібаў.

Праз два гады асобныя сем'і пачалі вяртацца назад у родныя мясціны. Але з неба пасыпаліся бомбы, каля Колак быў створаны ракетны палігон. Самавольныя вяртанцы сыйшлі. Да 1963 г. насельніцтва было ў асноўным выселена, і палігон стаў дзейнічаць. Можна толькі выказаць здагадку, колькі бомбаў і снарадаў за 30 гадоў скінута на гэтую зямлю! А вось што выпрабоўвалі тут ядзерную зброю, сказаць нам суразмоўца не змог. Чытаў у нейкай газеце, што ў часы Хрушчова ў небе Палесся, у стратасферы, быў здзейснены атамны выбух. Ні салдаты, ні працаўнікі лесу ніколі не карысталіся сродкамі абароны, хоць, калі гарэў лес каля Альман у 1982 годзе, многія ўдзельнікі тушэння пажару моцна захварэлі, ды і ён сам стаў сябе адчуваць горш.

Прырода палігона да 1965-га была вельмі багатай. Старыя высокапрадукцыйныя лясы, некранутыя балоты цягнуліся на дзясяткі кіламетраў. Цяпер не тое: ад лясоў засталіся бездапаможныя астаткі. Жывёльны свет захаваўся, але ўжо не палююць на дзікоў. Нарыхтавалі ласёў, аднак на нарыхтоўчым пункце не прынялі: шмат радыёнуклідаў у мясе. Давялося закапаць у лесе…

Для знаёмства з тэрыторыяй «Мярлінскага» палігона начальнікам штаба падпалкоўнікам Б. У. Батчанка нам быў выдзелены КамАЗ з кіроўцам Б. Г. Паляшчуком. Наш гід, аказалася, у 1962 г. праходзіў тут тэрміновую службу, быў вадзіцелем у камандзіра. Перавёўся сюды з Вулькі Івацэвіцкага раёна, дзе размяшчаўся ракетны полк. Адтуль, па яго словах, і праводзіліся пускі ракет на гэты палігон, а адзін раз прыйшлі цягачы з ракетамі з-пад Брэста.

Наш шлях па палігоне пачаўся з паўночнага КПП, поруч якога ўбачылі актыўную гаспадарчую дзейнасць па дрэваапрацоўцы. Першы прыпынак зрабілі праз 10 кіламетраў на месцы былой вёскі Колбікі. Замяралі экспазіцыйную дозу прыборам СРП-88. Паказаў ён 17 мікрарэнтген/гадзіна.

Дзень выдаўся сонечны, цёплы. У Колбіках (далей для прывязкі да мясцовасці я буду казаць аб вёсках, як аб існых) нас сустрэў салдат тэрміновай службы. Выйшаў на парог басанож, расшпілены на ўсе гузікі, паглядзець на гасцей. Служба тут спецыфічная. Завозяць у лес па адным і пакідаюць на тыдзень ахоўваць маёмасць назіральнага пункта…

Праехаўшы чарговы пункт назірання і ўброд раку Сцвігу, мы патрапілі ў вёску Калкі. Ад паселішча не засталося і следу. Хіба што могільнік нагадвае, што раней тут жылі людзі. Від, які адкрыўся нам, быў жудасным. «Працоўнае поле» яшчэ ў 1962 г. было ўладкавана на месцы вёскі, уключаючы і могільнік, дзе апошнія пахаванні зробленыя ў 1958-м. Вакол узвышаліся пяшчаныя выдмы, амаль без расліннасці, зямля ў варонках, асколках. Але могільнік уразіў нас больш за ўсё. Гэта да якой ступені павінен дайсці чалавек, каб здзейсніць такое варварства? Могільнік перарыты варонкамі: валяюцца буйныя асколкі і часткі пабітай тэхнікі, пахіліліся драўляныя крыжы, сухія стогадовыя дубы і хвоі. Могільнік — гара пяску, ніводнай жывой травінкі…

З цяжкім пачуццём мы з'язджалі адтуль, а дазіметр паказваў ужо 43 мікрарэнтгена, што ў два разы больш нормы.

Апошнім пунктам паездкі была вёска Храпунь. Прастаяла яна на маляўнічым беразе Сцвігі не меней чатырох стагоддзяў. Цяпер усе палі і сама вёска засаджаны хваёвым лесам. Яшчэ восем гадоў назад можна было ўбачыць царкву сярод старых хвой. Цяпер застаўся падмурак і драўляны крыж на ім з кавалкам прыбітай дошкі і надпісам: «Падарожнікі, успомніце пра Бога». Надпіс, зроблены фарбай ад рукі, нібы падводзіць вынік філасофіі нашага жыцця.

Радыяцыйны фон у Храпуне дайшоў да 55 мікрарэнтген, а пад дрэвамі — да 70. Тым не менш, у пойме ракі ходзяць статкі кароў з Украіны ці з Гомельскай вобласці. Адназначна: малако і мяса ад гэтага статка непрыдатныя ў ежу. А яны тут з вясны да зімы пасвяцца...

Праехалі па палігоне не меней 60 км па жудаснай дарозе. Бездапаможнае ўражанне пакінулі лясы. Усяго палігон займае не меней 100 тысячаў гектараў. З савецкіх рэспублік толькі Казахстан такі ж «падарунак» атрымаў пасля распаду СССР. З выкарыстаннем гэтага «падарунку» ўсе праблемы яшчэ наперадзе. Ужо калі выязджалі за вароты КПП, да нас нечакана падышоў пажылы чалавек з супрацоўнікаў і вымавіў: «Тут вы нічога не знойдзеце. У маладосці нам даводзілася піць ваду з варонак ад бомбаў, але пілі не з кожнай. Там, дзе была дробная жыўнасць — пілі, а дзе вада была чыстай, знежывелай — абыходзілі».

Дык ці мог быць «Палескі» (у народзе Мярлінскі) палігон месцам правядзення выпрабавання ракет, бомбаў, снарадаў, не выключана, што нейтроннай, ядзернай зброі або іх асобных элементаў? Вазьму на сябе адвагу сцвярджаць, што былі тут нейкія пахаванні, магчыма, адыходаў ядзернай вытворчасці. Мой калега па працы служыў у артылерыйскім палку пад Львовам, і сюды прыязджалі на стрэльбы. Гарматы пакідалі на палігоне, ад'язджалі на 20 км і дыстанцыйна кіравалі стрэльбамі. Нездарма ж камандзіраў палігона ў свой час часта выклікалі ў Маскву. Можа, толькі яны і ведалі праўду. На жаль, адзін з іх памёр ад рака, а ў другога 11-гадовая дачка пайшла з жыцця ад той жа хваробы…

Ад наступстваў радыёактыўнага забруджвання навакольнага асяроддзя паміраюць дзеці, а грамадства і нават бацькі — маўчаць, усё на Чарнобыль спісваюць, на беднату дзяржавы наракаюць. І змірыліся з бядой. Яскравы прыклад таму — заява аднаго з афіцэраў палігона. Ён, хто выхоўвае хворую маленькую дачку, жыццё якой знаходзіцца на грані катастрофы менавіта ад радыяцыі, сказаў мне: «Навошта табе гэтыя клопаты? Усё роўна не зменім сітуацыю ні ты, ні я». Падобна, людзі губляюць галоўны інстынкт прыроды: захаванне роду. У такіх выпадках цяжка казаць і даказваць відавочнае і быць зразуметым і пачутым…

Палігон ліквідавалі, а ў 1998 г. там арганізавалі ландшафтны заказнік «Альманскія балоты» на плошчы больш 90000 га. А таямніцы яго застаюцца таямніцамі, і толькі можна меркаваць, чаму.

ПАМЯЦЬ

# «ШЛЯХ МОЙ САМОТНЫ…»: ВАСІЛЬ ГАДУЛЬКА

Алесь КАСКО

**Сонечная актавая зала жабінкаўскай школы мастацтваў з мяккім, адкрытым абліччам-партрэтам Васіля Гадулькі, кветкамі ў празрыстых вазах, выставаю кніг, часопісных і газетных публікацый паэта, а галоўнае — яе шматлюднасць схіляла да такога ж лірычна-светлага настрою і арганізатараў літаратурнага свята: супрацоўнікаў раённай бібліятэкі, гасцей-пісьменнікаў ды іншых яго ўдзельнікаў. Аднак цень смутку не-не, дый прабягаў па тварах усіх: юбіляру толькі 65, яшчэ б яму ствараць ды ствараць, а яго ўжо няма больш чым паўтара дзясятка гадоў.**

Нарадзіўся Васіль Гадулька 18 траўня 1946 года ў вёсцы Федзькавічы, гістарычна — Хведкавічы, у пяці кіламетрах ад Жабінкі і ў 25-ці ад Брэста. Хата, дзе была яго калыска, стаіць і цяпер, амаль вокамгненна прададзеная пасля смерці паэта (жалобная дата — 15 чэрвеня 1993-га) з лёгкай рукі брата пад «бістро», балазе знаходзіцца на скрыжаванні шумных шашэйных дарог. У ёй, бацькоўскай сялянскай хаціне, ён і памёр — самотна, на драўляным ложку каля століка з некранутымі лекамі і недапітым вінам. Усё здарылася амаль так, як ён і прадбачыў у сумна-іранічнай аўтабіяграфіі для тутэйшай бібліятэкі: памёр «без сродкаў для існавання, незразуметы, расчараваны і пакінуты ўсімі». Памыліўся толькі ў даце, ды і то на адзін год, свайго сыходу.

Паэтава жыццё давала збоі не раз: дачаснае развітанне з інстытутам замежных моў, расчараванне ў настаўніцкай працы, страты блізкіх людзей, пакутлівае каханне да замужняй жанчыны, занадта цеснае сяброўства з Бахусам, якое не ратавала, а, наадварот, узмацняла дэпрэсію. Яно ж, бадай, і стрымлівала выходзіць з вершамі на шырокую аўдыторыю. Сціпласць убірала ў сябе і сарамлівасць, і вінаватасць.

А між тым федзькавіцкі паэт мог бы «загучаць» задоўга да 1986-га, калі яго «адкрыў» жабінкаўскі цёзка-сябар Васіль Сахарчук. Творчасць не проста дапамагала яму выжываць ва ўласных мітрэнгах — яна стваралася ім свядома, прафесійна, нездарма паэт сам, без чыіх-небудзь патрыятычных настаўленняў, прыйшоў да неабходнасці пісаць па-беларуску. Мне, знаёмаму з рукапісным архівам аўтара, нават раннія, юнацкія яго вершы зусім не падаліся «толькі асабістым хобі», як напісаў ён у згаданай паўжартоўнай аўтабіяграфіі. Аднак не без налёту кніжнасці, празмернай цягі да «мастацкасці мастацтва», часам штучнай аздобы, што, між іншым, адзначаюць крытыкі і ў рускамоўных вершах Максіма Багдановіча. Згадаў вялікага паэта — і зазначаю: ці не пад ягоным уплывам зрабіў Васіль «крэн» да беларускасці? У роднамоўных вершах і паэмах Гадулькі ёсць усё: глыбіня думкі і пачуцця, адметная вобразнасць, беззаганная гартоўка радка. Яны ў большасці сваёй простыя і важкія адначасова, зграбныя, адмысловыя і натуральныя, нязмушаныя. Не кранутыя постмадэрнізмам? Як сказаць. Зноў згадваецца Багдановіч і яго вечна надзённы выраз: для нас усе шляхі прыдатныя. Хіба ж не ішлі за ім «Тутэйшыя», калі пачыналі свой шлях з паэтызацыі красы пылу, павуціння, смецця і супрацьстаўлялі ўсё гэта бадзёраму сацрэалізму? Бравурных матываў няма і ў Васіля Гадулькі, аднак у яго куды менш, чым у многіх з іх, знарочыстасці, куды больш натуральнасці:

*І, хоць вецер гне сухое вецце,*
*і, хоць іней срэбрам лёг на скронь, —*
*нельга мне, шкада змахнуць,*
*як смецце,*
*ліст, які сагрэў маю далонь.*

Хто ведае, у якім напрамку пайшла б далейшая творчасць паэта? Даведацца не дазволіў час. Маем што маем — у асноўным паэзію класічнага ўзору («адмысловага класічнага ўзору», як слушна сцвярджаюць знаўцы ягонай творчасці). Гэта зусім не азначае, што яна згубілася ў традыцыйнасці, не выйшла за рамкі яе. Вольна пачуваецца аўтар і ў шматвектарнасці матываў, інтанацый, і ў разнастайнасці жанраў і формаў: балады і паэмы, трыялета і санета (у тым ліку вянка санетаў), актавы і народнай песні. Ці ж, напрыклад, не самабытна, не па-новаму напластаваў ён на адвечную тэму мастацтва і мастака свой «зрэз»?

*Дзівосных песень адгалоскі*
*да нашых дзён дайшлі здалёк.*
*А кветкі згортваюць пялёсткі,*
*калі іх атуляе змрок.*

*Не дагаджайце. Патрабуйце,*
*каб песня песняю была…*
*А лепей самі паспрабуйце*
*вырошчваць кветкі — без святла.*

Кветкі без святла, вершы без аптымізму — яшчэ адна прычына, чаму Гадулька не спяшаўся выходзіць да шырокага чытача. Якой-небудзь прасветліны ні ў асабістым жыцці, ні ў тым, што за сценамі роднай хаты, ён не бачыць: «радыяцыя роспачы» ў яго не толькі ад чарнобыльскай катастрофы, на якую, дарэчы, паэт з болем адгукнуўся адразу ж, але і ад шалёнага тэхнічнага прагрэсу наогул, галоўнае ж — ад «натоўпу прагавітых, нахабных, разбэшчаных». Такія вершы, як «Неспакой», «Голас», «Чорная госця», іншыя, прасякнуты публіцыстычным напалам, аднак іх сярод завершаных няшмат, не адзін твор застаўся ў чарнавых накідах. Скажам — уступ да паэмы «Д'яблы», накрэслены без падтэксту, адкрыта і з'едліва: народу на д'яблаў «кірзавых ботаў хопіць — такі ўжо парадак: каб не босай нагой — пад азадак!..»

Аднак вернемся ў сонечную залу, на ягоную юбілейную сустрэчу без яго. Хораша прагучалі тут многія вершы паэта з вуснаў і дарослых, і юных артыстаў-чытальнікаў, а таксама беларускія песні ў выкананні народнага хору «Скарбніца». Асобная старонка была адведзена для нас, хто добра ведаў Васіля Гадульку, а паэт і фатограф Аляксей Ганчук застаўся адзіным аўтарам ягоных партрэтаў… Мы дзяліліся не толькі думкамі пра вартасць Васілёвых вершаў і паэмаў, а і ўспаміналі сустрэчы з ім, пасля якіх выносілі яркія ўражанні ад прачытанага ці самім аўтарам, што здаралася зрэдку, ці кім-небудзь іншым. Заставаліся і здзіўленне ад яго незвычайнай сціпласці ў паводзінах і гаворцы, нават перад маладзейшымі, і жаль ад Васілёвай празмернай замкнёнасці ў сабе. А тым часам, напрыканцы 1980-х, ягоны рукапіс пакрысе рыхтаваўся да друку Васілём Сахарчуком…

Згадваліся з удзячнасцю імёны іншых паэтаў, што рупіліся пра выданне твораў Гадулькі асобнаю кніжкаю, праўда, ужо галоўным чынам пасля сыходу з жыцця абодвух Васілёў. Збіраліся народныя грошы і на Берасцейшчыне, і ў Мінску, вяліся перамовы з выдавецтвамі. Нарэшце, дзякуючы перш за ўсё клопатам Леаніда Галубовіча і асноўнай фундатарскай дапамозе Леаніда Дайнекі, у 2004 годзе выйшаў пасмяротны зборнік Васіля Гадулькі «Голас». Астатнія сродкі былі ўкладзены ў помнік (скульптар-мастак Сяргей Казак) на магілах паэта і яго бацькоў у Федзькавічах.



Фота Аляксея Ганчука.

Берасцейскія літаратары Аляксей Філатаў, Іван Дацкевіч і Алесь Каско кладуць кветкі да надмагільнага помніка Васілю Гадульку.

Пасля юбілейнай урачыстасці ў школе мастацтваў гурт пісьменнікаў, бібліятэкараў, журналістаў наведаў гэтую памятную мясціну, дзе на гранітным камені ў форме восеньскага кляновага ліста — знакавага для паэта вобраза, — пад абрысам ягонага аблічча выпісаны тры словы з верша: «Шлях мой самотны…».

*Вунь лісцік на дрэве —*
*ахоплены тлом,*
*гарыць — дагарае апошнім*
*святлом.*
*І хутка на дол разам*
*з іншымі ляжа.*
*Панура вятрыска яму так*
*і кажа.*
*І чуе, як ліст яму шэпча ў адказ:*
*«…хай кропелькай сонца*
*згублюся ў траве —*
*мне ў памяці жыць,*
*пакуль дрэва жыве».*

Яго літаратурная слава яшчэ наперадзе — сказана пра Васіля Гадульку ў калектыўным зборніку серыі "Беларуская паэзія XX стагоддзя" (выд. «Мастацкая літаратура», 2008). Сам зборнік — гэта крок да далейшага «ўваскрашэння» В.Гадулькі (як і М.Купрэева, А.Сыса, І.Рубіна, В.Стрыжака) праз ягоную творчасць і памяць аб ім. Удзельнікі літаратурнай сустрэчы выказалі спадзеў і гатоўнасць ахвяраваць пасільныя сродкі, тыя самыя «народныя» грошы, на галоўную кнігу таленавітага земляка, у якой было б змешчана ўсё, або амаль усё, ім напісанае, балазе дасюль яшчэ ёсць што шукаць у паэтавых архівах. Надзея таксама на мясцовую ўладу, тым болей, што яна ўжо насустрач. Сёлета Жабінкаўскі райвыканкам прыняў рашэнне надаць адной з новых вуліц у раённым цэнтры імя Васіля Гадулькі…

ВЕРШЫ

# СВЯТАЯ ПАРА

Іван АРАБЕЙКА

***

*Жывуць жукі, жуюць жукі*
*Ў Пажэжыне, у Жоры.*
*Жуюць, аж жах, як жабракі,*
*Інжыр, жамерыны, ражкі,*
*Жывіцу з жэрдзя, піражкі,*
*Зляжалы жвір і жарсцвякі,*
*Жэньшэнь жаруць абжоры.*
*З іржой жалеза, ланцужкі*
*Нажамі рэжуць удаўжкі.*
*Для жаб жукі не дружбакі,*
*Бо жлукцяць жур ружовы*
*І з лужын, і з зажоры.*
*Абжорства, кажуць, — крыж цяжкі.*
*Ляжаць на ложках, як бажкі:*
*Заможна і ў мажоры.*



## Сінічка

*Мароз. Завеі адгулі.*
*Сумёт на плот мядзведзем лезе,*
*І заінелыя вуллі*
*Па чэрава стаяць у снезе.*

*Упарты гэткі стукаток,*
*Нібы работа йдзе якая, —*
*Сінічка гэта б'е ў ляток,*
*Пчол на спажыву выклікае.*
*Тут праўда мо ў яе свая,*
*Ды ў кожнага — сваё прызванне.*
*Сінічка, кінь: там — рай, сям'я.*
*Канчай, дурнічка, партызаніць.*

***

*Гісторыю штудзіруючы ўпарта,*
*У рэшце рэшт — адно, што я скумекаў:*
*Ад Каіна — Батыі, Банапарты,*
*Ад Авеля — Францыскі і Дамейкі.*

## У вянок класіку

*Між многіх форм літаратуры*
*Мне наймілей мініяцюры.*
*Паклон сардэчны Вам, Брыль Янка,*
*За жменю сонечных брыльянтаў.*

## Міколу Пракаповічу

*Скажу не вельмі сакавіта:*
*Я — за кароценькія тосты.*
*У мёртвых — літары на плітах,*
*А у Міколы — на літоўцы.*

## Аляксею Філатаву

*Каб быў бы лепшым белы свет,*
*А ў душах — мір і свята,*
*Нягодных правіць Філарэт,*
*А графаманаў-недарэк,*
*Вядомых, класікаў — Філатаў.*

## Алесю Каско

*Ёсць тры паэты — ўсе на «К» —*
*Купала, Колас, Куляшоў.*
*Ды бракавала ім Каска, —*
*І вось Алесь прыйшоў.*

АПОВЕД

# ЖОРСТКАСЦЬ ЛЁСУ

Анатоль САНАЦЕНКА



**Тацццяна Іванаўна думала, што яе жорстка абдурылі. Падмянілі яе, Тацццяны Іванаўны, жыццё чужым. Бо ёй жа калісьці было абяцана іншае: выдатнае, яркае, казачнае… Напрыклад так: клапатлівы муж, паслухмяныя дзеці, дастатак, балы, прыёмы… Або так: замежжа (хай будзе Францыя), буцікі, дыяменты, кафешантан… А на самай справе — сціплае існаванне правінцыйнай настаўніцы рускай мовы, муж аб'еўся груш, дзяцей няма, і ні грошай, ні баляў, ні буцікаў. Тацццяна Іванаўна была не згодная. Прабачце, вы што мне ў дзяцінстве абяцалі? Дзе гэта ўсё? Вярніце маё, а забярыце ваша! Але дзесьці там, у вышэйшых, не зграджаліся. Што, маўляў, ёсць у асартыменце, тое і бярыце. Іншага не маецца. Як жа так? Бязладдзе! Дайце кнігу скаргаў!..**

І Тацццяна Іванаўна скардзілася — сяброўкам, маме, якая ўсё разумела, мудраму, але маўклівому кату, які па-філасофску вуркатаў на падушцы, свайму адлюстраванню ў люстэрку... Але лёс, відаць, так хацеў, лёс рабіў сваю справу, не звяртаючы ніякай увагі на ейныя скаргі і слёзы. І так — дзень за днём, год — за годам... Цямрэча!

Калісьці ў дзяцінстве, намаляўшы сабе жыццё феерычнае, жыццё дзіўнае — з прынцам, з ружамі, з белай сукенкай з батыста, — Тацццяна Іванаўна спаквяля і сама паверыла ў яго. Ну, калі ёй усё бачыцца так выразна і ярка, значыць, гэта не фантазія, не выдумка, а самая што ні на ёсць рэальнасць. Насамрэч, у Папялушкі ж атрымалася. Чаму не можа атрымацца ў яе? Таму — задзярэм планку вышэй, зробім адзнаку на такой вышыні, каб ніхто не мог дацягнуцца. Ніхто — з гэтай сумнай, гідкай, нявартай яе, Тацццяны Іванаўны, рэчаіснасці. Акрамя прынца, зразумела.

І ніхто не дацягваўся. Маўляў, і не трэба.

Між тым час ішоў, нічога не змянялася. А Тацццяна Іванаўна, зразумела, не маладзела. Як гаворыцца, дзе 25, там і 30. Ва ўсіх ужо даўно сем'і, дзеці, сямейныя клопаты. Тацццяна Іванаўна ж працягвала пільнаваць у сваёй адзнакі: раптам знойдзецца такі лёгкаатлет, які возьме гэтую вышыню? Не знаходзіўся.

— Млін, — думала Тацццяна Іванаўна, дыпламаваны філолаг.

Не, у яе, вядома, былі прыхільнікі. Аднаму з іх (крыжуючы ў душы пальцы) яна нават абяцала стаць законнай жонкай. Пад уплывам акалічнасцяў і бацькоў справа зайшла далёка — да падачы заявы. Але — у самы апошні момант — яна збегла, не з'явілася ў Палац, дзе чакаў яе не прынц, а так, інжынер нейкага НДІ. «Добрую справу людзі «бракам» не назавуць», — тлумачыла яна потым сяброўкам. Сяброўкі згодна ківалі, але думалі па-іншаму.

Была ў гасцях, пазнаёмілася з мясцовым паэтам. Нібыта нічога асаблівага: пацёртыя джынсы, застарэлы світарок, нос, вушы, вочы — усё, як у людзей. Але ж — паэт!

Папілі чаю, пагаварылі аб творчасці Блока. Божа мой, — родная душа! Але — не паказваць выгляду. Трымацца...

Пачаліся адносіны: платанічныя, ідэальныя.

Паэт, як і ўсе, натхніўся спачатку яе прыгажосцю — прыгажосцю спячай прынцэсы — падышоў бліжэй, каб разгледзець лепей, паскакаў трохі разам з іншымі, імкнучыся дацягнуцца да планкі, зразумеў, што не, не яго гэтая справа, хацеў ужо адваліць, але Тацццяна Іванаўна не пусціла. Усёткі ўзнёслая істота. Рэдкая. Хоць і не прынц. Ды і гады, ведаеце, ідуць, трэба вызначацца, будаваць сваё гняздзечка. Як гаворыцца, у птушкі ёсць гняздо, у звера ёсць нара...

І яна ўважыла, пусціла яго ў свой Палац. «Прынцэса мая», — захоплена шаптаў паэт, націскаючы на яе далікатную скуру сваім двухдзённым шчаціннем. Тацццяна Іванаўна была нібыта шчаслівая. Распісаліся.

Аказалася, што ў побыце паэт — нязносны. Надоўга сыходзіць у сябе, блукае па кватэры як самнамбул. Шмат курыць, маўчыць і не звяртае аніякай увагі на прыгажосць Тацццяны Іванаўны. А гэта ўжо сур'ёзнае злачынства.

Тацццяна Іванаўна злавалася.

Асабліва яе ятрыла звычка паэта замыкацца — з нататнікам і ручкай — у туалеце. «Набокаў, калі жыў у Берліне, таксама ў клазеце свае аповеды пісаў», — тлумачыў ён. «Але ж ты не ў Берліне, — уядала Тацццяна Іванаўна. — І не Набокаў», — дадавала яна пра сябе, ціха злараднічаючы.

Былі за паэтам яшчэ і іншыя жахлівыя грахі. Так, напрыклад, любіў ён падоўгу сядзець у ваннай, ядучы яблыкі. Наконт яблыкаў у яго таксама было апраўданне: прыводзіў прыклад нейкай ангельскай пісьменніцы (ці пісьменніка?), — Тацццяна Іванаўна ўжо не слухала, стаміўшыся ад усёй гэтай недасканаласці. Калі ж, мыючыся на хуткую руку, паэт



Малюнак Роберта Дэзбурга

прымаў душ, то спяваў рознымі галасамі. Арыі! Гэта таксама злавала.

А то прычапілася на яго дзівацтва — гаварыць пра Чэхава. Ледзь што: а вось Чэхаў, а вось у Чэхава... Замучыў зусім. «Ты, мусіць, таксама лічыш сябе вялікім пісьменнікам?» — пытала Тацццяна Іванаўна, міргаючы часцей звычайнага. І было незразумела, ці то здзекуецца яна, ці то шчыра кажа. Паэт, на ўсякі выпадак, крыўдзіўся.

Але самым непрыемным была яго звычка ў добрым настроі перад тым, як сесці за пісьмовы стол, паразмінаць свае паэтычныя пэндзлі. «Нятленка прэ», — тлумачыў ён — і, задаволены, храбусцеў пальцамі. Жах!

«Не пой, красавица, при мне...» — гундосіў ён праз паўгадзіны ёй у вуха, нечакана з'яўляючыся за спіной і хапаючы за стан, у той час, як яна пераварочвала катлету на скваргатлівай патэльні. «Прашу цябе, адыдзі», — раздражнёна казала Тацццяна Іванаўна, соўгаючы назад локцямі. «Не, радасць мая, ты паслухай, які верш я напісаў», — захоплена казаў паэт, ужо становячыся ў паставу дэкламатара.

### Телефон

*Ты выйдешь в полночь.*
*Мрак беззвездный*
*Тебя обступит, поведет.*
*И разум тебе скажет: «Поздно»,*
*Но чувство вспять не повернет.*

*И ты пройдешь сквозь эти арки*
*Чудовищ — ящеров — домов,*
*Моля о том, чтоб только Парки*
*Не различили звук шагов;*

*Чтоб только был дарован случай*
*Своей судьбы запутать нить,*
*Еще побыть, еще помучить*
*Себя желаньем страстным —*
*жить!..*

*Как воплощенье протестантства,*
*На черной площади стоишь.*
*Ты это страшное пространство*
*Не перейдешь — перебежишь.*

*А там блеснет неярким светом,*
*Пронзив спокойствие руки,*
*Тот телефон настенный, это*
*Ты шел к нему сквозь мрак тоски.*

*И заставляя диск вращаться*
*Вокруг оси, вокруг оси,*
*Не только маленькое счастье —*
*Шесть чувств ты в дань преподнеси.*

*Оплату принимает Зуммер,*
*Сребролюбивый, как Харон, —*
*И всех, кто жил, и всех, кто умер,*
*Найдет загробный телефон.*

«Ну як?» — з надзеяй пытаў ён. Тацццяна Іванаўна маўчала. Ёй ужо было ўсё роўна. Жыццё не атрымалася.

Пры такім жыцці ў яе сур'ёзна знізілася самаацэнка, сапсаваўся настрой. Даймалі частыя дэпрэсіі, якія накатвалі хвалямі і ад якіх ратавала толькі адно — шопінг. Але каб прайсціся па крамах, патрэбныя, ведаеце, сродкі. Сродкаў жа не было: у школе плацілі мала, яшчэ менш зарабляў паэт, які перабіваўся разавымі выпадковымі заробкамі ў мясцовых газетах. «Усё, патрапіла. Гэта канец, — халаднеючы, разумела Тацццяна Іванаўна. — Гэта навекі — пражыванне ў чужым жыцці, з чужымі людзьмі, з нялюбым, нязносным чалавекам...— Тацццяне Іванаўне хацелася манерна, як у чорна-белым кіно, паднесці руку да ілба, працягнуць: «Ах, пакіньце мяне, мне нічога ад вас не трэба, і наогул, гэта не маё жыццё...», але яна разумела, што такі жэст марны — няма чаго і для каго.

А паэт усё спадзяваўся, усё матляўся. Хутка, маўляў, хутка наступіць мой час. У іх горадзе ў яго была пэўная вядомасць. На творчых вечарах, якія зладжвалі ў школах і бібліятэках, жанчыны глядзелі на яго з захапленнем. Тацццяну Іванаўну гэта абурала. Што вы глядзіце так, што вы глядзіце, вы ж не ведаеце: у побыце ён — пачвара! Ён спявае ў ваннай, ён храбусціць пальцамі, ён гаворыць пра Чэхава, ён, ён, ён... Але жанчыны не чулі ўнутранага крыку Тацццяны Іванаўны і станавіліся ў чаргу па аўтографы.

Паэта не друкавалі. Ён штораз адпраўляў напісанае ўсё ў новыя і новыя часопісы. Адказаў не было. У лепшым выпадку паведамлялі: "Не падыходзіць". «Баяцца канкурэнцыі, — тлумачыў ён. — Самі ж даўно пісаць развучыліся...»

На 99-й адпраўцы ён зламаўся, упаў у дэпрэсію. Запіў, вядома. Потым стаў услых размаўляць з Пушкіным, сварыцца з Лермантавым. Балела печань, падстраўнікавая... Адвезлі ў лякарню. «Панкрэатыт. Востры», — казалі лекары. Выпісалі далечвацца дадому. Ён ужо не спяваў арыі, не храбусцеў натхнёна пальцамі. Толькі ляжаў ці хадзіў з кута ў кут. Так і дахадзіўся да шырокага інфаркта. Потым быў другі — не менш шырокі. І паэта ўрачыста знеслі за горад, на сельскі могільнік, вельмі паэтычнага выгляду.

Мінула дваццаць гадоў. Паэта забылі. Нібы і не было. Тацццяна Іванаўна, адчуваючы сябе ўжо ўдавой-каралевай, так і не разабрала яго архіў. А навошта? Для каго? На самай справе...

Аднойчы ў іх горад прыехаў сталічны дацэнт, кандыдат навук (чорны шыракаполы капялюш на філалагічнай галаве, доўгае скуранoе паліто таго ж колеру, кій з бронзавай булавешкай — любоў да антыкварыяту і дапамога пашкоджанай на веласіпедным шпацыры назе). Дацэнт збіраў матэрыялы для доктарскай. Ён і растлумачыў Тацццяне Іванаўне, што паэт з'яўляецца спадчыннікам па прамой Срэбнага века. Так сказаць, пляменнікам Хадасевіча, унукам, калі хочаце, Гумілёва. Не пабаімся гэтага слова: апошнім класікам XX стагоддзя! «З геніяльнымі сучаснікамі заўсёды так, — элегантна запальваючы з дазволу Тацццяны Іванаўны цыгарэту, элегантна адстаўляючы руку з нетутэйшай, імпартнай папяросай убок, казаў ён спагадлівым тонам. — Здаецца, можна стварыць нешта больш таленавітае, чым яны, не шануеш іх. Але праходзіць час, і разумееш: не, нельга; гэта — вяршыня».

Слухаючы словы, якія вымаўляюцца аксамітным барытонам дацэнта, Тацццяна Іванаўна была шчаслівая: яе мара збылася, ёй вярнулі яе жыццё, здавалася б, назаўсёды згубленае. Заўтра трэба б з'ездзіць за горад, на разрослы за гэтыя гады могільнік — паправіць стужку на ўжо мемарыяльным вянку.

Пераклад з расійскай

ВЕРШЫ

# ЧАРГОВАЕ ЛЕТА

Аксана ДАНІЛЬЧЫК


Фота prajdzisvet.org

***

*Раптоўна спыніцца.
Упасці на траву ў бабуліным садзе.
Закінуць рукі на лоб
(бабуліна звычка).
Каб нічога не засталося,
толькі жніўеньскае неба і спякота.
Нічога-нічога.
Толькі ўважлівы позірк
скіраваны да аблокаў,
быццам за імі можна разгледзець
райскую браму
і святога Пятра з распрасцёртымі
абдымкамі.
Толькі разгубленасць
ад несупадзення таго,
што я чакала, з тым, што адбывалася.
Толькі-толькі.*

*І вось калі сапраўды не засталося
больш нічога,
а сэрца здалося пустым какосавым арэхам,
на мае пальцы села вялікая страказа —
дзіцячая мара,
тая самая, што ніколі не давалася
мне ў рукі.
Памятаеш верш
пра яе слюдзяныя крыльцы?
Дык глядзі цяпер праз іх
на бясхмарныя нябёсы
і не думай,
сёння зараз тут і цяпер
не думай,
дазволь сабе такую раскошу — не думаць.*

*Бо ў гэты самы момант
нехта іншы думае пра цябе.*

*І гэта — адказ.*

***

*Хто сказаў «маўчанне»?
Сапраўднае золата — слова.
Вось я і раблюся ашчадней.*

## Архіў

*Рэльефы падэшваў на мяккім асфальце
перадвячэрнім часам нагадваюць
аб тых, хто прайшоў па горадзе,
запоўненым невядомымі пахамі
відавочна іншаземнага паходжання.
Ты не пазнаеш болей гораду —
о, гэтыя бясконцыя змены!
Цікава, а ці пазнаю я цябе?
Мае вены, што з кожным годам
робяцца ўсё больш заўважнымі,
запаўняюцца сонечнай плазмай,
якая паступова выцясняе кроў.
Я гартаю рукапісы, што так доўга маўчалі,
у спадзяванні даць ім голас,
а пасля ступаю ў чарговае лета,
і мой след застаецца на мяккім асфальце.*

***

*уяўляеш
яны ніколі не прачытаюць Ніцшэ
навошта ім ведаць пра гарады
якія даводзяць да вар'яцтва
навошта ім ведаць пра тое
што звар'яцець
гэта значыць абараніцца*

*уяўляеш
яны ніколі не прачытаюць Павэзэ
навошта ім ведаць пра тое
чые вочы мае смерць
навошта ім ведаць
як памёр
той хто паспрабаваў
але не змог*

*уяўляеш
яны ніколі не спыняцца каля дома
дзе жыў Прыма Леві
навошта ім ведаць пра тое
хто патануў а хто ўратаваўся
навошта ім ведаць пра тое
дзе канчаецца чалавечнасць*

*навошта ім увогуле нешта ведаць*

*уяўляеш
такіх як яны — большасць*

***

*аднойчы я падумала што мы ніколі больш не пабачымся
і на старонках памяці твой вобраз не будзе пазначаны
мне стала сумна ад такой незваротнасці
і я падумала што сітуацыя даволі
гаротная
а пасля я падумала а што калі б раптам
у нейкую сонную раніцу
каханкі мае вярнуліся са сваімі незагойнымі ці загоенымі ранамі
і сталі б стукаць у дзверы і распавядаць
пра мінулае
і нешта згадваць галасамі прачулымі
а пад вокнамі коні б іржалі і чакала
карэта з вазніцаю
тая самая ў якой далёка не з'едзеш
а можна канчаткова спыніцца
то я напэўна б кінула ўсё і госпадзе
напрамілы
пабегла б куды падалей і магчыма нават
з бутэлькай тэкілы
і разглядаючы голкі смарагдавых кактусаў
на фоне ненатуральна сіняга неба
распавядала б што ў некаторых выпадках
«ніколі» ёсць самай трывалай глебай
ёсць самым найправільным выйсцем
найдасканалым збавеннем
белым колерам без аніякіх адценняў*

## Роздум над вершамі

*На вялікі жаль,
я даўно ўжо не п'ю —
ні ранкам, ні вечарам.
Відаць, мой арганізм
вычарпаў усе свае рэсурсныя магчымасці.
Я нават не заўважыла,
як кінула паліць.
Затое ў нядзелю,
калі ўсе яшчэ спяць,
я выслізгваю з ложка,
заварваю каву
(гэта я пакуль што магу сабе дазволіць),
і з кубачкам кавы
чытаю вершы Букоўскі.
Усе яшчэ спяць,
а я думаю
пра іншае вымярэнне чалавечага жыцця.*

*Адпаведнае сабе самому, ці што?*

*Яшчэ я спрабую ўявіць
заход сонца з бутэлькай і цыгарай
і пустыню, а за ёю горныя хрыбты.
«Ок», думаю я, не ўсё так страшна,
галоўнае бачыць перспектыву.*

*І бясконцасць,
у якую рухаецца статак дзікіх скакуноў.*

***

*пустымі сонечнымі вуліцамі
дзе няма ніводнай жывой душы
дзе толькі дворнік змятае з прыступак
сонечны пыл
а драўляныя лаўкі пахнуць свежаю фарбай
іду не я*

*там доўгія крохкія цені абуджаных
дрэваў
перацякаюць з аднаго боку вуліцы
на другі
і робяцца мастамі для нябачных радасцяў*

*і тэлефон згубіла не я
гэта мужчыны страцілі свае галасы
і схаваліся ў срэбныя скарбонкі нібыта
ў панцыр*

*засталася адна толькі музыка*

*музыка што яскравай стужкай-хвастом
уздымаецца за паветраным шарам
і разам з ім адлятае за далягляд*

*я жыву ў далонях гэтага імгнення
бо скончыліся дні і скончыліся ночы*

*і нават калі мне мільёны гадоў і ўва мне
мільёны гарадоў
знаёмых да апошняй драбніцы
і зусім невядомых
і нават калі каханне яшчэ не прычына
каб адмовіцца ад саміх сябе
хоць адсутнасць кахання яшчэ
не прычына
каб адмовіцца ад саміх сябе
хоць нішто не прычына
людзі ўсё роўна працягваюць сябе забіваць*

*а калі ўсё ж такі надыходзіць раніца
то такая раніца як міласэрнасць*

*дзе шукаць твой водар
іланг-іланг*

***

*раскладаючы словы на літары
структуру на яе кампаненты
да якой адсутнасці можна дайсці
блакітнай ружовай
а можа залатой*

*кветка гарбаты
раскрыецца ў кіпені
і калыхаючыся ў вадзе
праспявае песню
быццам птушка на церні*

*функцыянаванне свету залежыць
выключна ад гэтай песні
гэтаксама як і ад крылляў матыля
бо ўсё астатняе
толькі словы*



АПАВЯДАННІ

# ВАЙНА З ДЗЬ МУХАЎЦАМІ

Павал КАСЬЦЮКЕВІЧ



## Зборная Беларусі па негалоўных відах спорту

Сёння — лапта, заўтра — кёрлінг. Там, у алімпійскім камітэце, палічылі, што трэніровачныя базы і спартоўцы па ўсіх відах — немэтазгодна. Крыкет, пола, даміно, гарадкі. Так, шчырая праўда: для начальнікаў краіны месца на п’едэстале — не раўнуючы пераможны бліцкрыг супраць Малдовы, аднак як мудра пастанавіў камітэт, для ўсіх гэтых нязначных відаў адной каманды — у самы раз.

Мы — зборная Рэспублікі Беларусь па негалоўных відах спорту. Адна каманда, адзін трэнер, адна халера: кракет ці чукбол. Выязная спортбрыгада. 20–25 плячыстых на жывот і касцістых на язык барбудас, з фіналам еўрабачання замест эякуляцыі, гаражным сэксам з «аўдзюшкай» замест выходных. Спартовыя рознарабочыя, мы ніколі не ведаем, што будзе сёння.

— Тэк, зборнічкі, разабралі па клюшцы і аквалангу — і марш у аўтобус: сёння на Цнянцы чэмпіянат свету па падводным хакеі.

— А канькі?

— Начорта?

— Ну, дык хакей усё ж…

— Так, канькі… Дай гляну… Неа, у правілах канькоў няма: даеш нырца з чыгуннай клюшкай і закідаеш алюмініевую шайбу (Госпадзе, хто гэткія гульні прыдумляе?!) у плывучую браму...

— Лёнчык плаваць не ўмее.

— Заўтра ён будзе збіты і пазбыты заробку невядомым мужчынам перадпенсійных гадоў у чорнай масцы і трэніках нацыянальных колераў.

— Лёнчык па паскораным курсе ўжо навучыўся… А па гэтым, падводным, мы якое месца ў сусветным рэйтынгу?

— Якая вам розніца? 154-ае. Галоўнае, хлопцы, я тут глянуў, выйсці з падгрупы: разбамбіць абсалютных хакейных аматараў — сахарцаў. Зацяць дыхалку — але адужаць нічыйку з крэпкім сярэднячком Ватыканам. А гранды — кубінцы — лічы, у нашай торбе: тыдзень таму іх першы склад «негалоўкі» разам з клюшкамі, шайбамі і плывучымі брамамі — для балласту — па дне акіяна ў Фларыду рвануў. З імі можна змагацца: памятаеце, мы аж чатыры галы ім забілі, калі гулялі ў баскетбол. Усё, до трындоліць — марш у аўтобус!

Гэта Францавіч. Два гады да пенсіі. Галоўны трэнер зборнай Беларусі па негалоўных відах спорту. Калісь масажор у моладзевай зборнай па сапраўдным хакеі. Што ў яго ад мінулага — дык гэта памасажаваць цябе па рэбрах і хрыбціне, а потым спрытна накласці шыну з клюшак і ўмела патэлефанаваць у «хуткую». Што ад будучыні — дык нашае ўсё.

— Сёння, хлопцы, не дамо пудла: усё ж спаборніцтва па нашым нацыянальным відзе спорту…

— Скокі з шэстам праз балота? Спартовае жабраванне?

— Акадэмічны перагон іншамарак. Першынство Еўропы. Суперфінал: мы і літоўцы. Кожнаму выдаецца па сто еўра і стратэгічная мапа Нямеччыны.

—Па сто?

—Убазарылі, па пяцьдзясят.

— Лёнчык кіраваць не ўмее.

— Хай прыгоніць матацыкл для майго ўнука. Толькі не «мінскач». «Мінскач» з Нямеччыны — не па-спартоўму. А па дарозе ўдарыце па прыўкрасных польскіх гарадках.

— Па польскіх гарадках? І «шэнгенку» дадуць? Супер, Лёнчык кажа, што ўжо ўзяў экстранныя курсы па кіраванні.

— Цудоўна, але Лёнчык зараз са здзіўленнем высветліць, што польскія гарадкі — гэта такі спорт. На чэмпіянаце свету вы там сярод галоўных прэтэндэнтаў. Бо адзіныя ўдзельнікі. Палякі ўвогуле адмовіліся гуляць у гэта, хоць самі тыя гарадкі і вынайшлі. Польскія гарадкі — вельмі займальны від спорту: у ім нешта ад чараў гарызантальнага скалалазання і троху — ад прывабаў унітазакідання. Вам дастаткова толькі прыбыць у Гродна, які адзіны ва ўсім свеце не адмовіўся праводзіць гэтае спартовае мерапрыемства, і проста атрымаць там кубак. І, дарэчы, трафей застаецца ў вас навечна, бо стваральнікі гульні парываліся пераплавіць той кубак на алюмініевыя чушкі і закапаць у зямлю. Іх урад ужо вылучыў два мільёны злотых на сціранне гэтага віду спорту з калектыўнай памяці і гістарычных крыніцаў. Сённяшнім капітанам зборнай прызначаю Лёнчыка — у яго апошні працоўны дзень.

Увечары мы, чэмпіёны свету па польскіх гарадках, ачумелыя ад двайной змены, у рыгалаўцы на ўскрайку Горадні святкуем праводзіны Лёнчыка:

— Лёнчык, дык што за новая праца?

— Хлопцы, я цяпер легіянер.

— Клас: зайздросцім, але шчыра. Куды, у прафесіянальны?

— Не, двайніком да Бэн Ладэна. Усё як мае быць: поўны сацыяльны пакет, дваццаць восем дзён адпачынку на год, медстрахоўка і бясплатныя масты і каронкі.

— Лёня, якія масты, якія каронкі?! Там пасля аднаго працадня будзеш рэбры жалезнымі скобамі змацоўваць!

— Не трэба Лёнчыка мець за ідыёта — у кантракце ўсё прапісана: ніякай ваеншчыны. Бэна я замяняю толькі на парадах-нарадах, ну, максімум — на негалоўных тэлезваротах з пагрозамі чалавецтву.

Дарэчы, пра чалавецтва: яго ашчасцілі дзвюма зборнымі Беларусі па негалоўных відах спорту. Першая зборная — для гульняў на выездзе. Гатэлі, еўрасутачныя і агні вялікіх гарадоў. Мы не яна.




Мы зборная Беларусі па негалоўных відах спорту для хатніх гульняў. Стылая дзвюхпакаёўка разам з ці то жонкай, ці то цешчай, з якой суткі за двое, і агні канфоркі.

— Патрабуецца дзевяць цягавітых беларусаў для фіналу еўралігі па класічных баданнях з танкам.

— Францавіч, не губі!

— Спакуха, хлопцы. Як там у паэзіі: «Беларусу — чалавеку і трактару»? Запыт перанакіравалі на МТЗ — хай чухаюць патыліцу яны. Але цяпер смехі набок: у Гішпаніі — чэмпіянат свету па бою быкоў, ад нашай краіны трэба два тарэадоры.

— Я не магу — у мяне месячныя.

— Хлопцы, не выдурняйцеся, тут жа галоўнае не перамога, а ўдзел. Чыста для птушачкі: пастаялі трохі на арэне, папрыручалі быка. А я за гэта зверху падчас паездкі дазволю не трымацца спартовага рэжыму: гішпанскае чарніла за мой кошт. Толькі перад карыдай просьба на грудзі не браць, а то будзе, як у мінулы раз, калі зборная Украіны праходзіла ўсю карыду на рагах. Дык што, хто едзе?

— Я не магу: у мяне, гэта, прабабуля пры смерці, на Чыжоўскіх могілках ляжыць.

— Паўтараю: Гішпанія — два чалавекі, давозка чалавека туды і транспарціроўка цела назад за кошт дзяржавы. Валік, ты як?

— Мяне няма.

— Паўтараю, падлы: Гішпанія — два труп… чалавекі — усё ўключана!

— Францавіч, у нас жа ёсць «замежка»...

— Зборная Беларусі па негалоўных відах для выязных гульняў не зможа паехаць у Гішпанію: яны ў Штатах у французскім рэстаране атруціліся кальмарным соусам на кубку свету па спартыўным шопінгу.

— Курвы!

— Хто сказаў «курвы»? Сашуня і Генік? Выдатна — нецэнзуршчына прыраўноўваецца да паднятай рукі. Значыць, вы абодва — марш у гішпанскае консульства па візы, астатнія — збіраемся ў Раўбічы: заўтра — адкрыццё чэмпіянату Еўразіі па скачках з трампліна на вярблюдзе. Паказальны выступ.

— Слухай, Францавіч, як жа гэта магчыма — скочыць з трампліна на вярблюдзе?

— Ну, а як жа гэта можа быць немагчымым? Спярша вярблюда крыху прыструніў, ага, так, спусціўся да самага трампліна, раўнавагу трымаеш, нервы — у кулаку, і так сабе няспешна, далікатна, раўнамерна, па-нашаму бачком так трохі, крок-скок — і паляцеў…

— Францавіч, ты монстр!

***

Як нараджаецца галоўны герой? І ўвогуле — ці магчымы такі зорка-суперстар, новы-незацяганы, непракручаны праз мясарубку стагоддзя ХХ і вір яго напалмавых вечарынак? Наўрад. Тут жа патрэбны чалавечышча, чыя прага выжыць была б маштабнейшая за чэмпіянат Галактыкі па лыжных гонках на асфальце. Тут трэба звяруга, якога падчас выпрабаванняў торкае не менш за фіналіста спаборніцтваў па сумо на сланах. Які здолеў узяць усё гэта і, нахрэн перакуліўшы, здзейсніць першую беларускую рэвалюцыю. Тут і цяпер.

І вось, бачце: у шатні для тарэадораў два члены «негалоўкі», гэтыя нашыя эрзэшныя прэтэндэнты ў героі — Генік і Сашуня, за дзесяць хвілінаў да свайго гладыятарскага выхаду. А праўдападобней ужо адзін Генік, бо сапраўдны герой нараджаецца адно на самоце, так што Сашуня неяк выкруціўся і застаўся ўдома…

Дык вось — Генік цяпер у шатні, дзе шафкі-слупкі як гарызантальны груз-200 з трупамі ўсіх гэтых няўдах, якія былі да апошняга свайго бою перакананыя, што нарадзіліся з богавай барадой у правіцы, і па-дзіцячы верылі, што адораныя найвышэйшым блатам, які ёсць на небе, хай свяціцца імя яго. І перабывае наш прэтэндэнт у паўпрытомным стане пасярод паху змытай хлоркай крыві, няясна: людской ці бычынай — гэтак, на самоце, пакінуты паразважаць, што за гульня такая — гэтая карыда, і як з яе выкараскацца. Бо што б вам ні казалі настаўнікі ў школе камікадзэ, ацалеласць — адзіная неабходная ўмова для існавання ўсіх сапраўдных герояў. І яшчэ ў дадатак наш прэтэндэнт прыгадвае, што ўсе тарэадоры, нават мёртвыя, былі прыроджанымі гішпанцамі і нюхалі бычыную мачу з дзетсаду. А ён жа, Генік Качуня — дзіцця балотаў і прапіскі: што ўвогуле ён можа цяміць у бай быкоў?

Або не, ведаеце, не. Ён не ў шатні. Ступакі Геніка, прэтэндэнта ў супермэны, ужо парушылі роўнядзь пяску тарэадорскай арэны, а наўкола, злепленае ў адзін няўежны камяк, — палатно з пустых глядацкіх твараў. Перад Генікам — бык. За чырванаватай таніроўкай бычыных вачэй — капітанская рубка з нелюдзем, пазбаўленым літасці і мазгоў. Вось тут, сярод персанальнага халакосту і поўнага капца, як сцвярджаецца, і павінен нарадзіцца сапраўдны герой..

Ці ніхера не павінны, бо той Генік — гэта я! О, Божа, які кашмар! Ааааа!

Арэна, бык, я. Адчуваю, што жыцця маю секунд сем–восем. Яшчэ трохі — і шал гідкай плеўкай залепіць вочы. Зацыклены ў суцяшальную паўтаралку: «Мама-што-я-тут-раблю-мама?». Пацею як снегавік у фрытурніцы.

І вось на 3.54 секунды свайго васьмісекунднага існавання, за колькі імгненняў да смерцяноснага рыўка, ЯГО рыўка на МЯНЕ, даю крок уперад і ніцма валюся перад быком у глухой паганскай малітве. Залаты цялок, садом і гамора — што заўгодна, абы жыць! А па калашынах бяжыць хваля гарачыні.

І тут бляск бычынага вока робіцца бялейшы. Гэта ўжо не крывавы Марс — гэта нязыркая бліскаўка Альдэбаран, мяшанка срэбра і ртуці, бель праўдзівага золата, уадначассе лагодны і сляпучы гузік. І дыхавічны голас:

— Ну, што, Вадаліў, напусціў ужо ў порткі?..

Бачу — пашча быка ненатуральна, але старанна растульваецца і сашчапляецца, вымаўляючы людскія словы. Ён дадае:

— Нашто ж так перайма́цца? Нашто, Вадаліве, твае турботы і неспакой, твая крыўда і слёзы? Ты што, не ведаеш, смаркач, што літаральна ўсе мы зроблены з зор?

Я скручваю галаў і бачу, што мая левая рука неяк так без болю адлучаецца ад пляча і імкліва ляціць у неба. Шматкроць расце і шпарка аддаляецца ўадначассе. Разумею, што ніколі яе больш не пабачу, нават калі буду брысці па яе ў патрэбным кірунку ўсё жыццё. Правая рука таксама адлятаецца, але крыху пад іншым вуглом. І

тудысама — у зорнае бязмежжа. Потым чарга ног — яны, узнятыя ўгору, бязгучна стартуюць наўздым, не раўнуючы «Васток-1» і «Васток-2». Тым жа часам тая самая прыгоданалучыла і быка: вясёлы выбух неўсцеражонай шампані — і яго цела крышыцца, дзеліцца на вялікія шматкі, што разлятаюцца ўгору шчаслівым каляровым фаерверкам…

Хто я цяпер? Гэта цяжка сказаць. Ці чалавек я? Ой, пэўна не. Мае канцавіны гэтак шалёна няблізка адна ад адной, а паміж імі — зорная бездань на мільярды светлавых эпох. Так, мае ногі, рукі і цела — зоркі. Няўежнае згусце матэрыі, тоны галактычнага пылу, урану, крэмню, марганцу ды іншай касмічнай дрэні. Не, дакладна: чалавекам тут не пахне.

А бык тутсама, у небе. Але цяпер у нас з ім няма варожы, няма больш забойцы, няма ахвяры. І ў прынцыпе, мы адзін аднаму — ніхто. Маўклівыя згуртаванні зорак, якім у роўнай меры займае мову перад манархавым аблічам касмічнай моўчы. Сузор'е Быка і сузор'е Вадалiва.

Дык я, значыцца, ёсць сузор'ем?

Сузор'ем?! Тым вымысленым задзіночаннем сонцаў, якое існуе толькі ў выяўленні чалавека і складаецца з нічым не звязаных у рэчаісным свеце нябесных цел?.. Чорт яго ведае…

Я ёсць, але мяне не існуе. І гэтак я — абсалютна вымысленая сутнасць — кручуся, лунаю, гушкаюся, ці як там называецца дзеянне, якое я раблю ў гэтай бясконцай прасторы, дзе імгненне за год. А пада мною, сярод выдмаў і барханаў Зямлі, загрузаючы па калена ў пяску, аблізваючы губы ад саракагадовага гарадзенскага перапою, брыдзе вядомая ваўкалакам Францавічам зборная Беларусі па негалоўных відах спорту.

Першынство на прызы Майсея па спартыўным арыентаванні ў сінайскай пустэльні.

## Вайна з дзьмухаўцамі

З'езд беларусістаў свету адбываўся сярод лабірынтаў і містэрыяў менскага харэаграфічнага каледжа. Ішлі замежныя прафесары, знаўцы трох падзелаў Рэчы Паспалітай, з партфелямі і ноўтбукамі, крочылі шаноўныя спецыялісткі па паўстанні 1863 года, з фрызурамі і педыкюрам. Падчас іх шэсця бясконцымі калідорамі траплялісі ім бязгучныя дзяўчынкі-здані ў пуантах і пухкіх белых спаднічках. Гадаванкі каледжа абдорвалі кожнага навукоўца глыбокім кніксэнам. Лебядзіныя шыйкі як на загад згіналіся ў пашанотным нахіле, а ў вялікіх, на ўсю сцэнку, люстэрках дрыгацелі іх сарамлівыя пасмешкі.

На ўрачыстым адкрыцці з'езду гадаванкі паказалі нумар «Сувораўскі вальс», прычым суворaўцы былі сапраўдныя — падлеткі, апранутыя ў чорную, як смоль, форму. Выявілася: некалькі курсантаў наведвае тут гурток бальнага танцу. На адкрыцці выступіла таксама дырэктарка каледжа: па-дзявочы худзенькая былая прыма-балерына. На правах гаспадыні, запінаючыся (як бы прыслухоўвалася да ўнутранага метранома), дырэктарка сказала: «Вітаем вас, і раз і два, мы радыя бачыць вас на нашым з'ездзе беларусі-сі-стаў, і раз і два, працайце пладатворна».

Мы разышліся па класах каледжа — звычайных школьных класах. Наша габрэйская секцыя мела абмеркаваць менскае гета і Марка Шагала.

І раптам:

— Вайна, вайна!

Гэта нема раве дзяўчынка-асістэнтка: паружавела неяк нездароўча, і, здаецца, вось-вось бразнецца ў паўпрытоме.

Усё прыходзіць у рух: балерынкі бязважка перабіраюць белымі ножкамі — прафесійна гойсаюць па фае, як па сцэне, дырэктарка харэаграфічнага каледжа заціскае ў абдоймах скіпелы самавар, замежныя прафесары, знаўцы трох падзелаў Рэчы Паспалітай, ашаломлена садзяцца проста на падлогу, спецыялісткі па паўстанні 1863 года ўзбуджана паскоквваюць да столі. Вайна, якая шчэ вайна?! Каму мы трэба?

Нібы спраўджваючы ліхую вестку, па небе грымотна шугае рэактыўны вынішчальнік.

«Зараз будзе зварот кіраўніка дзяржавы», — гучыць праз дзверы класа чыйсьці голас.

Уключаем тэлевізар. На экране столькі гадоў бачаны намі твар, да якога — чаго хаваць — мы збольшага адчувалі непрыязнасць, аднак цяпер, у святле апошніх навінаў, ён нават крыху парадней ды набыў рысы: напоўніўся зморшчынкамі, адметнымі пагоркамі і ямінкамі. Мала не бацькоўскія цяпер вочы выпраменьваюць зычлівасць, і мілыя цяпер губы вымаўляюць: «Браты і сёстры! Нам капец...».

Дыспазіцыя: на нашу краіну навалiліся орды дзьмухаўцоў. Ой-вэй, хто б мог думаць: жоўта-белыя, аксамітна-пухнатыя паскуднікі топчуць дол тваёй краіны. Ратунку няма ані. Дзьмухаўцы займаюць тэрыторыю, працякаючы праз асфальт, каласяцца на кожным найменшым лапіку, лезуць напралом. Мільярды палёвых шчупальцаў, што шалёна прагнуць аднаго — людскіх сэрцаў. Не вытруціш. Спрабавалі скасіць — жоўтая атрута з націння пырскае, выядае вочы і мозг касцоў, а на месцы панішчаных кветак вокамгненна расквітае ўтрая большая колькасць звышновых сонцаў.

***Дзяўчынка, дзяўчынка, дзьмухаўцы знайшлі нашу краіну і цяпер шукаюць наш горад.***

Горадні і Пружанаў ужо няма — патанулі ў дзьмухаўцовай навале, жоўтым моры; хіба на балотах Палесся і Віцебшчыны справы ў ворага ідуць марудней. Спрабавалі супрацьстаяць? А як жа! Тактыка выпаленай зямлі плёну не дала. Зямлі — вунь яе колькі, паліва ж — непараўнальна менш. Стратэгія вытаптанай зямлі нават не разглядаецца, паколькі ўсе, хто мог таптаць, зашыліся ў дамы: з вышыні сваіх схованішчаў назіраюць за павольным захопам тэрыторыі. Бо інструкцыя па выжыванні гучыць адназначна: барані вас Божа, куме, высунуцца за парог, адзін крок па зямлі умомант дасць вам зразумець, што вы труп. Зжарэць, накрыець сваімі драпежнымі хваламі бязлітаснае мора дзьмухаўцоў.

Міністр абароны з усім сваім штабам здаўся ворагу пры першай сутычцы, галава Нацбанку на «тушцы» з цэльназалатога каркаса зляцеў у Вену. У сталіцы бардак і здрада. І кветнік. Праўда, пакуль не такі дасканалы, як пра тое мроілі ў сваіх эратычных снах камунальнікі-маньякі — але, як зазначаюць яны цяпер у сваім прынагодным звароце з блага прыхаванай радасцю, кветнік той «ужо самы вялікі ў Еўропе».

Як са здзіўленнем высвятляецца, кіраўнік краіны застаўся тут, разам з намі: «Дзе народ, — цяжка дыхаючы, быццам пасля выканання мужавых абавязкаў, кажа ён, — там і яго павадыр».

Хто ж мог падумаць, што Беларусь, родную зямліцу, трэба было забетанаваць? Усю, да апошняга ўзгорачка мілага поля: багны, курганы, лясы? Зафігачыць месівам па самыя вушы. Шчыльненька ўтрамбаваць дол ля кажнюткага камля, пáлі і маставой апоры. Хто ж мог здагадацца, што трэба было нанова ўвесці інстытут піянераў-герояў? Гойсалі б сабе сюд-туд за ідэю, каб нічога-нідзе-ніякага, аніводнай жывой шчылінкі, ані найменшага шанца расліне-мутанту. А як што якое — дык «102» і самалётавертaлёты ўтопяць увесь раён трайным слоем шэрага паратунку.

З якога боку прыйдзе апакаліпсіс? Прызнáюся, палова з нас грашыла на ўсходнюю суседку: «Гэтыя?! Гэтыя могуць і хочуць — захопнікі, імперыя, навалач». А цяпер бачыш — наадварот: скідаюць з самалётаў пачкі з гуманітарнымі пельменямі: «Трымайцеся, браткі-беларусы!». Другая палова з нас думала на заходнікаў: «Гэтыя могуць, хоць і не хочуць». Але цяпер бач — перапраўлені пры дапамозе рачнога флоту чалавек 700 нашых на вялікую зямлю. Да канца судаходнага сезона дэкларуюць перавезці яшчэ дзве тысячы.

Трэцяя наша палова, складзеная з паловы першай нашай паловы і з паловы другой нашай паловы, адным словам, з тых нашых людзей, што заўсёды маюць думку ў кішэні, намалявала была ў сваіх галовах карціны гнюсотнай змовы паміж паўночнымі і паўднёнымі суседзямі. Пры гэтым, прычытаючы, тая наша частка наракала: «Хочуць, халера на іх, хочуць — хоць і не могуць». Цяпер высвятляецца: паўночныя і паўдзённыя не толькі не могуць, але і ні ў якую. Карацей, шчыра ім пляваць, свайго хапае.

Яшчэ адна наша палова, ужо чацьвёртая, чакала канца, які смаляне згары, што заакеанскі Госпад абрыне на нас за грахі серку і агонь з неба. Цяпер ясна — памыляліся таксама. Хто ж мог падумаць, што вораг прыйдзе знізу і што ён зусім не будзе мець душы?

Як неразважна і неразумна ўсё, жыццё гэтае… І як жа недарэчна звініць каледжны званок: «Адзін саракахвілінны занятак па страху і чаканню смерці вы прабавілі, перапынак».

***Дзяўчынка, дзяўчынка, дзьмухаўцы знайшлі наш горад, цяпер шукаюць нашу вуліцу.***

Верталётны полк з Мачулішчаў ратуецца толькі тым, што ніколі не прызямляецца. На цэнтральных плошчах нашых гарадоў захопнікі развялі вогнішчы і паляць кнігі Рэя Брэдберы, а на гарадскіх могілках урачыста хаваюць гербары. Кажуць, у цэнтральны магілёўскі тэлефір выйшаў іх галоўнакамандуючы. Што сказаў? Ніхто не зразумеў: калі ўсе пабеглі ўключаць тэлевізар, ён ужо пырскаўся ў экран сокам развітальных банальнасцяў. Нешта пра тое, што дзьмухаўцы таксама зямляне — і нават шчэ большыя за людзей.

За што яны менавіта нас? Пытанне ў саменькае вока, але адказу няма ні ў смузе стагоддзяў, ні ў аглядным мінулым. Ніхера няясна. Ні-хе-ра. Вуліца Прытыцкага спусцела, спустошылася, толькі чуваць, як да нас нясцерпна крадзецца ціша.

***Дзяўчынка, дзяўчынка, дзьмухаўцы знайшлі нашу вуліцу, цяпер шукаюць наш дом.***

Сядзім з надкусанымі лакцямі. Як жа мірна ўсё пачыналася: веснавы двор, бязмежная савецкае дзяцінства і кармёжка з нажа. З цягам часу мы з гэтым усім неяк так паабвыкліся, паабжыліся. Потым нават злаўчыліся і ўхапілі Бога за бараду, і вось цяпер на пачэснай пасадзе гаспадароў жыцця ўжо самі прызначалі прыёмныя гадзіны для іншых насельнікаў вальера. Нас папярэджвалі: як нарадзіліся, то ўсе аднязначна і паўміраеце, але ні слова пра тое, што праміж будзе гэтак пагана. Які запавет пакінуць унукам? «Не стой, унуча, пад стралой»? І што тут успомніш цяпер, калі пад вокнамі ўжо жаўцее смерцяносны палетак?

А распрацоўкі былі. Футурыстычныя, фантастычныя. Яшчэ ў 70-ых. Нейкі геній-адзінотнік, просты санітар хуткай дапамогі з Маладзечна, распрацаваў інжынерны план узнясення БССР на неба. Жыць і гадаваць бульбу ды гуркі на лятучых тэрасах са шкла і бетону, нараджацца, жаніцца і засаджваць турнэпсам паветраныя аранжарэі. Яшчэ тады праектнаму воку маладзечанскага празорцы адкрылася Паднябесная Беларусь: адарвацца ад зямлі, не слухаць ейнага покліку, стацца свабоднымі. А ўжо ў вольную часіну, у адных прадззінфікаваных сланцах і плаўках разам з вечаровай прахаладай спускацца на планету, старую нашу порхаўку, і заміраць у шэзлонгу сярод мройнай цішы яе пустэльняў. Начапляць артапедычныя акуляры з сятчастымі шкельцамі і, закусіўшы свежавырванай рэдзькай-дзічкай, лежачы, слухаць выдмы.

Варта прызнаць, дзьмухаўцовыя карані Ліха вымагалі іншай тактыкі ды іншай зброі. Падземных войскаў (ПЗВ), атамных ліхтарыкаў і дыяментавых рыдлёвак. А ля ног падземнікаў на ланцугах вызвярaюцца адмыслова навучаныя, запырсканыя белай пенай краты-аўчаркі. Але нічога не здзейснена — усё так і засталося на гэтай бездапаможнай паперы. Але, па шчырасці, што тут паробіш? Па вадзе яшчэ сяк-так крочыць можна, вось паспрабуй ісці праз зямлю.

***Дзяўчынка, дзяўчынка, дзьмухаўцы знайшлі наш дом, цяпер шукаюць наш паверх.***

— Габрэйская секцыя, вы як?

— Трымаемся. А вы, нямецкая секцыя, што?

— Нармалёва.

— Як там вугорцы маюцца?

— Хто-хто?

— Венгры.

— Та нармуль.

— Гут.

— Гут.

У клас заходзіць дырэктарка харэаграфічнага каледжа.

— Так, яўрэйская секцыя, перапіс наяўных сілаў… Хто з вас мае вайсковы досвед?

— Я быў ухілістам у ізраільскім войску, сядзеў два месяцы ў гарнізоннай турме.

— Лена, выдай ухілісту ТТ — цяпер начальнікам яўрэйскай секцыі будзе ён… Як вас?

— Павал… то бок, Саўл.

— Усім членам секцыі загадваю — слухайце Саўла — ён ваш камандзір. Лена, раздай яўрэйскай секцыі па «калашы».

— Адкуль яны ў вас, дырэктаркі харэаграфічнага каледжа?

— Камандзір Саўл, не задавайце дурных недарэчных пытанняў.

Потым яшчэ выдаюць энзэ — бляшанку свіной тушаніны з надпісам: «Кашэрна, з дазволу галоўнага рабіна ўсяя Беларусі, рэбе Менскага і Бабруйскага, Сруля Кузлачыка». Але я ўжо маўчу. Сруль Кузлачык — гэта галава.

Сядзім, паеўшы, у нягеглых хлапечых абдоймах трымаем «калашы». Чакаем дзьмухаўцовай навалы. Прыгадваю аднаго паўзнаёмага маляра, які не любіў зялёнага колеру. Чуючы, што нехта хоча пафарбаваць фасад або плот у зялёны, дужа злаваўся: «Замала вам зялёнага: лясы, трава?! Колькі, вацъ машу, можна памнажаць тугу?».

— Я не хачу паміраць, я такі малады і таленавіты, у мяне студэнты, навуковы працэс без мяне не пойдзе! — раптам крык. Пазнаём голас прафесара, знаўцы слуцкіх паясоў Цімаці Шнайдэра.

— Зможа, не бойся, — цэдзіць у адказ знаўца беларускай літаратуры, прафесар Арнольд Макмілер.

— Нашто я пайшоў да беларусістаў?.. Мяне ж запрашалі на з'езд паланістаў ў Літавэл і літуаністаў ў Палангу…

— Будзь мужыком, вазьмі «калаш» у рукі, — злавесна шэпча знаўца белліту.

— Але ў нас іншая зброя — М-16, надзейная вінтоўка амерыканскай пяхоты… Я хачу М-16!..

— Няма тут М-16, што тут незразумела?! Вось арэхавы прыкла́д, вось баёк, наладаваў, націснуў курок, наладаваў зноў. І калі трэба, пампрэш, сабака, за беларускую літаратуру.

—There is nothing to die for!

—You told me!

На вэрхал, круцячы пагрозлівым вокам Сарумана (двума) завітвае дырэктарка харэаграфічнага каледжа:

— Чаго, яўрэйская секцыя, усхадзіліся?!

— Таварыш вярхоўны камандзір, ну, мы тут… дзелімся ўражаннямі… Бо што тут яшчэ рабіць?

— Маліцца!

Я дурэю, колькі ў Вольфа ўсялякіх яўрэйскіх штучак, юдэйскага сувенірнага барахла: менора-адкрывалка, Сцяна Плачу-запальнічка, бюст Ягвэ, і вось калі ласка — бел-чырвона-белая ярмолка. І, значыцца, Вольф, і атэіст я, і аўтар ідыш-беларускага слоўніка Алесь Астравух, які ўвогуле хрысціянін, пачынаем малітоўны напеў. І «Шма Ісраэль», малітва, якая ў мінулым ужо не выратавала не адну тысячу чалавек, зноў лунае на манер заспакаяльнай мантры: «шма ісраэль гаспод наш бог, гаспод адзін ёсць,

***дзяўчынка, дзяўчынка, дзьмухаўцы знайшлі наш паверх, цяпер шукаюць наш пакой…»***

Дырэктарка харэаграфічнага каледжа няспешна, з веданнем справы, выцягвае з-пад пазухі імянны агнямёт…

СУМЕЖЖА

# ПЭЎНАЯ ПОЎНАСЦЬ

## (У ПОШУКАХ ВЫХАДУ ДА МОРА)

Больш як тысячагадовы Гданьск шануе памяць пра герояў Вестэрпляцэ, сярод якіх былі і нашыя суайчыннікі. Гэты горад — своеасаблівая сталіца «Салідарнасці». Сёння ён — цэнтр гарадской агламерацыі Труймяста (з Гдыняй і Сопатам), дзе часта праводзяцца беларускія імпрэзы. У Гданьску існуе генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь, з 1992 года — беларускае культурна-асветнае таварыства «Хатка».

Варта адзначыць, што з амаль паўмільённага насельніцтва горада выгукваюцца жыхары з беларускімі эрытрацытамі (мэр Павел Адамовіч і інш.) Ужо друкаваліся ў дадатку «Літаратурная Беларусь» вершы Эвы Панізнік у маіх перакладах з польскай мовы. Згадвалася, што бацькі Эвы пераехалі ў Польшчу з Мёрскага раёна (Віцебшчына) у 1957 годзе.

Пачаўся прыём заяў для навучання ў Гданьскім Беларускім ліцэі. Каля 80 вучняў стануць новымі сябрамі Гданьска.

Акрамя Эвы Панізнік я знайшоў яшчэ аднаго творцу, які хоча «прытуліцца» да беларускага слова. Войцэх Борас нарадзіўся 10 красавіка 1973 года ў Гданьску. Быў стваральнікам Паэтычнай ініцыятывы «альманах», вядучым літаратурнай перадачы на радыё «Эска Норд». З 2009 года ўзначальвае аддзел паэзіі ў часопісе «Бліза», супрацоўнічае з часопісам «Аўтограф». Друкуецца ў розных прэстыжных анталогіях. Выдаў зборнікі вершаў "Горны нерэаліт" (1997), «Яснае і Поўнае» (2003), «Кепскія намеры» (2008). Яго тэксты перакладзены на нямецкую, чэшскую, англійскую мовы. І сённяшняя публікацыя папаўняе яго глабалізацыйны рэестр. Тым самым ставіць новыя пункціры ў нашых пошуках выхаду да мора.

**Сяргей Панізьнік**



# ЛЮДЗІ І ПРАЎДА

**Войцэх БОРАС**

### Пан Борас прыкідваецца эрудытам аглядаючы звабныя лыткі

*Панове Бадлер і Пасядла*
*крэмзалі пра катоў*
*напэўна!*
*лашчымся — калі маем ахвоту*
*ямо мышэй без разбору*
*можна нас улагодзіць шыкоўнай шынкай*
*пасля чаго — з пажадаю ачмурыць*
*мурлыкаем ля кабетак*
*водзім пыскай па смочках*
*прыгравaючы у прытворстве*
*а ў сне прыдушваем як Дэздэмонаў*

*з ненасыці вяртаемся*
*заўжды на чатырох лапках*
*і несучы скурчаны агонь цынічны*
*дамагаемся каб дзень такі*
*абзываць Вялікім*

**7.4.1998**

### Рукапіс

*Штольня задумаў і боязі*
*найглыбейшая ўначы*
*сапсутая клавіятура для стварэння ілжы*
*спускае дух*

*такая пустэча толькі на Заспе*
*пасля імшы рымскага папы*
*нібыта з усіх пачуццяў*
*згрудзіўся счарнелы скрыль*

**18.3.1999**

### * * *

*Леху Ландэцкаму*

*Ліхтары тут у памерклым бляску*
*косці пакідаюць надта доўгія цені*
*бетон зарастае змрочнасцю*
*у распятым праpэху прасторы*
*мроіцца людзі і Праўда*
*сябар вымае сваё пасведчанне*
*я тлумачу — Анна гэта і ёсць Марыя*

*шаленцы — вольна зубацім словы*
*дзякуючы каторым няма айчыны*
*ёсць толькі тыя што языком мянташым*
*даўкія метады бутэлек*
*халоднае чаўканне хімераў*
*скрыжаваныя карсеты гольфаў*
*з роздумам пазначаем тэрыторыю*
*пенсіянер Бог асвістаае нас —*
*не хочам вяртацца*

**7.02.2001**

### Кольца і крыжык

*Срэбны крыжык на шыі акрайчык*
*цярпення*
*які мне мама Марыяна не хацела купляць*
*каб няшчасце не пераходзіла з матчыных рук*

*Залаты Крыж Заслугі партовaму*
*зваршчыку*
*для майго бацькі Яна*
*са шчарбінкамі ў эзяні чырвонай эмалі*

*павучок крыжыка на кійку*
*набожнай пілігрымкі*
*між арэляў пранесены*
*дэманічны пострах пяцігадовых дзяўчынак*
*святы алей міра*
*на руках арцыбіскупа ад маладых клерыкаў*

*пад прамым вуглом скрыжаванні вуліц*
*дзе бачна пэўнасць ад зыркіх свяцільняў*
*там спыняюцца людзі з верaю ў Прышэсце*

*крыж партызанскі за чытанне вершаў*
*у правінцыйных дамах культуры*

*боль у крыжы ад менструацыі*
*знаны толькі з легендаў ды хатніх*
*паданняў*

*у тэлевізіі перакрыжаваны*
*агонь пытанняў Монікі Алейнік*

*28 печашнае — павольнае прытупленне*
*у кожнай крыжаванцы можна штосьці*
*выйграць*

*хо ту — крычыць Юльця*
*цягне мяне за палец*
*обі обі (значыць — адчыні)*
*адкрываю Стары Сшытак з шыфрам*
*Малявака Пісака*
*бяжыць уло з маёй рукі*
*з нявіннай усмешкай малюе*
*ко ко*

**19.04.2002**

### The Doors

*Маю шрамы на сэрцы,*
*і іх ухарошваю смуткам.*
*Не выстаўляю рогі ў супярэчных*
*абставінах.*
*Крэслю і крыўды. Так мяне ўзгадвалі,*
*каб запамінаў Цукерачку.*
*І гэта адзіны Шлях.*

*Памятай — і Ты не адсюль.*
*А пуцявіна, закладзеная праз мяне,*
*ніколі не будзе простай.*

**1.04.2008**

### Накцюрн

*Дажджлівая ноч прымушае заціцца*
*Каб зноў абудзіцца ў тым жа закутку*
*з целам, якое пазнаць немагчыма:*
*выслізвае з рук на змакрэлых прыступках.*
*Адчай намякае, каб з ім расквітацца.*

*Яшчэ ноч дажджоў — і не страшны патоп.*

**10.06.2010**

**Пераклаў з польскай мовы**
**Сяргей Панізьнік**



ФРАГМЕНТЫ

# ЛЕПШ БЫЦЬ МЁРТВЫМ, ЧЫМ ВІЗАНТЫЙЦАМ

Пра што кніга «Лепш быць мёртвым, чым візантыйцам»? У ёй я паспрабаваў адказаць на пытанні, як уладкавана нашая візантыйская цывілізацыя, як уладкавана заходняя, чаму заходняя квітнее, а нашая відавочна вымірае. Даў і свой варыянт адказу на старое пытанне: як жа нам жыць далей? Вельмі проста: станавіцца часткай Захаду, таму што альтэрнатывы заходняй цывілізацыі няма — яна хрысціянская. Калі вы спытаеце: а якая ж тады цывілізацыя візантыйская? Адкажу: варварская…

Чалавека, падобнага нашаму, спараджае цывілізацыя варварская. У выніку ён да поту працуе, але пладоў працы не бачыць, ён хоча любіць, але выбудоўвае адносіны так, што пажыване нянавісць, ён хацеў бы сябраваць з суседзямі, але ідзе на іх з сякерай ці бутэлькай.

За ўсё трэба плаціць, ці не праўда? Русь стала ахвярай сваёй геаграфічнай велічы. Бо русічу заўсёды было прасцей уцякаць ад свайго начальства на ўсход, чым выбудоўваць з цэнтрам (іншымі русічамі) адносіны на базе Пісання. А вось еўрапейцам, абмежаваным натуральнымі межамі, бегчы было няма куды, таму ім даводзілася займацца ўдасканаленнем сваіх сацыяльных адносінаў. У выніку Русь стала велізарнай, не прыстасаванай да жыцця і зусім варварскай дзяржавай; дзяржавы Заходняй Еўропы засталіся карлікавымі, але гарады іх цяпер вылізаныя, сацыяльны клімат спрыяльны, а духоўны складнік цалкам хрысціянскі.

Пакуль поўныя расійскія нетры, з голаду Расія не памрэ. Але як выжываць Беларусі, якая не мае магчымасці паразітаваць на распродажы рэсурсаў?

Беларусь не здолее выжыць з псіхалогіяй сабакі на сене. Беларусам трэба навучыцца звышпрадукцыйна, як шведы і фіны, працаваць. Дзеля гэтага на пачатку ёй давядзецца грунтоўна разабрацца ў тым, што ж уяўляе з сябе навакольны свет, што такое Усход, што такое Захад? І зрабіць правільны выбар свайго далейшага цывілізацыйнага шляху.

**Аўтар**



**Ігар ТУМАШ**

…Я сядзеў на снезе каля сцяны Чырвонага касцёла, падцягнуўшы калені да падбароддзя і трымаючы ледзяную снежку на пабітым пераноссі. (Так ужо атрымалася, што не ля рэстарана, не ля біяпрыбіральні. Пад сцяной культавага будынка, перапрошваю, сядзеў.) Увогуле, вынесла мяне спецназам да касцёла, нібы пластыкавую бутэльку хваляю. Ну і прыціснула да касцёльнай сцяны. Магло і размазаць. Не выбіраў я месца адмыслова, для большага пафасу...

Кроў з носу ўжо не хвастала, але нязручнасці ўсё яшчэ прычыняла. Трэба прызнаць, што спецназ нездарма еў тушонку, набытую за мае ў тым ліку падаткі — бо заўсёды скрупулёзна да капейкі плацію. Як гэта спрытна спецназавец мяне — палкай па носе, а! Што і казаць, беларускі Рэмба, падумаў я, змяняючы снежку на пераноссі, цалкам без усякай злосці, бо настрой быў пераможны і радасны: мы — перамаглі!

Крывавыя сцэны, сведкай якіх я стаў, увялі мяне ў стан шоку. Зрок, слых… абвастрыліся да нейкай звярынай ступені. Было адчуванне, быццам удзельнічаю ў батальнай масоўцы нейкіх кіназдымак. Змяшаліся ў кучу коні, людзі… Удар па носе вярнуў адчуванне рэальнасці. Цяпер апішу сцэну, дзеля якой варта пайсці на Плац.

Перада мною апынулася пажылая, добра за шэсцьдзясят, нізенькая жанчына. З высокім сцягам у руках. Гэтакая тыповая менская пенсіянерка-хатняя гаспадыня, кандыдат у майстры па праглядзе тэлесерыялаў, майстар па піражках, зямны анёл-ахоўнік уласных унукаў. Яна стала перад шэрагам спецназа. І — відавочна не збіралася сыходзіць.

Сцяг у руках лунае. Акуляры на носе з таўшчэзнымі «сляпымі» шкельцамі. На сэрцы, напэўна, сляды ішэмічнай хваробы, рубцы ад інфарктаў, фанатычная любоў да ўнукаў і… атрымліваецца, любоў да дэмакратыі?! Здайся, вораг, замры і ляж! Мы табе піражкоў, гэта самае, не дамо! Нават не прасі, вырадак!

— Дзякуй, Гасподзь, за такіх людзей! — Умею любавацца прыгажосцю чалавечых жэстаў і знаю ў іх толк. Як вернік, ведаю, Каго ўганараваць за гэтыя жэсты хвалой. Таму часта ўспамінаю гэтую жанчыну.

Пляц наогул стаў для мяне ў плане жэстаў сучасным Кландайкам. Ведаеце, калі бачыш, як адзін чалавек захінае сабою іншага, калі збіты крычыць пырскамі крыві: «Жыве Беларусь»… Гэта прыгажосць, якая дае сілу жыць далей у лайне самадзяржаўя. І спадзявацца.

Я зразумеў, што і спецназ гэтую жанчыну, нібы слуп, не абміне… За сцяг заплоціць яна дарагі кошт. Я схапіў жанчыну за рукаў і выцягнуў з небяспечнай зоны.

Праз нейкі час з гэтай жанчынай зноў перасёкся. Побач з касцёлам усталяваная арка з «чарнобыльскім званом». За маёю спіной хтосьці стаў званіць. Азірнуўся — у ролі званара выступіла сцяганоска! Ратуеш яе, разумееш, для ўнукаў… Нязўрымслівая! Звон гучаў набатна. Дон-дон-дон — разлівалася па ўсім Пляцы, ствараючы атмасферу гістарычнай трагедыі…

Паклон усім беларускім жанчынам, якія выйшлі на Пляц.

Пад касцёлам адседжваўся я, мусіць, хвілін сорак. Пакуль кроў не сунялася. Сядзеў і атрымліваў асалоду ад бягучага моманта: а ўсё ж — перамаглі! Адчуванне перамогі было выразным, але ўступала ў дысананс з карцінай разгрому мітынгу спецслужбамі. Ды — глупства карціна, трэба глядзець у корань. Тамака перамога! Мы перамаглі ўласнае рабства — таму што выйшлі на Пляц, каб сказаць «не» ўчарашняму богу…

Я заўважыў нейкае ажыўленне ля кафэ «Сёмае неба». Нешта зноў наспявае? Падняўся, сцёр снегам кроў на куртцы і падаўся да групы маладых хлапцоў.

Яны абмяркоўвалі нейкі план, разабрацца ў якім я не паспеў. Бо на нас наляцела група спецназаўцаў. І адціснула ў кут паміж пляцам і праспектам. У выніку мяне і яшчэ некалькіх маладзёнаў літаральна ўбілі дубінкамі ў гасцініцу «Мінск».

Наогул жа спецназу мы сто гадоў не былі патрэбныя. Бо мэтанакіравана загаНялі яны ў гасцініцу групу замежных журналістаў, што апынулася побач з намі…

Спецназаўцы стаялі не толькі на выхадзе, але таксама «пасвілі» акно туалета на першым паверсе, і я змог выбрацца з гасцініцы толькі ў палове першай начы. Пастановачную валтузню перад Домам урада можна было здымаць з вокнаў гасцініцы, якія выходзяць на пляц. Можна было з даху. Калі б я быў акрэдытаваным журналістам… Але заходнія журналісты адмысловага гарэння не выяўлялі. Перагаворваліся: ну калі ж у гэтай краіне пройдуць нармальныя выбары?

Раніцай перш за ўсё ўлучыў скрыню — дзяржаўны канал. Бо адбыўся чарговы пераварот, што будуць казаць?.. Белае звалі чорным, чорнае белым і пухнатым… Абаранілі яны. Што абаранілі? Ні завошта не здагадацца. «Выбар народа» абаранілі! Вось што… На пляц Незалежнасці памкнулася некалькі сотняў п'яных маладых людзей, якія ўчынілі пагром… Падбухторшчыкі (ага, кандыдаты ў прэзідэнты) ізаляваныя. Вядзецца следства.

Вядома, утрырую. Але мне было так добра душой на Пляцы, што тут у выніку звароту ў звыклае мёртвае душэўнае асяроддзе — стала дрэнна. Можа, вядома, гэта і стрэс мяне дагнаў. Але я не хацеў вяртацца ў час «да Пляца»! Катэгарычна не захацеў!

Я дастаў з антрэсоляў цяжкі аксамітны савецкі сцяг з вышытымі гербам, Леніным і з жоўтымі махрамі. З 92 года захоўваў, мяркуючы выхваляцца ім перад унукамі або падарыць, прадаць замежнікам. Купіў за савецкія яшчэ грошы перад тым, як памяняліся на «зайцаў». За 180 аж рублёў — месячную зарплату. Папершае, усё роўна грошы гарэлі і маглі знікнуць, з прылаўкаў змяталі ўсё. Па-другое, я думаў, што сцяг стане рарытэтам, музейнай рэліквіяй.

Ну няўжо мог хто-небудзь выказаць здагадку, што на вяршыні ўлады людзі стануць аднолькава ненавісны, пагарджаны ўсімі Савок. Што будуць праштурхоўваць рэабілітацыю найгалоўнейшага ў сусветнай гісторыі чалавеканенавісніка Сталіна! Што пачнуць апраўдваць рэпрэсіі 50 мільёнаў людзей! (Што ў рэабілітараў замест сэрца?) Што адновяць культ пагарджанага самадзяржаўя. Што, выкарыстоўваючы натуральную цягу людзей да Неба, падсунуць ім «духоўны абкам» РПЦ. Нарэшце, што гэтыя людзі будуць рэканструяваць самадзяржаўны лад і прымяраць кароны ў XXI стагоддзі.

І я стаў рваць сцяг на часткі. Ані не састарэлы на антрэсолях аксаміт паддаваўся з цяжкасцю. Падумаў, што будзь я палітыкам, то зазняў бы сцэну на відэа. Але я дзёр сцяг не на публіку, дзёр для сябе, на сабе, у сабе. Не будзе, не будзе па-вашаму, мармытаў я. Майго вяртання — не будзе! Не дачакаецеся!

А яшчэ я падумаў, што ў сталінскі час мяне б без лішніх разглядаў паставілі да сценкі.

— Лепш быць мёртвым, чым візантыйцам, — прашаптаў я. Чаму?

Што для мяне Візантыя, візантызм?

Па-першае, гэта сакралізацыя любой, хай нават самай нікчэмнай, вярхоўнай улады. Савецкія кіраўнікі, Ленін і Сталін былі багамі? Імператар Мікалай быў богам? Нашым Бацькам можа быць толькі Ісус Хрыстос! Усё! Астатнія — прыйшоў-сыйшоў, называецца. Падзяка, калі ласка. Але — аніякіх каронаў!

Па-другое, гэта падладжванне ўсяго жыцця грамадства, усіх яе інстытутаў пад пэўную сакралізацыю. У выніку — вядома ж, перакос: усе інстытуты пакутуюць, усе прыгнечаныя і дэфармаваныя.

Ну а якія інстытуты мае грамадства? №1 — гэта інстытут шлюбу. Таму што, як справядліва адзначыў класік марксізму-ленінізму, сям'я — гэта ячэйка грамадства. Грамадства, нібы вулей з сотаў, складаецца з ячэек. Такім чынам, здароўе інстытута шлюбу ёсць здароўе грамадства, ці не праўда? Паталогія візантыйскага шлюбу ёсць для нас нечым натуральным. Здрады, прыгнёт, рабства, гвалт…

Інстытут міжасобасных адносінаў ідзе следам. Бо мы не толькі з жонкамі сваімі маем зносіны. Аб стане здароўя гэтага інстытута красамоўна сведчыць той факт, што практычна кожны арыштаваны ў гады вялікага тэрору 1930-х даваў паказанні на людзей з кола сваіх знаёмых. Сяброўства — святое пачуццё? Мы не ведаем, што такое сяброўства.

Не варта забываць пра інстытут сацыяльных адносінаў. Сакралізацыя ўлады цягне за сабой такія адносіны паміж сацыяльнымі класамі, што ўзнікаюць перадумовы для здзяйснення рэвалюцыі накшталт той, што была ў кастрычніку 1917-га. Цяпер грамадства падзелена на два класы: на клас чыноўнікаў і бізнэсмэнаў дыктатара і на клас прыгнечаных. Прыналежнасць да любога з класаў душу ж відавочна не акультурвае. Ужо ці не лепш быць мёртвым? (У тым жа духу бачацца і ўсе астатнія грамадскія інстытуты. І ў кожным над уваходам — партрэт у залатой рамачцы.)

Сакралізацыя вярхоўнай улады патрабуе апоры на нейкі духоўны аўтарытэт. Неабходная духоўная структура ствараецца штучна. У нас гэта — праваслаўе і бальшавізм. (Да прыкладу, у канфуцыянскай Паўночнай Карэі гэта чучхэ і камунізм.) Калі глядзець праўдзе ў вочы, то варта сапраўды прызнаць, што частка РПЦ Маскоўскага патрыярхата з'явілася ідэалагічнай мыліцай самадзяржаўя і духоўным жандарам насельніцтва імперыі. Таму… ну ізноў жа атрымліваецца, што лепш быць мёртвым, чым дзіцем гэтай сумнiўнай духоўнай структуры. Словам, куды не кінь, усюды клін...

А чалавек жа створаны па Божым узоры і падабенству і надзелены Яго субстанцыяй — душой. Таму ён не мае права жыць так, нібы ён усяго толькі кавалак мяса і прыслуга цара зямнога. Чалавек народжаны выключна для тварэння Божых задумаў. Калі цары зямныя стануць пераключаць людзей на служэнне ім і заманунца прэтэндаваць на прызначанае Яму пакланенне… Цяжка сказаць, ці будзе ў чалавецтва XXII стагоддзе, але што XXI стане апошнім стагоддзем зямных дыктатараў — не выклікае ніякіх сумневаў.

▸ ПОСТАЦІ

# ВЯЛІКАЯ САТЫРА Ў ВЯЛІКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: КАНДРАТ КРАПІВА

Аляксей РАГУЛЯ

**Суверэнная Рэспубліка Беларусь з'яўляецца лепшым доказам жыццёвасці і мабілізуючай сілы нацыянальнага мастацтва, найперш беларускага мастацкага слова. Дзейнасная функцыя літаратуры ў справе вяртання соцыуму (гаспадарства) у стан суб'екта міжнароднага права сёння павінна быць важнейшым крытэрыем ацэнкі здабыткаў у культуры мінулых дзесяцігоддзяў.**



На сучасным этапе беларускае літаратуразнаўства паспяхова асвойвае метадалогію і тэхналогію гісторыка-кампаратывісцкага даследавання. Аднак канцэптуальны падыход усё ж пераважна канструюецца ў межах тыпалогіі жанравай формы і выяўленчых сродкаў. Гэтага мала. Існуе неабходнасць разглядаць сацыяльную значымасць (культурныя сэнсы) беларускага мастацкага слова ў кантэксце сумарнага вопыту філасофска-антрапалагічнага пазнання ў цэлым. <...>

Дзеячы беларускага адраджэння імкнуліся ў эпоху татальнага абясцэньвання ўзмацніць тыя сэнсавыя аспекты слоўнага вобраза, якія заснавальнікамі семіятычнага падыходу былі азначаны як інтэнсіянальныя і парадыгмальныя пласты зместу. Адначасова ў паэзіі акцэнт быў перанесены на аднаразавую самакаштоўнасць кожнай праявы характа. Формула Кузьмы Чорнага *«рэальная шматграннасць і філасофскае адзінства»* пасля тэарэтыка-публіцыстычных вопытаў Максіма Багдановіча стала абагульненнем і праграмай беларускага экзістэнцыяльнага вопыту ў першай палове XX ст. Гэты вопыт з'яўляецца надзейным рэсурсам у супрацьстаянні агрэсіўнаму квазіканцэптуалізму, які намагаецца сяк-так прыкрыць убогасць духу дэманстрацыяй свабоды паводзін у *«постфіласофскай дзейнасці»,* не існуючай у культурнай прасторы ўвогуле.

Кандрат Крапіва, як і Кузьма Чорны, шмат увагі ўдзяліў тэарэтычным пытанням літаратурнага працэсу. Пісьменніка больш за ўсё хваляваў стан смехавой культуры, якая ў хворым грамадстве выконвае функцыі сацыяльнага лекара. Анры Бергсан у рабоце «Смех» адзначыў, што ў камедыі *«прычына павінна быць у сярэдняй вобласці душы».* Гэтае выказванне арыгінальнага даследчыка творчай інтуіцыі не выклікае пярэчання, калі размова ідзе пра гумар. А што да тэорыі і практыкі сатыры ў беларускай літаратуры, то тут мае сілу іншая пазіцыя А. Бергсана: смешнае *«звяртаецца да чыстага розуму».* Талент Крапівы-сатырыка не ўкладваецца ў рамкі *«нечага сярэдняга, уласцівага чалавеку сярэдняга разбору».* Дарэчы будзе адзначыць, што ў сатыры «чысты розум» плённа ўзаемадзейнічае з архетыпным комплексам калектыўнага падсвядомага, з апрыёрным нацыянальным веданнем. У крапівазнаўстве не так даўно на гэтыя напластаванні культуратворчага вопыту ў сатыры звярнуў увагу Сцяпан Лаўшук, намаганнямі якога быў падрыхтаваны і здзейснены Збор твораў К. Крапівы (у 1997–2004 гг.). <...>

У тэорыі і ў мастацкай практыцы сатырыка К. Крапівы выразна бачыцца рух да спасціжэння эвалюцыйнай дынамікі быцця. Вырашэнне творчай задачы патрабавала ад пісьменніка новага спосабу тыпізацыі. Вышэйшае дасягненне сінтэзу ў сацыяльна-псіхалагічным (крытычным) рэалізме — абагульненне на ўзроўні сацыяльна-бытавых характараў ці нават тыпаў — у новым беларускім літаратурным працэсе было ўключана ў працэс фарміравання ўзбуйненых адзінак тыпізацыі: канцэптуальных персанажаў, канцэптуальных сітуацыяў і мастацкіх канцэптаў. Гэткім спосабам сінтэзу, у якім неаміфалагічнае ўзбуйненне спалучаецца з аналітычным неарацыяналізмам, сёння актыўна карыстаецца і філасофія. Гульня творчай фантазіі сатырыка адкрывае шлях да пазнання існіны, непрадугледжанай афіцыйнай ідэалогіяй рэвалюцыйнага прагрэсу. Рэвалюцыйныя перавароты, папярэджвае К. Крапіва, маюць два процілеглыя вектары. У рэальнай сітуацыі дваццатых гадоў пісьменнік убачыў пагрозу апынуцца ў прадонні, з якога шлях да чалавечага грамадства вымярацца мільёнамі гадоў усеагульнай эвалюцыі. Такім чынам, смехатэрапія К. Крапівы прадугледжвае абавязковую фазу пераадолення трагічнай паласы ў адраджэнскім руху. Праз усю драматургію К. Крапівы праходзіць трагічны персанаж — вобраз інтэлігента-адраджэнца. Шматлікія яго разнавіднасці М. Гарэцкі аб'яднаў фрэймам *задумныя.* У творах К.Крапівы задумныя паказаны ўжо на стадыі іх сацыяльнай самарэалізацыі, калі пакуты няшчаснай свядомасці на ростанях, здавалася, пераадолены ўжо назаўсёды і ў душы з'явілася *абвостраная цвёрдасць* і загартаваная воля да *непрамožнай дзейнасці.* Гэты працэс глыбока асэнсаваны ў псіхааналізе К. Чорнага.

Аднак жа К. Крапіва невыпадкова ў пачатку 20-х гадоў учыніў «перарэгістрацыю» ў казкавым і баечным беларускім бестыярыі. Былыя задумныя ў хуткім часе апынуліся ў атачэнні істот, натуры якіх больш адпавядае жыццё на ферме, чым у чалавечай грамадзе. Ужо неаднаразова даследчыкі вызначалі, што ў кіраўнічых кабінетах байкаў К. Крапівы дзейнічаюць не экзатычныя алегарычныя сланы і львы, а свойскія жывёлы: парсюкі, свінні Каравая, сабака Жук — скаціна сваёй гадоўлі. Сярод гэтага тыпажу апынуліся і шмат хто з нядаўніх задумных, энтузіястаў будаўніцтва сацыялістычнай Айчыны. Тут яны сутыкнуліся нечакана з непрадбачнымі калізіямі.

Мастацкая актуалізацыя нацыянальнага бестыярыю ў сатыры К. Крапівы была падрыхтоўкай пісьменніка да філасофскай інтэрпрэтацыі навейшай эпохі. Так пачынае развівацца сітуацыя татальнага спустошання, абсалютнага канца. Семантыка п'есы «Канец дружбы» (1933) сягае далёка за межы асабістых адносін Карнейчыка і Лютынскага. Былы настаўнік, а потым дзяржаўны дзеяч, Антон Лютынскі ў час раскулачвання і калектывізацыі, як і ў час грамадзянскай вайны, застаўся беларускім народным інтэлігентам, якога не змаглі зламаць ні ліквідатарская ідэалогія чырвонай бюракратыі, ні здрада сяброўству камуніста Карнейчыка (якога Лютынскі, рызыкуючы жыццём, уратаваў ад смерці), ні здрада жонкі. Застаючыся верным *мужыцкай праўдзе,* Лютынскі незашоранымі вачыма бачыць праўду, якую ўжо не могуць і не хочуць бачыць і ведаць не толькі апаратчыкі, але і рабочая маса. Пры гэтым Лютынскі застаецца шчырым і адкрытым заўсёды і ўсюды. Ён не можа нават і падумаць, што лепшая яго вучаніца публічна яму здрадзіць, што Карнейчык, каб выгадна вылучыцца сябе, стане дэмагогам. Па-рознаму былыя сябры адказваюць на пытанне, якое не дае спакою Лютынскаму: *«Скажы ты мне па шчырасці: табе не прыходзіла ў галаву такая думка: а што, калі мы не тое робім, што трэба?».* Лютынскі, *«беручы вышэй»,* убачыў ісціну ў яе аголеным выглядзе: улада будуе дзяржаву, у якой няма месца дружбе, шчырасці, узаемаразуменню, у якой пануе страх, а працаўнікі і сейбіты ніколі не будуць гаспадарамі сваёй нівы і павінны жыць у чаканні раскулачвання і высялення.

Па ўсім відаць, што К. Крапіва ў глыбіні душы цяжка перажываў расправу з наркомам Зм. Прышчэпавым, які стварыў сялянскія культурныя гаспадаркі, за што быў двойчы асуджаны і загінуў у ГУЛАГу. Сыход у небыццё першага і другога пакаленняў гаспадароў Лютынскіх у фінале згаданай п'есы прасякнуты пафасам высокага трагічнага перажывання, уласцівага класічнай трагедыі...

Сход у фінале фармальна як бы нагадвае хор у антычнай трагедыі. Толькі цяпер гэта хутчэй хор-навыварат: спробы падлетка нейкім чынам утрымаць бацькувыгнанніка нікога ўжо не кранаюць, а яго крык *«Бацька! Праўда, ты не абараняў кулакоў?»* патанае ў зларадасных апладысментах натоўпу. У такой сітуацыі магчымасць катарсісу поўнасцю выключаецца, а сход, некалі народнае веча, цяпер стаў крэатурай, прыстасаванай да маніпуляцый. Падзенне ў бездань трагічнага абсурду працягваецца, толькі сход гэтага ўжо не заўважае.

К. Крапіва ў сваёй тэорыі вылучыў ролю аб'екта сатырычнага выкрыцця: *«Вялікая сатыра заўсёды мела буйныя аб'екты, найчасцей цэлыя сістэмы дзяржаўныя».* Вялікая сатыра — гэта вялікая літаратура, якая кіруецца каштоўнасцямі вялікага гуманістычнага ідэалу. Голас сатырыка — гэта кліч вялікага звону, спрадвечнага сімвала грамадзянскага гуртавання.

У творчасці беларускага сатырыка смехатэрапія стала сродкам вызвалення душы ад страху, духоўнага прасвятлення і кансалідацыі чалавечай грамады — катарсісам і ўзвышэннем. Ён ніколі не быў прыхільнікам смеху праз слёзы, не вабіў яго і Ювеналаў біч сатыры. Сутнасць метаду К. Крапівы — *«за вушка ды на сонейка».* Гэта — у ідэале. Але на справе сатырык мае справу з агрэсіўнымі *элементамі сістэмы,* якія ўмеюць *«прыстасавацца да новых форм грамадскасці і выкарыстаць гэтыя формы ў сваіх уласных інтарэсах».* У савецкай сістэме галоўныя элементы хутка стварылі сабе гарантаваны сацыяльны статус. *«Панцыры іх службовых аўтарытэтаў часамі настолькі моцныя, што вастрыё сатыры можа іх дастаць да жывога толькі з вялікай цяжкасцю і... небяспекаю»,* — пісаў К. Крапіва.

Маючы справу з аўтарытэтамі ў законе, сатырык павінен быць адначасова і аналітыкам і паказаць сутнасць самога *закона* — дзяржавы, сацыяльнай сістэмы ў цэлым. Знешняе аблічча сістэмы і элементаў на яе вышэйшых паверхах у сітуацыі паскоранага тэхналагічнага прагрэсу мяняецца, але па сутнасці як аб'ект сатыры сістэма застаецца самадастатковай, імманентнай самой сабе: *«трухляціна, закаваная ў панцыр і ўзброеная да зубоў».* Творчая ўстаноўка К. Крапівы прадугледжвае, такім чынам, моманты ўзаемадзеяння жанравых формаў і адмаўляе *«жанравы шавінізм».* Аб'яднаныя адзінствам грамадзянскай платформы і пафасам вызвалення і ўзвышэння духу, трагедыя «Канец дружбы» і камедыі «Хто смяецца апошнім», «Мілы чалавек» і «Брама неўміручасці» з'яўляюцца своеасаблівай тэтралогіяй, структурна і функцыянальна набліжанай да абразковых структур у філасофскім тэатры Я. Купалы і М. Гарэцкага і хранікальных раманных цыклаў у прозе XX стагоддзя. Тэтралогія К. Крапівы адлюстроўвае эвалюцыю формаў самазахавання *размеркавальнай сістэмы і яе элементаў.* Сімвалам цэласнага комплексу агрэсіўнай трухляціны з'яўляюцца сход ударнікаў і актывістаў, кабінет Гарлахвацкага, блат-кантора Жлукты і амаль што завоблачны, але наймагутнейшы камітэт па справах неўміручасці. Мяняецца і колер ідэалагічнага покрыву: чырвоная рыторыка на тэму дружбы праз акіяны з гаротнымі працоўнымі ўсяго свету хутка зліняла і стала непатрэбнай. Ідэалагічным апраўданнем размеркавальнай сістэмы стала ценевая этыка блату. Блат-кантора вырасла да памераў дзяржавы і праглынула праект Вялікага княства Свінячага Мамаyта, прапанаваны палеантолагам Гарлахвацкім. Пэўную эвалюцыю прайшоў і *элемент:* ад стадыі ўніверсальнага нарыхтоўшчыка праз комплексы Гарлахвацкага, мілага загадчыка і дэперсаналізаванага цэнтральнейшага размеркавальніка.

У гэтай гісторыі трансфармацыі зааморфных чалавекападобных элементаў у антрапаморфны, але безаблічны бестыярый нейкім цудам выжылі і нашчадкі, здавалася, ужо навекі вымараныx задумных. Гісторыя іх выжывання і паўстання да сапраўднай свабоднай творчасці жыцця адлюстравана ў гісторыі пераадолення скавансці і даверлівай несвядомасці, у гісторыі яднання нашчадкаў хай сабе небагатых, але затое сапраўдных гаспадароў на сваёй ніве: Чарнавуса, Тулягі, Левановіча, Гудовіча, Дабрыяна. Гэта тыя, за кім пайшло новае пакаленне беларуса-сапіенса, які пераадолеў страх і спакусы карыслівага і блізарукага прагматызму.

РОЗДУМ

# РАЗАНАЎ ПЕРАКЛАЎ ХЛЕБНІКАВА

Яўген БЯЛАСІН

**Гэтая фраза не наводзіць на роздум адно тады, калі яе напісаць з клічнікам. Але я і не напісаў…**

Кніга «З» Вяліміра Хлебнікава выйшла сёлета. Казаў пра яе… перакладчык, другога слова пакуль не знайду, падчас прэзентацыі ў Берасці ў Цэнтры імя Калесніка, прафесара, які ў свой час паручыўся за выключанага з БДУ «нацыяналіста», і Алесь Разанаў змог давучыцца менавіта тут, бліжэй да сваёй малой радзімы, Сяльца, што ў Бярозаўскім раёне.



Фота www.brsu.by

Паэты-выпускнікі Берасцейскага філалагічнага факультэта: Алесь Разанаў, Мікола Пракаповіч, Алесь Каско

## Пераклад ці перанос

Загаловак можна было б пісаць з пытальнікам. Але ў анатацыі першай старонкі патлумачана: «кніжка-білінгва змяшчае вершы Хлебнікава на мове арыгіналу і «з», здзейсненыя Разанавым у беларускай мове».

Нямецкая мова дае шкалу ўвасаблення тэкста ў іншай мове. «Пераклад» — гэта праца, планкай для якой выстаўленая адэкватнасць тэкстаў арыгіналу і мовы, на якую перакладаюць. А ёсць яшчэ і «перанос» — гэта ўжо вальнейшая форма.

Напачатку мне думалася, што паэт Разанаў, за плячыма якога багаты досвед жыцця ў нямецкай мове і нямецкім асяродку, сваім «З» меў наўвазе менавіта знясце з сябе вядомага любому перакладчыку ярма моўнай нормы, — калі ты не маеш права на наватворы, прыкладам, бо перакладаны аўтар не ўжыў наватвор. Гэта значыць, паэт Разанаў хацеў больш вольных рухаў, хацеў пераносу, а не перакладу.

Хлебнікаў — надта дабрадайная правакацыя ўбок пераносу, а не перакладу. Норма стылю Хлебнікава — вывіхнутасць са шкалярскіх нормаў, — такім ён бачыць свет:

Вечер. Тени.\\ Сени. Лени.\\ Мы сидели, вечер пья.\\ В каждом глазе — бег оленя, \\ в каждом взоре — лёт копья. —

*Змрокі. Сцені.\\ Сцены. Сені.\\ Зместы ўводзім мы ў суплёт.\\ Ў кожным воку — бег аленя, \\ ў кожным зроку — дзіды лёт.*

## Не мог не …перакласці

Разанаў не мог не перакладаць Хлебнікава так, як камертон не можа не гучаць у адказ, калі настроены на пэўную ноту. Іншая рэч, што аўтары не могуць быць ідэальнымі перакладчыкамі, бо ёсць пэўная пыха творцы, якая не можа не піхаць іх на адстойванне свайго стылю (індульгенцыя…). Перакладчык — гэта месяц, ён свеціць толькі адбітым святлом. Але ёсць і спабор двух сонцаў… Дастаткова згадаць Гайнэ і Лермантава, зусім рознакалярovы аповед пра хвойку на паўночнай скале аўтара і геніяльнага паэта, у якім геній аслабіў перакладчыка настолькі, што выбішаў светлы, гладкі і бліскучы, але





іншы твор, — твор-наватвор, пераствораны твор.

Менавіта аб тым і думалася, калі пачаў чытаць «З» Вяліміра Хлебнікава ў выкананні Алеся Разанава.

## У гэтага аўто тры перадачы

Пры станоўчым уражанні ад кнігі прачытанае падзялілася на «адэкватнае арыгіналу», «пагоршанае» і «палепшанае». Прывяду прыклады.

Еще раз, еще раз, \\ Я для вас \\ Звезда.\\ Горе моряку, взявшему \\ Неверный угол своей ладьи… —

*Яшчэ раз, яшчэ раз, \\ Я зорка для вас. \\ Гора мараку, што ўзяў\\ Нятойны вугал судзіны сваёй…*

Рыфмы перакладу афарбоўваюць яго ў іншы колер. А тут яшчэ наватвор «нятойны» вывернуўся ў вадзе буйной белай рыбай, падсвяцішы срэбным бокам цёмны абшар вады і здарэння ў ім — бо хутка човен разаб'ецца.

О, рассмейтесь, смехачи! \\ О, засмейтесь, смехачи! \\ Что смеются смехами, что смеянствуют смеяльно, \\ О, засмейтесь усмеяльно! —

*Рагачыце, рагачы! \\ Рагачыце, рагачары! \\Рагачварце, рагачвары!\\ Рагатніце рагатліва з рагатнёў, рагатуны!*

Пры такой збежцы наватвораў найперш прыходзіць думка пра неперакладальнасць, ці наадварот, пра мову глуханямых, якая лучыць людзей розных нацыянальнасцяў…

Пагодзімся, што слова «рагачы» ў сялянcкіх беларусаў выклікае спарышовую асацыяцыю, — найперш з каровамі і быкамі, па-мойму. Можа, хто і пра падманутага мужа згадае, — зноў неадназначна. А вось расійскае «смехач» адназначна асацыюецца з чалавекам, які смяецца. У адрозненне ад «рагача», які тут сітуатыўны наватвор, «смехач» наватвор «стойкі». Так што гэты праграмны верш Хлебнікава пабеларуску выйшаў надта «з».

Іншым разам перакласці адэкватна насамрэч аб'ектыўна нельга з-за рознага рэсурсавага інвентару моваў. Прыкладам, гэтыя гукапісы: «Чураясь дня, чаруй \\ чарой голубого вина меня — Цураючыся дня, царуй, чарай блакітнага віна…»

Рэмбо (не кінасупермэн, французскі паэт) у сваім вершы «Галосныя» тонка прыкмеціў розныя сферы жыцця, на якія працуе кожны з гэтай вобмалі галосных гукаў. Пра зычныя яшчэ ніхто, здаецца, сістэмна не пісаў, — здаецца, Алесь Разанаў намануўся зрабіць нешта падобнае, але зразумела, што «ц» гук вузкі; ён можа цурчаць, але чад ад чорнага пылання гумы не пераб'еш, цыркаючы з цяноценькай дзіцячай абліваўкі — тут трэба раскатваць ладны брызентавы рукаў. Згадаю таксама «звонкае дзе і густое чаму» беларускай мовы і магчымы масток не ад словаў — ад гукаў да нацыянальнага характару, суб'ектыўнай мадальнасці агульнага плану. Перакладаючы Хлебнікава і стылёва набліжаных паэтаў, трэба такое мець наўвазе. Прынамсі, як мне падаецца, менавіта на гэтым стыку філалогіі і культуралогіі могуць прадуктыўна працаваць навукоўцы, а перакладчыкі — пакарыстацца з таго…

На ўзроўні слоў ёсць распрацоўкі, якія могуць дазволіць больш сістэмны падыход да перакладу. Ведаючы, што лексіс беларускай мовы як больш «закансерваванай» апісальны толькі на 10 адсоткаў пры вялікім масіве базавых слоў, у той час як у расійскай мове адсотак апісальных слоў у чатыры разы большы, разумееш, чаму Разанаў зрабіў кнігу «З», і гэтым вытлумачаюцца, па-мойму, некаторыя паляпшэнні.

Але «кулялёхнуў» (пра «зінзівера») — гэта не «тарарахнул», тут мнагавата ад кулямёта, які ў часы Хлебнікава, можа, не быў такі актуальны (верш «Конік»). Вось у перакладзе Міколы Папекі дык засталося «тарарахнуў». Затое той напісаў пасля « О лябедзіва» «О, асвяці!», і быў вельмі прыгнечаны аргументамі Разанава падчас кулуараў прэзентацыі ў Бярэсці, бо Разанаўскі варыянт «О зназары» падаецца лепшым.

Удалым прыкладам люстэркавага перакладу-адбітка мне падаецца гэты:

Годы, люди и народы \\ Убегают навсегда, \\ Как текучая вода.\\ В гибком зеркале природы \\ Звезды — невод, рыбы — мы, \\ Боги — призраки у тьмы. —

*Людзі, конадні, гады\\ Уцякаюць наўсягды, \\ Быццам бруйвіны вады.\\ Ў гнуткай люстрані прыроды \\ Зоркі — невад, мы — чароды \\ рыбанелкі, рыбальгі, \\ Цемры прывіды — багі.*

Мяне задавальняе змена парадку рыфмаў, не задаволіла б страта колеру тэкста пры захаванні формы. Нават наяўны ў Разанаўскім тэксце наватвор не нясе новых уплываў, захоўваючы энергетычнае поле арыгіналу.

## Геніяльны перакладчык той, хто можа геніяльна палепшыць арыгінал?

Мяркую, што тыя, хто прачытаў подступ Алеся Разанава да тэкстаў Хлебнікава, і тыя, хто прачытае, знайшлі або знойдуць не перастварэнні, а перанесеныя або перакладзеныя ў беларускую мову вершы, і яны знойдуць іх менавіта ў такой дысперсіі, загушчанымі вакол трох цэнтраў: захаваныя, палепшаныя, пацярпелыя. Знаходжуся на подступе да таго, каб неяк сфармуляваць уражанне ад вершаў, перакладзеных Разанавым з нямецкай мовы. Цікавыя і філалагічна-філасофскія меркаванні паэта, якія рэфлексуе на тэму напісаных і перакладзеных вершаў. Разанаў адзін з нямногіх беларускіх паэтаў, хто спрабуе вырабіцца з беларускага літаратурнага гетта…

Кожная мова дастаткова вялікая, каб абслугоўваць носьбітаў ва ўсіх іхніх патрэбах. Распрацоўшчыкаў некаторых асабліва «прасунутых» галінаў грамадскага жыцця нацыя наймае — або не, калі яна не адбылася. А літаратурнаму перакладчыку «адмашка» даецца ў любым выпадку, і яго бег з бар'ерамі трэба вучыцца ацэньваць ужо ў школе. Каб ацэньваць, трэба мець маштаб і жывых удзельнікаў абмеркавання, якія мелі б у унутранага рэдактара, «заточанага» на тое, каб не прапускаць банальнасці. Таму мне падабаецца тое, што робіць Разанаў. Нездарма ў інтэрнэт-бібліятэцы беларускай літаратуры «Камунікат» паводле дадзеных, якія госці з Беластоку агучылі на згаданай прэзентацыі ў Берасці, «палічку» Разанава адчыняюць да дзвюх тысячаў наведнікаў.

Але вось дыскурсу, нават пры тысячах «камунікатных» прачытанняў, пакуль малавата — дыскурсу на створанае і «перанесенае» Алесем Разанавым, з ягонымі выклікамі на развагі, якія іншым разам ёсць нават вялікімі правакацыямі, з «памылкамі» аўтарскай інтуітыўнасці, якія вымагаюць «адмылак».

ПАЛІЦА

# КАЗКІ СЕРЖУКА ВІТУШКІ

**У выдавецтве Змітра Коласа пабачыла свет доўгачаканая кніга казак віленчука Сержука Вітушкі «Дзінь-дзілінь: Пара гуляць у казкі!». Малюнкі да кнігі выканаў Міхал Анемпадыстаў.**





Аўтар прапануе свае версіі казак паводле вядомых сюжэтаў беларускага фальклору і класічнай літаратуры. Кніга падштурхоўвае чытача пафантазіраваць і прыдумаць уласныя версіі.

Выданне разлічанае як на дзяцей, так і на дарослых.

«Насамрэч гэта ніякія не казкі-прыдумкі. Гэта чыстая праўда. Я доўгі час жыў ды працаваў у Вільні і Мінску з ваколіцамі. І ўсе апісаныя мной імёны, адрасы, рэчы і падзеі адпавядаюць рэальнасці. Так што смела бярыце гэтую кнігу як інструкцыю і рушце ў сапраўднае падарожжа», — зaўважыў Сяржук Вітушка.

Prajdzisvet

ПОСТАЦІ

# РЫГОР ШЫРМА: СТАНАЎЛЕННЕ

Арсен ЛІС

**Рыгор Раманавіч Шырма не толькі перад сваім народам і светам здолеў таленавіта, годна рэпрэзентаваць беларускую песню, але патрапіў стаць духоўным арыенцірам для творчай інтэлігенцыі. Апошняе асабліва важна ў грамадстве, кіраваным неадэкватнымі поступу жыцця ідэалагемамі, палітычнымі ўстаноўкамі.**



Рыгор Шырма



Р.Шырма (у цэнтры) і артысты ансамбля. Гродна. 1946 г.

Настаўнікам, пасля заканчэння Седліцкага інстытута, у Першую сусветную вайну, разам з землякамі-бежанцамі апынуўшыся ў Яраслаўлі, Шырма спрычыніўся да актуальнага грамадскага клопату.

У той час інтэлігенцыяй арганізоўваліся камітэты помачы ахвярам вайны, каб у скрутных умовах выжывання масы ўцекачоў ратаваць іх ад холаду, голаду, даць абяздоленым вайною хоць нейкую духоўную патолю. Акрамя клопату пра хлеб, апратку, лекі для бежанцаў, што было ў кампетэнцыі членаў камітэта, Шырма знаходзіць свой спосаб дапамагчы людзям у нядолі, арганізуе ў 1915 годзе хор, першы свой хор.

Былі цяжкасці з рэпертуарам, але малады дырыжор патрапіў знайсці для землякоў і родную песню, якая ў думках вяртала ўцекачоў-выгнанцаў да гоняў пакінутай імі праз вайну бацькаўшчыны. У клопаце аб рэпертуары можна было абаперціся на педагогаў Мінскага настаўніцкага інстытута, эвакуяванага ў Яраслаў. Сярод іх быў і Шырмаў зямляк, гісторык Усевалад Ігнатоўскі, будучы першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук.

У 1922 годзе, калі Шырма разам з сям'ёю ўжо з Варонежчыны рэпатрыяваўся на малую радзіму ў Заходнюю Беларусь, што апынулася пад Польшчай, Ігнатоўскі і Некрашэвіч прапанавалі застацца ў савецкім Менску. Яны якраз арганізавалі Інстытут беларускай культуры і абяцалі працу. Шырма аднак уступіў гарачай просьбе маці вярнуцца разам у Шакуны. І быў у гэтым выбары знак лёсу: мо нешта ўгадвала ў ім матчына сэрца.

Шырму, у якога і жонка, настаўніца матэматыкі, сядзела без працы, спадзявацца на працаўладкаванне згодна прафесіі не выпадала. Калі даведаўся з абвесткі, што патрабуюцца работнікі ў лесе, пайшоў лесарубам. Кожны дзень 12 кіламетраў у Пружанскую пушчу, ускрай Белавежы, і 12 назад было нялёгка, але мажліва. Тым часам заробак з лесапавалу аказаўся не надзейным. Ці адміністрацыі было падказана, ці сама дадумалася, што настаўнік ды яшчэ рэпатрыяваны з Савецкай Расіі можа мець непажаданы ўплыў на лесарубаў, а праз нейкі час яго звольнілі.

Тады апальны педагог з такіх жа самых беспрацоўных, як сам, настаўнікаў у іх родным мястэчку Пружаны арганізуе другі свой хор. У ім пачынае падымаць беларускую народную песню, запісаўшы ад прыроднай народнай спявачкі Захвеі Хворас добрую вязанку веснавых, купальскіх, жніўных ды восеньскіх песень, сапраўдных шэдэўраў народнага духу.

На час пярэбараў Рыгора Шырмы ў Вільню ў колішняй сталіцы старадаўняй Літвы, цяпер ваяводскім цэнтры польскай дзяржаўнасці, вельмі выяўна адчувалася беларуская прысутнасць, грамадская і культурніцкая. Не маючы апоры на дзяржаву, фактычна насуперак яе палітыцы, беларусы патрапілі рупліва самаарганізавацца.

Паслалі ў найвышэйшы орган Польскай рэспублікі сейм і сенат 14 сваіх прадстаўнікоў-дэпутатаў, якія аб'ядналіся ў Беларускі польскі клуб і сталі рэальна, кампетэнтна адстойваць інтарэсы трохмільённага жыхарства Заходняй Беларусі. Стварылі моцны сацыяльнай і нацыянальнай праблематыкай, інфарматыўнасцю і актыўнай зваротнай сувяззю з рэгіёнамі перыядычны беларускі друк, разгарнулі прадуктыўную кніжна-выдавецкую дзейнасць...

Пасяліўся Рыгор Шырма ў старажытным квартале горада, адразу за Вострай брамай, у г. зв. Базылянскіх мурах. Тут з 1919 года размясцілася Беларуская гімназія, была праваслаўная семінарыя, Беларускі музей, закладзены Іванам Луцкевічам, Беларускае навуковае таварыства. У цэнтры, леваруч ад будынка гімназіі, узвышаўся старажытны храм, фундаваны Канстанцінам Астрожскім на знак яго славутай перамогі пад Оршай. Кватэра сям'і Шырмы мясцілася ў верхнім ярусе масіўнай брамы, што вяла ў Базылянскія муры. Вокны яе глядзелі прама на гімназійны панадворак.

Напачатку Рыгор Шырма не паспеў яшчэ агледзецца ў Вільні, у новым сваім жыцці, як яго падхапіла імклівая плынь грамадаўскага руху.

Нацыянальна-вызваленчы рух пад знакам «Беларускай сялянска-работніцкай грамады» быў адным з яркіх этапаў гістарычнага поступу беларусаў да найвышэйшага ідэалу кожнага народа – стварэння ўласнай дзяржаўнасці. Час неаглядна далучаў педагога і дырыжора Шырму да актуальнай, адразу запалініўшай душу новай грамадскай працы. Праз гады маэстру, аўтарытэтнаму дзеячу беларускай музычнай культуры, Р. Шырму хораша ўспаміналася, як яны, дваццаць чалавек начале з Максімам Бусевічам на Віленскай 12, у цэнтральным сакратарыяце Беларускай сялянска-работніцкай грамады, дзверы якога былі адчынены ад 7-ай гадзіны раніцы да 10-ай вечара, не паспявалі забяспечыць пасланцоў з усіх куткоў Заходняй Беларусі праграмнай літаратурай, статутамі, выпісваць членскія білеты…

Дзеля сацыяльнага і нацыянальнага ўсведамлення народа кіраўніцтва БСР Грамады перш-наперш паклапацілася пра нацыянальную асвету. Дабілася пашырэння статутнай дзейнасці Таварыства беларускай школы з Віленшчыны, як гэта было ў час заснавання гэтай культурна-грамадска-асветнай арганізацыі, да права працы яе на тэрыторыі ўсёй краіны.

Абапіраючыся на ТБШ, якое згуртавала ў сваіх нізавых і паявтовых структурах тысячы адзінак актыўнай інтэлігенцыі, моладзі, дзейсна правяла акцыю барацьбы за беларускія школы. У школьны інспектарат, абсаджаны выхадцамі з карэннай Польшчы, было пададзена сотні тысяч заяў з патрабаваннем адкрыць коштам дзяржавы, згодна канстытуцыі, тысячы беларускіх школ.

У кантэксце заходнебеларускай рэчаіснасці ў выступленнях грамадаўскіх дэпутатаў, у друку паслядоўна праводзілася беларуская ідэя. Народ быў заклікаsucceeded гаварыць, публічна сведчыць аб сваіх патрэбах, праблемах. І безліч допісаў з месц у віленскую беларускую прэсу засведчылі, што народ пачуў заклікі зверху і пазнаў у грамадаўскім кіраўнічым активе сваіх шчырых абаронцаў. У душы заходнебеларускі селянін пачаў звязваць з Грамадой запаветную надзею на зямлю, больш паловы якой у краі належала памешчыкам ды асаднікам.

Грамадаўскі рух нарастаў, як веснавая паводка. К пачатку 1927 года БСР Грамада налічвала ў сваіх радах больш ста тысяч чалавек, што панічна занепакоіла абшарнікаў, культтрэгераў-асаднікаў, адміністрацыю.




Мемарыяльная шыльда на будынку па вуліцы Савецкай, 19, у якім жыў знакаміты кампазітар і дырыжор

У віленскай, а затым і ў варшаўскай польскай прэсе пачаліся інсінуацыі супраць масавай арганізацыі беларускіх працоўных. У Стара Бярозава быў брутальна разагнаны ваенізаванымі «баюўкамі» асаднікаў павятовы з'езд БСР Грамады, пабіты грамадаўскія дэпутаты сойма Пётра Мятла і Павел Валошын.

У Варшаву, Бальвэдэр, да самога Пілсудскага пацягнуліся дэлегацыі з патрабаваннем дэлегацыі БСР Грамады. У беларускім, па сутнасці, адраджэнскім і ў адначассі палітычным руху ўбачылі пагрозу самой Польскай дзяржаве. Напраўду, пагрозы, тым больш рэальнай, не было. Спалохаліся, што народ, аб'яднаны нацыянальнай ідэяй, усвядоміць сваю моц і запатрабуе правы, агаворанага ў Канстытуцыі дзяржавы ды ў міжнародных Рыжскім і Версальскім трактатах.

Успаміналася Р. Шырму, як у дзень новага 1927 года, выступаючы ў сядзібе ТБШ перад Віленскім актывам БСР Грамады, Браніслаў Тарашкевіч, на той час шырокавядомы ўва ўсёй Заходняй Беларусі і за яе межамі дзеяч, гаварыў аб неўнікнёных суровых выпрабаваннях, што чакаюць дэмакратычны ў сваёй істоце рух беларускіх працоўных і аб высокіх, светлых мэтах яго.

Аўтарытарны рэжым Пілсудскага не спыніўся перад разгромам легальнага беларускага руху, аддаўшы пад суд 56 прадстаўнікоў яго на чале з чатырма дэпутатамі сейма і забараніўшы БСР Грамаду.

Татальныя рэпрэсіі 30-х гадоў XX ст. у СССР, знішчэнне беларускай інтэлігенцыі трагічна перапыніла нацыятворны працэс беларускага народа. Ён інтэнсіўна развіваўся ў 20-я гады XX ст. па абодва бакі польска-савецкай дзяржаўнай мяжы і абяцаў канчатковае фарміраванне нацыі, свядомай ідэі ўласнай дзяржаўнасці, сваёй прысутнасці ў свеце як суб'екта гісторыі.

Праз тры з лішнім гады, пасля памятнай сустрэчы новага 1927 года, згадвалася Р. Шырму, выйшаўшы, як аказалася, на кароткі час з польскай турмы, Тарашкевіч накіраваўся ў сядзібу Галоўнай управы ТБШ на вуліцы Святой Ганны ў Вільні. Апынуўшыся сярод старых знаёмцаў, фактычна ў штабе культурна-асветнай арганізацыі, на чале якой стаялі старэйшы беларускі дзеяч юрыст і педагог Фелікс Стацкевіч, знаны асветнік Сяргей Паўловіч, Рыгор Шырма, што патрапіў абысці Беласточчыну, Дзісеншчыну, Навагрудчыну, інспектуючы мясцовыя гурткі ТБШ. Таварыства беларускай школы, што налічвала больш за шаснаццаць тысяч чальцоў, бачылася яму не толькі рэальным ачагом супраціву паланізацыі, але і другой лініяй акопаў вызваленчага руху. Ён так і назваў яго «другая лінія акопаў». І сам планаваў, хацеў быць з тымі, хто стаяў на гэтай другой лініі абароны, змагання.

Але ўсё рашаць за сябе ён цяпер не мог. Яшчэ ў снежні 1925 года Тарашкевіч, пасол сойма Польшчы, аўтарытэтны беларускі палітык, быў прыняты ў Кампартыю Заходняй Беларусі, фармальна аўтаномную ў Польскай кампартыі, дзейнасць якіх была пад забаронай у даваеннай Польшчы.

Кампартыя падтрымлівала БСР Грамаду. Былі ўзаемныя, прынамсі, тактычныя інтарэсы. Адпаведна і ўзаемныя абавязкі. Зрэшты, напачатку аб'ектыўна

# АСОБЫ

яны спрыялі беларускаму вызваленчаму руху.

Згодна з вымогамі палітычнага моманту Тарашкевіч пайшоў на новы крок. У звязку з выбарамі 1930 года ў сейм і сенат Польшчы засноўваўся новы беларускі выбарчы блок «Змагання за інтарэсы сялян і рабочых». Была надзея стварыць новую легальную арганізацыю заходнебеларускіх працоўных, накшталт БСР Грамады, балазе мелася шмат яе сімпатыкаў, спадкаемцаў.

Спіс дэпутатаў у кандыдаты, пададзены Цэнтральным выбарчым камітэтам «Змагання за інтарэсы сялян і рабочых», быў ануляваны, пачатковыя структуры «змаганцаў» у паветах ліквідаваны, а ў лютым 1931 года Тарашкевіч, як і былыя дэпутаты сойма І. Дварчанін, Я. Гаўрылік, Ф. Валынец, быў арыштаваны.

З 1930 года аўтарытарны рэжым Польшчы павёў сістэмны наступ і на культурна-асветныя беларускія пляцоўкі.

Аднаго дня, увосень 1930-га года, увесь кіраўнічы штаб ТБШ апынуўся ў сумна вядомых Лукішках. Для беларускага культурніка, дырыжора гэта быў першы арышт у жыцці.

Духам не ўпаў. Нават пачаў пісаць невялікую п'есу аб змаганні маладога беларускага інтэлігента за асвету, правы і годнасць свайго народа.

П'еса мела рамантычную назву «Зорным шляхам». У рукапісе яе, захаваным у акадэмічнай бібліятэцы Літвы, побач з тэкстам – накіды нотаў...

Падчас знаходжання ў Лукішках дайшлі сумныя весткі з Менску аб трагічнай смерці прэзідэнта Акадэміі навук Усевалада Ігнатоўскага, аб спробе самагубства Янкі Купалы...

Тым часам беларускі культурна-асветніцкі асяродак, які разгарнуў сваю дзейнасць на ўсім заходнебеларускім абшары ад Беластока да Стаўпеччыны, ад Дзісеншчыны да Піншчыны, знаходзіцца ўвесь час у полі зроку палітычнай паліцыі. На пачатку 1933 года яна робіць чарговы наезд на сядзібу Галоўнай управы ТБШ, з ператрусам і арыштам усяго складу яе. Гэтым разам дэфензіве ўдаецца давесці справу, скіраваную супраць беларускіх асветнікаў, да суда. Але і цяпер ёй давялося адступіць. Заслухаўшы падсудных Р. Шырму і Ф. Стацкевіча, якія доказна, ушчэнт, разбілі довады абвінавачання, суд мусіў апраўдаць лідараў ТБШ. Адвакат Казімір Петрусевіч, з польскіх інтэлігентаў, пацісну́ў абаім сваім падабаронным руку: практычна справіліся без яго дапамогі. Трэба сказаць, што ў адрозненне ад Германіі ці СССР 30-х гадоў, дзе грамадская думка была цалкам манапалізавана, замыкалася адно на асобу правадыра, у даваеннай Польшчы, хоць фрагментарна, яна яшчэ захоўвалася часам у незалежнай сваёй іпастасі.

Як сакратар Галоўнай управы ТБШ, Шырма заангажыраваны ў вырашэнне стратэгічных і паточных заданняў арганізацыі. Піша перадавіцы да часопіса «Летапіс ТБШ», запатрабаваны на правінцыі як беларускі лектар. Асабліва́й папулярнасцю і прызнаннем карыстаецца яго лектура на тэму «Значэнне літаратуры ў жыцці грамадства і адзінкі», «Беларускія народныя песні».

Акрамя таго, мастацкай праграмай беларускага хору павінен быў забяспечваць і заўсёды рабіў тое з уласцівым яму эстэтычным чуццём культурныя акцыі: святкаванне паўвекавых юбілеяў народных паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, вечароў беларускай паэзіі з удзелам Максіма Танка, Міхася Васілька, Хведара Ілляшэвіча, Міхася Машары.

Асабліваe значэнне выступы хору пад кіраўніцтвам Р. Шырмы набывалі ў Дні беларускай культуры, якія ў цяжкія для ўсходніх і заходніх беларусаў 1936-1938 гады ладзіліся ў Вільні дзеля нацыянальнай кансалідацыі, сцвярджэння беларускай культурнай прысутнасці ў свеце.

Дні беларускай культуры мелі, як правіла, дзве праграмы: акадэмічную і мастацкую. У першай з рэфератамі звычайна выступалі грамадска-палітычныя дзеячы Антон Луцкевіч, Адам Станкевіч...

У культурнай частцы свята, а гэта былі сапраўдныя святы, чарадзеіў маэстра Рыгор Шырма з хорам і славуты спявак, артыст Пазнанскай оперы Міхась Забэйда-Суміцкі.

Быў то ці не найбольшы, найпераканайнейшы аргумент таго, што не скарыўся пад ударамі жорсткага лёсу беларускі народ, дух творчасці яго – неўміручы. А значыць, у краі, у яго сыноў, цэлага народа гэтага ёсць будучыня.

З гэтай верай беларускі інтэлігент Шырма пражыў усё сваё, без перабольшвання, вялікае жыццё, змагаючы на жыццёвым шляху няпростыя, часам фатальныя перашкоды, выпрабаванні.

Ужо з пачатку 30-х пад рознымі фальшывымі падставамі ішло часовае і поўнае закрыццё ўладнай адміністрацыяй асобных, часам найбольш дзейсных гурткоў і ТБШ. У студзені 1937 года пасля актыўнай акцыі за беларускія школы, праведзенай Таварыствам разам з Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры, гэтыя культурна-асветныя арганізацыі абедзве былі забаронены загадам віленскага ваяводы. Забарона ТБШ была адной з праяў сістэмнага наступу на беларускія арганізацыі, асяродкі супраціву палітыцы асіміляцыі, каланіяніcцкай палітыцы Польскай дзяржавы. І ў гэтых, фактычна анамальных, абставінах, удзельнікі беларускага нацыянальнага, у тым ліку культурна-асветнага, руху не здавалі пазіцый. Р. Шырма заставаўся членам рэдкалегіі неардынарнага на скрутны час часопіса «Беларускі летапіс», публікаваў на яго старонках публіцыстычныя эсэ, літаратурныя нарысы-партрэты пісьменнікаў, змяшчаў аранжыроўкі беларускіх народных песень... Разам з юрыстам Вінцуком Склубоўскім і Максімам Танкам спрычыніўся да арганізацыі выдання народфронтаўскай газеты «Наша воля», на старонках якой выступаў з публіцыстычнымі артыкуламі пад празнымі псеўданімамі. Але газету хутка закрылі...



Віленская беларуская гімназія, настаўнікам якой быў музычны патрыярх Рыгор Шырма

Набліжаўся верасень 1939 года.

Упалая польская ўлада не выклікала спагадання – надаела за 20 гадоў. Але і ў радасці вызвалення з'явіліся цені, загадкі. Нечаканая аддача Вільні сметонаўскай Літве, перамяшчэнне Беларускага ўпраўлення на чале з І. Ф. Клімавым у Беласток, які абазначылі цэнтрам Заходняй Беларусі. А галоўнае ж – арышты беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі ў Вільні літаральна цягам месяца пасля яе саветызацыі. Ды не толькі прадстаўнікоў інтэлектуальнай эліты, а і, што называецца, простых людзей з былых грамадаўцаў і, як ні дзіўна, капэзэбоўцаў, колішніх камуністаў-падпольшчыкаў.

У Р. Шырмы таксама ўзнікалі недаўменні, пытанні. Адно з іх, відаць, прамоўленае ўслых, верне маэстру следчы на Лубянцы зімой 1941 года ў Маскве. Было зусім нечакана...

Ну нешта ў новай, прыйшоўшай у 1939 годзе ў Заходнюю Беларусь уладзе яму, ды ці толькі яму, здалося незразумелым. Але ў цэлым ён, як і бальшыня народа, прыняў яе шчыра. І яна, прынамсі, на дзяржаўным узроўні, здавалася, выказала разуменне яго як артыста, харавога дырыжора.

Невыпадкова ж на новым месцы, ужо ў Беластоку, у 1940-м яму дазволілі арганізаваць Беларускі ансамбль песні і танца. Уласна віленскі яго хор застаўся ў ранейшым сваім складзе, але цяпер упершыню меў пад сабою дзяржаўную апору.

Перад самым нападам немцаў выехалі на гастролі па краіне з надзеяй шырэй паказаць беларускую песню... І раптам арышт у Новасібірску. Лубянка. Начныя допыты. І адно з першых пытанняў следчага: «Што тут беларускага ў гэтай прышлай Беларусі, – казалі?»

Зразумеў, што стасуюць абвінаваўчы штамп «нацдэм». Следству трэба набраць пад яго хоць якія ліпавыя доказы. Тамлівыя начныя допыты, надаелыя і следчаму Рамаменку, той аднойчы нечакана перапыніў аглушальнай навінай «Няма ўжо вашага Купалы...». Па звароце ў камеру ціснулі голаў, сэрца загадкі. Свядомасць вяртала да пераж ытага 12 год таму ў Лукішскай турме, у Вільні. Тады вестка аб спробе Купалы драматычна сыйсці з жыцця ўзрушыла зняволеных, выклікала пытанні, спрэчкі...

Высылка ў паўночны Казахстан не была вялікай палёгкай. Але там, прынамсі, не мучылі недарэчнай вымогай падпісаць на сябе патрэбную следству хлусню. З Лубянкай адышлі і начныя галодныя галюцынацыі. Фізічная трываласць, перанятая ад землярабскага паляшуцкага роду, ды дух супраціву ўсякай несправядлівасці, гвалту, няволі дапамагалі выстаяць.

Тым часам, як нечаканы быў арышт, таксама нечакана прыйшло і вызваленне, выхад на волю, вяртанне да сям'і.

Сам лёс працягнуў руку паланёнаму беларускай песняй, каб ён, яе валадар і майстар-інтэрпрэтатар, мог аддацца ёй да канца. Пра тое, хто спрычыніўся да вяртання Шырмы на волю, ён даведаўся толькі пасля вайны. Атрымаўшы асабістую свабоду, няхай сабе абмежаваную: працу беларускага хору лакалізавалі напачатку правінцыяй, Гароднай, Шырма патрапіў сілай таленту, няскоранай асобы хутка ўзысці, паднясца да вяршыняў харавога мастацтва спеву а капэла, пазначыць сваёй творчасцю цэлы перыяд у гісторыі беларускай музычнай культуры.

Магло здацца, што над інтэлігентам, беларускім самародным талентам гэтым разам не абышлося без боскай апекі, ласкі. У сапраўднасці ж ніякага трансцэндэнтнага ўмяшання ў лёс Рыгора Шырмы не было. Проста сам час падабрэў, крыху прасвятлеў, у тым ліку да пазасталае малое пасля пагрому 30-х гадоў купкі беларускай інтэлігенцыі. Выхаду Шырмы на волю дапамог Якуб Колас. Вядома, не сам здолеў тое зрабіць, а пахадайнічаўшы перад тагачасным кіраўніком рэспублікі П. Панамарэнкам.

Народны паэт якраз жыў у эвакуацыі ў Ташкенце, калі аднойчы да яго на кватэру літаральна ўвалілася група артыстаў беларускага хору з просьбай выратаваць заснавальніка і кіраўніка іх ансамбля. Беларускі ж хор, цяпер ужо пад кіраўніцтвам кампазітара Палонскага, на той час гастраляваў у Ташкенце, і артысты шчасліва скарысталі выпадак, каб папрасіць высокага заступніцтва. Апальны дырыжор зведаў высокае заступніцтва яшчэ раз, ужо будучы ў Гродне. На пачатку 50-х у парадку азнаямлення з горадам яго наведаў нованазначаны малады кіраўнік рэспублікі М. Паталічаў. Між іншым пажадаў асабіста пазнаёміцца з дырыжорам песеннага ансамбля: чуў пра яго ад свайго папярэдніка...

Прыслаў нарачонага, запрасіў у гатэль, дзе спыніўся. Распытаў пра ўмовы працы хору, творчыя планы.

А неўзабаве, у 1952 годзе, Беларускі ансамбль песні і яго шматгадовы кіраўнік атрымалі прапіску ў стольным Мінску. У 1955-м на дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве хор пад кіраўніцтвам Р. Шырмы адметна прадставіў музычную і пеўчую культуру беларусаў.

Арганізатар і дырыжор беларускага хору Шырма быў хутка ўшанаваны саюзным урадам прысваеннем яму высокага звання народнага артыста СССР. Дома прызнанне заслуг хору і яго кіраўніка было выражана ў рэарганізацыі мастацкага калектыву у Дзяржаўную харавую акадэмічную капэлу БССР.

Цяпер лягчэй, хутчэй пайшлі ў свет сабраныя ім цягам паўвеку беларускія народныя песні. На пачатку 70-х выйшаў з друку чацвёрты іх том. А ўслед за ім і двухтомнік аранжыровак, мастацкіх апрацовак, здзейсненых аж сарака двума кампазітарамі праз асабісты кантакт з беларускім фальклорыстам, што адшукаў іх, песціў ля сэрца і шчасліва адпускаў да людзей чуйнымі рукамі дырыжора, галасамі харыстаў.

Цяпер ужо не было патрэбы адстойваць перад чыноўнікамі ад культуры прыярытэт акапэльнага спеву. Цяпер маэстра рабіўся недаступны, амаль недаступны і старазнаёмаму яму ведамству. Хоць часам мсціва навет «Тянет старину!..» (гэта пра яго кроўнае, беларускую песню, сусветную класіку), іспіраванае не проста недабразычліўцамі, далятаў да пастарэлага Майстра. Ды тое дробязі. Адбылося галоўнае. Талент, інтэлект перамаглі ўсё на доўгім жыццёвым шляху. Выстаяць і сягнуць цераз церні да зор дапамагла неардынарная асабовасць сапраўднага інтэлігента.

Друкуецца ў скароце

АГЛЯД

# «ПРЫГОЖАЕ РАБІЦЬ ПАТРЭБНЫМ»

ЛеГАЛ

**Гэтае лета можа выдацца не толькі гарачым на надвор'е, але і запальным для нашага грамадства ўвогуле... З задоўжанай людской моўчнасці гатоў прарэзацца немы, жахлівы крык, як на аднайменнай карціне Мунка.**




І ўсё ж верыцца, што культурным людзям дастане прыцененага часу і на прачытанне чарговага нумара «Дзеяслова».

Для няўрымслівых адразу зазначу найбольш выбітныя, на мой погляд, публікацыі пяцьдзясят другога нумара, на якія я хацеў бы звярнуць увагу чытачоў, — гэта заканчэнне рамана *В. Карамазава «Мастак і парабкі»*, апавяданне *А. Кімхі «Зацьменне Месяца»*, нізка *вершаў Ю. Пацюпы* і артыкул *І. Шаўляковай «Дыялогі пасярод мяжы»*.

Адкрываецца часопіс літаратурным тэкстам (жанр не пазначаны) паэта Леаніда Дранько-Майсюка «У Вільні і больш нідзе» (цытату з яго я скарыстаў для загалоўка свайго агляду). Гэта чытэльны цікавы твор, хоць падчас занадта перанасычаны лічбамі, што ледзь заўважна вагае шалі літаратуры і гістарыяграфіі, але ў асноўным гармонія мастацтва і фактуры захоўваецца. Падкупляе свойскі, натуральны стыль пісьма. Шмат адкрыццяў у напластаваннях гістарычнага і моўнага матэрыялаў. Аснова зместу — беларуская нацыянальная тэма (перадваенная Вільня, М. Танк, А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч) у пераламленні на сучасны погляд.

Наўслед Дранько-Майсюку выдрукавана нізка вельмі добрых вершаў добрага чалавека Фелікса Баторына. Асабліва ўразіла невялікая паэма «Машэка». Паэт шукае беларускі дух сярод сярмяжных рэалій сучаснага жыцця. Апелюе да свайго немалога і няпростага чалавечага вопыту.

Завяршаецца публікацыя рамана В. Карамазава «Мастак і парабкі». І калі пра першую яго частку ў мяне склалася «змястоўна зацягненае» ўражанне, то другая па-добраму здзівіла. Яна больш напружаная як сюжэтным дзеяннем, так і псіхалагізмам герояў. Рускі (рэальны) мастак Мікалай Неўраў, купіўшы хату ў беднай беларускай вёсцы, намагаецца у вечных парабках-сялянах увяць (і выявіць ва ўласнай творчасці) змагарных за сваю свабоду вояў. Але задуманая ім «карціна жыцця» атрымліваецца не зусім «жывой». І не толькі з нязгоды пазіраваць яму любай жанчыны, а таму што «пераапранутыя» ім у вояў сяляне застаюцца ў душы ўсё тымі ж парабкамі. Неўраў рознымі метадамі і падыходамі спрабуе па кроплі выціснуць з іх гэтую рабскую натуру. Але такая драматычная ўнутраная прэпарацыя чалавечага духу прыводзіць мастака да самагубства...

Запамінальнымі выпісаліся вобразы Параскі, Восіпа, Пракопа, Змітрака — гэтыя, як жывыя, тыпажы і выбітныя характарамі сяляне, з натураў якіх мастак, «загрунтоўваючы» іх, вымалёўваў для нашчадкаў такі — непрымальны — менталітэт беларусаў... Любоў і нянавісць да гэтага простага народа і выпрабоўвалі яго (хоць, вядома, тут не абышлося без праявы аўтарскай пазіцыі В. Карамазава) творчую душу на злом.

Як ні дзіўна гэта прагучыць, але раман атрымаўся вельмі сучасным па сваёй ідэйнай задуме і пафасу, нават, можна сказаць, дарэчным да цяперашняй беларускай сітуацыі, калі нам збоку паказваюць на нашу «халопскую зміранасць», а мы зноў маўкліва схіляемся над сваёй вечнаю нівою, сваім безвыходным вырокам. Як доўга?..

Найбольшую эстэтычную насалоду атрымаў ад прачытання вершаў Юрася Пацюпы. Ці не лепшае наогул з усёй лірыкі, што чыталася цягам апошніх гадоў. Цэльная паэтычная нізка, падобная да нерукатворнай, унутрана самабытная па мове, стылю, жанры. Маленькі мастацкі цуд! Каханне — як пожад гарманічнай і супярэчлівай усеаб'емнасці чалавечага жыцця. Спазнанне пчалой сутнасці кветкі, яе красы і нектару.

*Сумны воран сядзіць, як вехаць.*
*Мо' лянуецца ён прарочыць?*
*Ці заснуў у зімовай журбе?*
*Без цябе я не ўмею дыхаць,*
*без цябе я не ўмею бачыць...*
*Раскажы, як мне жыць без цябе?*
*Пра цябе мне і вецер шапоча,*
*і на снезе сініца піша,*
*і снягі маўчаць пра цябе.*
*Як жа сэрца ў адказ не заплача,*
*як жа свята не ўспомніцца наша,*
*калі жыць мне з табой без цябе?*

У гэтым нумары друкуецца адразу некалькі прыпавесцей розных аўтараў. Сярод іх і паэтка Галіна Каржанеўская. Яе «Прыхадні», рэч хоць і чытэльная, але сухавата-тлумачальная. Няма ў творы ўнутранага празаічнага жыцця. Ёсць зямля, груба кажучы, і вада, аднак не хапае паветра. Сам тэкст як бы «прышпільваецца да ведама» да нашай беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці, як нешта магчымае, з намёкам і падтэстам...

А з прыпавесці Сяргея Календы «Хлеб свой пускай па вадзе» аж занадта выпірае злабадзённасць, а наўмысна пазначанае «дакументальнае» прысвячэнне і «прастранны» эпіграф адцягваюць мастацкую значнасць твора.

Прыпавесць Ігара Сідарука з мілым сентыментальным назовам «Мама, як сонейка» не павінна зводзіць чытача ў зман, бо найбольш вядомы як паэт, аўтар з Кобрына зноў «узяўся за старое» (калі яно не з запаснікаў). Нігілістычныя страшылкі з магчымага «армагедона» — гэта небяспечнае пісанне. Ведаючы Ігара, па-таварыску папярэджваю. У даволі арыгінальным тэксце ёсць свой філасофскі падтэкст: жыццё — ненажэрны звер, адно з'ядае другое, абы толькі працягваць уласнае існаванне. Але ці нельга такую ж ідэю выпісаць без надуманага святатацтва?

Цікавая, у нечым эксперыментальная, падборка вершаў Алеся Емельянава-Шыловіча (вось ужо лёс падкінуў хлопцу праблему з прозвішчам). У маладога паэта выпрацоўваецца свой адметны почырк, што праўда не без відавочных літаратурных стратаў... Будзем верыць гэтым радкам:

*І напрыканцы я не стаўлю кропку,*
*бо я за давершанасць*
*бурштынавых вершаў*

Непадалёк друкуюцца душэўныя вершы Валеры Дубоўскага. У апошнім з іх ёсць такія радкі *«адчуць пах// неспазнанай прасторы»*. Па ўсім відаць, гэта такі аўтарскі пожад, бо менавіта нечага падобнага часам бракуе яго добрым вершам, каб стаць паэзіяй. Суцяшае, што аўтар гэта адчувае сам.

Нізка вершаў Алеся Верацейкі «Рэха чорна-белых сноў» разлічана на стыхійнае ўспрыманне, хоць творчыя пасылы і мастацкія задумы аўтара самі па сабе цікавыя. Аднак паэзія патрабуе гармоніі і цэльнасці, прасцей кажучы, духоўнага адзінства аўтара і яго метафарычнага азарэння. Пераважная большасць вершаваных тэкстаў падаецца мне недацягнутай і несфармiраванай, як *«думкі, народжаныя ў кубку экзістэнцыяльнай вусцішы»* (словы аднаго з вершаў). Пакуль што найбольш відавочная праца галавы і стыхійны выплеск эмоцый... Гармонія не даецца. Пакуль. Але патэнцыял для гэтага ёсць.

Аб'ёмная як для «дэбюта», але непераканаўчая па змесце падборка вершаў Юліі Цяльпук «Дзень чужой мовы». Паэтцы хочацца сказаць усё, вывернуць душу вонкі, а насамрэч выяўляецца толькі бачнасць гэтага жадання, а не яго творчае здзяйсненне. У такім выпадку звычайна даводзіцца хавацца ад чытача за працьмай легкаважных слоў. І ўсё ж аўтар мае заўважныя здольнасці, таму надзея на паэтычны поспех застаецца, сыходзячы хоць бы з гэтых радкоў:

*Мелодыі мрояцца*
*б'юць у падрэбра*
*у сонечны зайчык*
*ля цвёрдага сэрца.*
*манія дбання*
*і несупынны кантроль*
*над сваім*
*чалавекаўмельствам*

Аповед Наталлі Ярмольчык (тасама ў рубрыцы «Дэбют») пакуль нагадвае практыкаванне ў прозе, хоць праявы літаратурных здольнасцяў прачытваюцца...

Нізка яшчэ аднаго дэбютанта Алеся Плоткі адметная, але не цэльная. Адчуваецца, што ў гэтым маладым чалавеку жыве (лепш сказаць, пакутна нараджаецца) творца, мажлівы будучы паэт. Ёсць вершаваныя тэксты, на якія прагне адгукацца мая чытацкая істота, але большасці з іх не хапае *сабранасці* стыхійна раскіданых мастацкіх аскепкаў паэзіі...

Цудоўна перакладзены з іўрыта Паўлам Касцюкевічам даволі аб'ёмны аповед Алоны Кімхі «Зацьменне Месяца» — чытанне для літаратурных гурманаў. Мастацтва і майстэрства тут займелі поўную гармонію. Вельмі даравітая пісьменніца. Яна паспрабавала паглядзець незамутненымі вачыма дзіцяці на габрэйскія праблемы знутры саміх габрэяў. Абсалютна шчыра. Чытаючы, атрымаў задавальненне. Знакавы тэкст нумара.

Думаю, беларускім прыхільнікам краснага пісьменства будзе цікава пазнаёміцца з некаторымі новымі і выбітнымі імёнамі сучаснай расійскай паэзіі (Сухбатам Афлатуні, Святланай Буніной, Андрэем Каровіным, Аннай Гарэнка, не блытаць з Ахматавай, Данілам Давыдавым). Пераважна гэта авангардны накірунак, але між выключных версіфікацый і літаратурна-лабараторных марфалагічных доследаў вельмі шмат боскіх іскрынак, што выкрасіліся ад сутыкнення мастацкага слова і рэальнасці сённяшняга жыцця. Хацеў бы асабліва адзначыць асобныя пераклады В. Гапеевай і Ж. Гардона.

Пара ўжо нам зняць шапку перад Сяргеем Шапранам за яго тытанічную працу з архівамі Васіля Быкава і ўсім датычным, што звязана з творчасцю нашага літаратурнага волата. Гэтым разам друкуюцца сабраныя і апрацаваныя матэрыялы адносна драматычнага кінадраматургічнага лёсу Васіля Уладзіміравіча.

Мастак і паэт Рыгор Сітніца напоўніцу, ад усёй шырыні сваёй творчай душы павіншаваў Уладзіміра Някляева з яго юбілеем (65-годдзем). Як кажуць, пра таленавітае і пісаць трэба таленавіта. Ці не таму слова геніяльнасць у невялікім па аб'ёме тэксце ўжыта ажно пяць разоў. Ведаючы Уладзіміра Пракопавіча, думаю, ён не без мудрасці ды іроніі лагодна пасміхнецца і ўсё ж застанецца задаволеным. Моцы, змагарнага духу і паэтычнай волі пажадаем і мы нашаму вядомаму паэту ў гэты няпросты для яго час!

Гутарка Андрэя Масквіна з паэтам, прыхільнікам грамадзянскай лірыкі, Сяргеем Законнікавым у прынцыпе і звялася да злабадзённасці сучаснага нацыянальнага жыцця і выжывання. Паэт шчыры ў сваіх поглядах на сённяшні працэс беларускай дзяржаўнасці і тыя няпростыя варункі, у якія патрапіла наша мова, культура і літаратура...

Чытэльны (аргументаваны і ў меру эмацыйны) нарыс Уладзіміра Содаля пра Францішка Багушэвіча, прыўрочаны да 120-годдзя з часу выхаду «Dudki Bialaruskaj».

У адрозненне ад статычнай гутаркі Масквіна і Законнікава гаворка Кацярыны Безмацерных з мастакамі Таццянай Радзівілка і Канстанцінам Селіханавым вельмі натуральная, нязмушаная і жывая. Яна чапляе сваёй шчырасцю і сентыментальнасцю чытача, які бачыць гэтых мастакоў такімі, якімі яны ёсць насамрэч: людзьмі таленавітымі, свабоднымі і адкрытымі ў сваіх творчых і чыста жыццёвых памкненнях.

Друкуецца пачатак грунтоўнага артыкула Аляксея Рагулі пра творчасць таленавітага пісьменніка Генрыха Далідовіча. Мяркую, гэты тэкст прыдасца нашаму літаратуразнаўству, пашырыўшы чытацкі досвед пра адметнага майстра слова, дасць штуршок для палемікі і глыбейшага вывучэння творчасці беларускага празаіка і нацыянальнай гісторыі.

Поруч друкуецца заканчэнне творчага партрэта Вячаслава Адамчыка. Аб'ёмны літаратуразнаўчы нарыс Яўгена Лецкі «Зрухі жыцця і літаратуры», важкі фактурай зместу і суб'ектыўны па сутнасці, ён можа выклікаць розгалас і, ёсць надзея, яшчэ раз зверне ўвагу прафесіяналаў і чытачоў да постаці нашага знакага і самабытнага «заходне-беларускага» пісьменніка.

Крытычны артыкул Ірыны Шаўляковай «Дыялогі пасярод мяжы» несумненна прыўнясе сустрэчную хвалю супярэчлівасці ў роўнаплыннасць бальшыні публікацый гэтага нумара і выкліча, калі не палемічны, то заўважны рэзананс у «шырокіх літаратурных колах».

Заканчваюцца публікацыі трэцяга нумара «Дзеяслова» за гэты год даволі спрэчнай па сваіх высновах рэцэнзіяй аўтара гэтага агляднага опуса на зборнік вершаў Славаміра Адамовіча «Рым».

Зрэшты яшчэ, як заўсёды, напрыканцы, для цікаўных і бібліяфілаў, у рубрыцы «Дзеяпіснадзённае» коратка анатуюцца новыя выданні, што з'явіліся апошнім часам на кніжных паліцах рэспублікі.

Прыемнага чытання, шаноўныя.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 29 ЛІПЕНЯ, ПЯТНІЦА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00** (з сурдаперакладам), 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 22.45 Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Актуальнае інтэр'ю.
**12.10** «Сваты-3». Камедыйны серыял.
**13.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Мая зорная дыета».
**14.05** Патрабуецца.
**14.15** «Сцежкай ваўка». Навукова-папулярны фільм.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Школа доктара Камароўскага.
**16.05** Прыгодніцкі серыял «Тры талера» (Беларусь). 4-я серыя, заключная.
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.40** «Ведай нашых: Ларыса Івашкевіч».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** «Сваты-3». Камедыйны серыял.
**23.00** Трылер «Хто вы, містэр Брукс?» (ЗША).
**00.55** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць выдатна!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Джэйн Фонда ў фільме «Стромкая Джорджыя».
**23.10** Фільм «Рэальнае каханне».
**01.25** Начныя навіны.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Кіно» «Люстэрка». ЗША - Германія - Румынія, 2008 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Халасцякі». Серыял.
**14.40** «Забойная сіла 4». Серыял.
**15.40** «Next 3». Серыял.
**16.50** «У параднага пад'езда» з Кацярынай Забенько.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс» з доктарам Зміцерам Сайковым.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Камедыя па пятніцах»: «Ўдар галавой». Францыя, 1978 г.
**22.00** «З чаго пачынаецца Радзіма».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Дыскатэка 80-х».
**01.20** «Чэркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### лад

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Меладрама «Дунечка».
**10.50** «Лабірынты гісторыі беларускіх татараў». Частка чацвертая.
**11.15** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення». Дзясятыя класы. Фінал.
**12.30** «Кожны мае права быць розным».
**12.55** Ваенная драма «Чорная бяроза» («Беларусьфільм»). 2-я Серыя.
**14.10** Дак. фільм «Стаялі да смерці».
**14.30** Час футбола.
**15.10** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**15.20** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**16.25** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**16.55** Медычныя таямніцы +.
**17.10** «І смех, і бяда…». (Беларусь).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Рамантычная камедыя «Нянька па выкліку» (ЗША).
**20.40** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.10** Эксцэнтрычная камедыя «Пагаворым пра сэкс» (ЗША- Канада-Францыя).
**00.00** «Пра мастацтва».
**00.25** Дыялогі пра рыбалку.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Мой срэбны шар. Аляксандр Дземьяненка».
**11.00** Весці.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** «На сонечным боку вуліцы».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весці.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новым домам!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весці.
**17.55** Серыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весці.
**20.30** Анастасія Цвятаева ў фільме «Мелодыя кахання». 2010 г.
**22.15** Фільм «Ціхія хвоі». 2009 г.
**23.55** Навіны - Беларусь.
**00.05** «Новая хваля-2011». Трансляцыя з Юрмалы.

### НТВ

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «І зноў дабрыдзень!».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Мужы».
**15.05** «Хвацкія 90-я».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Масква. Тры вакзала».
**23.05** «Песня для вашага століка».
**00.10** «Пара Пінаечэтаў».
**00.45** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

### EUROSPORT

**04.00, 09.30, 13.00, 18.00** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 14-ы.
**11.00** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 13-ы.
**15.00** Плаванне. Часопіс.
**15.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Групавы этап. Турцыя - Іспанія. Румынія.
**16.45** Пляжны футбол. Еўраліга. Адборачны этап (Гаага, Нідэрланды).
**18.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Румынія. 1/2 фіналу.
**20.40** Навіны.
**20.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 19 гадоў. Румынія. 1/2 фіналу.
**22.45** Футбол. Кубак свету 20 гадоў. Групавы этап. Англія - КНДР. Калумбія.
**00.30** Наймоцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. ПАР.
**01.25** Навіны.
**01.30** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 14-ы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «100 хвілін вакацыяў», тэлесерыял: 1 серыя.
**07.50** «Гняздо», серыял: 9 серыя.
**07.45** Навігатар.
**07.55** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Паранены», дак. фільм, рэж. Яраслаў Каменьскі, Анджэй Панкевіч, 2005 г., Польшча.
**10.00** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 16 серыя.
**10.50** «Дзе цяпер той мур?», дак. фільм, рэж. Ганна Майснэр, 2009 г., Германія.
**11.40** YoLife!
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Quo Vadis», тэлесерыял: 5 серыя.
**12.50** «100 хвілін вакацыяў», тэлесерыял: 1 серыя.
**13.20** «Гняздо», серыял: 9 серыя.
**14.10** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Паранены», дак. фільм, рэж. Яраслаў Каменьскі, Анджэй Панкевіч, 2005 г., Польшча.
**15.15** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**15.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**15.55** «Грыф: звышсакрэтна», дак. фільм, 2007 г., Германія: 1 серыя, «Героі і здраднікі».
**16.40** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**16.50** Сцяна, дак. цыкл.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял 8 серыя.
**17.30** Беларускія лёсы: «Беларуская Амерыка», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**17.50** Форум (ток-шоу): «Смяротнае пакаранне: «за» і «супраць»«.
**18.35** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 16 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.35** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.40** Хто ёсць кім?: «Валерый Леванеўскі».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Марцэла», дак. фільм, рэж. Гэлена Тршэшцікава, 2006 г., Чэхія.
**22.25** «Пітбуль», серыял: 20 серыя.
**23.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.20** Аб'ектыў.

## 30 ЛІПЕНЯ, СУБОТА

### 1

**07.00** Існасць.
**07.25** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.40** «Шэф-кухар».
**10.40** «Сваты». Камедыйны серыял.
**12.15** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Гістарычная меладрама «Сказ пра тое , як цар Пётр арапа жаніў» (СССР).
**14.05** Патрабуецца.
**14.20** «Ведай нашых: мастак Вікторыя Каваленчыкава».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Nota Bene.
**16.40** Дакументальны цыкл «Атлас «Дыскаверы» (ЗША). Фільм «Італія». Частка 1-я.
**17.40** Відэафільм АТН «Бабруйскі варыянт» цыкла «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». «Начны хіт».
**21.00** Панарама.
**21.40** Фантастычны баявік «Я, робат» (ЗША-Германія).
**23.30** Канцэрт «Легенды «Рэтра FM» (2006).

### Н

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Асяроддзе пасялення».
**12.10** Прэм'ера. «Ірына Мірашнічэнка. Адкрыцці».
**13.10** Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава».
**14.45** Ералаш.
**15.00** Прэм'ера. «Прысуд».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Сафі Марса ў фільме «Анна Карэніна».
**18.10** «Хіты і зоркі». Канцэрт Віктара Дробыша.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Якія нашы гады!».
**22.25** Фільм «Залегчы на дно ў Бруге».
**00.15** Камедыя «Самая абаяльная і прывабная».

### ТВ

**07.00** Мультыплікацыйны фільм.
**07.30** «Сапраўдная гісторыя».
**08.00** «Кіно»: «Ўдар галавой». Францыя.
**09.30** «Чыстая праца».
**10.30** «Мінск і мінчукі».
**11.00** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**11.30** «Салдаты. Дэмбель непазбежны!» Серыял.
**13.25** «Новыя вандраванні дылетанта».
**14.00** «Залатая калекцыя»: «У зоне адмысловай увагі». СССР, 1977 г.
**15.45** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** «Кіно»: «Яды, ЦІ сусветная гісторыя атручванняў». Расія, 2001 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Сусветны блокбастар»: «Ахоўнік». ЗША, 2006 г.
**22.00** «Нефармат»: «Сардэчна запрашаем ці суседзям уваход забаронены». ЗША.
**23.30** «Зорны рынг».
**00.25** «Чэркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### лад

**06.10** Прыгоды Агента 007. Баявік «На сакрэтнай службе Яе Вялікасці» (Вялікабрытанія).
**08.30** Жансавет.
**09.00** Дача здароўя.
**09.30** Рамантычная камедыя «Нянька па выкліку» (ЗША).
**11.10** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**11.30** Тэлебарометр.
**11.35** Нашы тэсты.
**12.10** Дыялогі пра рыбалку.
**12.35** Серыял «Страхоцце Бэці-3» (ЗША).
**13.25** «Жарсці па культуры».
**14.10** Канцэрт ансамбля песні і танца Грузіі «Эрысіоні». Частка 1-я.
**14.55** Серыял «Маргоша» (Расія).
**18.25** Тэлебарометр.
**18.30** Прыгоды Агента 007. Баявік «На сакрэтнай службе Яе Вялікасці» (Вялікабрытанія).
**21.00** КЕНО.
**21.05** Жараб'ёўка чэмпіянату свету па футболе 2014 г. Прамая трансляцыя.
**22.40** Камедыйная меладрама «На грані парыву» (ЗША).
**00.15** Жывы гук.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Антон Макарскі ў фільме «Ціхія хвоі». 2009 г.
**08.30** Мультфільм.
**09.00** Фільм «Два доўгіх гудку ў смузе».
**10.25** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**11.00** Весці.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Анастасія Цвятаева ў фільме «Мелодыя кахання». 2010 г.
**13.30** Мультфільмы.
**14.00** Весці.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**14.45** «Улада факту».
**15.30** «Пакой смеху».
**16.25** Іна Макарава ў фільме «Жанчыны».
**18.10** «Суботні вечар».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весці.
**20.35** Прэм'ера. «Трава пад снегам». 2010 г.
**23.55** «Новая хваля-2011». Трансляцыя з Юрмалы.

### НТВ

**07.40** Мультфільм «Чабурашка».
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне адмысловай рызыкі».
**08.50** «Медыцынскія таямніцы».
**09.25** «Увага: вышук!» з Ірынай Воўк.
**10.00** Сёння.
**10.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.50** «Кулінарны паядынак» з Дзянісам Ражковым.
**11.40** «Кватэрнае пытанне».
**12.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Кропка незвароту. Віктар Карчны». Дакументальны фільм.
**14.10** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**15.40** «Развод па-руску».
**16.30** «Следства вялі…».
**17.15** «Вочная стаўка».
**18.10** Дэтэктыўны серыял «УГРО».
**19.00** Сёння.
**19.20** Дэтэктыўны серыял «УГРО».
**20.15** «Самыя гучныя Рускія сенсацыі: Брама змроку. Евангелле ад куміра».
**22.45** «Ты не паверыш!».
**23.20** Крымінальны трылер «Вораг дзяржавы № 1: Легенда» .

### EUROSPORT

**04.00, 13.00, 20.30** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 15-ы.
**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**10.00** Футбол. Кубак свету 20 гадоў. Групавы этап. Бразілія - Егіпет. Калумбія.
**11.15** Футбол. Кубак свету 20 гадоў. Групавы этап. Аргентына - Мексіка. Калумбія.
**12.00** Аўтаспорт. Аўта ГП (Германія). 1-я гонка.
**15.15** Футбол. Кубак свету 20 гадоў. Групавы этап. Бразілія - Егіпет. Калумбія.
**16.45, 18.00, 19.15** Пляжны футбол. Еўраліга. Адборачны этап (Гаага, Нідэрланды).
**21.30** Тэніс. Турнір WTA. Стэнфард (ЗША). 1/4 фіналу.
**23.00** Тэніс. Турнір WTA. Стэнфард (ЗША). 1/2 фіналу.
**00.45** Футбол. Кубак свету 20 гадоў. Групавы этап. Камерун - Новая Зеландыя. Калумбія.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25, 12.45** «Машына зменаў», тэлесерыял: 8 серыя.
**07.55** Калыханка для самых маленькіх.
**07.35, 13.50** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 16 серыя.
**09.25, 14.45** Праект «Будучыня».
**09.55** «Марцэла», дак. фільм, рэж. Гэлена Тршэшцікава, 2006 г., Чэхія.
**10.50** Форум (ток-шоу): «Смяротнае пакаранне: «за» і «супраць».
**11.35** «Грыф: звышсакрэтна», дак. фільм, 2007 г., Германія: 1 серыя, «Героі і здраднікі».
**12.20** Беларускія лёсы: «Беларуская Амерыка», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**13.15** Калыханка для самых маленькіх.
**15.15** «Дзеці ў выгнанні. Успаміны», дак. фільм, 2007 г., Расея.
**16.15** «Грыф: звышсакрэтна», дак. фільм, 2007 г., Германія: 2 серыя, «Шпіянаж у часе «халодная вайны».
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 24 серыя.
**17.50** «Марцэла», дак. фільм, рэж. Гэлена Тршэшцікава, 2006 г., Чэхія.
**18.50** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.45** Госць «Белсату»: Радзім Гарэцкі.
**20.05** Еўропа сёння.
**20.35** Рэпартэр.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Беларускія лёсы: «Аляксандр Ісачоў. Майстар і Афрадыта», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.40** «Смяротная нявіннасць», маст. фільм, рэж. Гэлен Уітні, 1991 г., ЗША.
**23.10** «Афіцэры», дэтэктыўны серыяля.
**23.55** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.05** Аб'ектыў.

## 31 ЛІПЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**06.40** Канцэрт «Легенды «Рэтра FM» (2006г.).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал». Праграма пра войска.
**09.40** Фартыфікацыя.
**10.25** Адмысловы рэпартаж АТН «Фруктовы рэйс».
**10.35** «Сваты». Камедыйны серыял.
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Музычная камедыя «Формула кахання» (СССР).
**13.50** Сінематэка.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна). Фільм « Зорныя ўсынаўленні».
**16.30** Сямейная камедыя «Маленькі Манхэтэн» (ЗША).
**18.10** Суперлато.
**19.15** Меладрама «Маша і мора».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Містычная драма «Здань Оперы» (ЗША-Вялікабрытанія).
**00.15** Дакументальны цыкл «У пошуках праўды» (Украіна). Фільм «Чорны пярсцёнак Ганны Ахматавай».

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** «Фазэнда».
**11.40** Мультфільмы.
**12.20** «Спадчына». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Нядзельны «Ералаш».
**16.40** «КВЗ». Прэм’ер-ліга.
**18.15** Фільм «Насланне». Расія, 2008.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вялікая розніца». Лепшае.
**22.05** «Белая птушка». Канцэрт Алены Ваенгі.
**00.05** «Yesterday live».
**00.55** Камедыя «Экватар».

**06.55** Мультыплікацыйныя фільмы.
**07.20** «Я-вандроўца».
**07.45** «Кіно»: «Ахоўнік». ЗША, 2006 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Дэмбель непазбежны!» Серыял.
**13.25** «Добры дзень, доктар!».
**14.00** «Залатая калекцыя»: «Па галоўнай вуліцы з аркестрам». СССР, 1986 г.
**15.40** Ток-шоў «Лёс» з доктарам Зміцерам Сайковым.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Геніяльны шпік».
**17.45** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.30** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: ФК «Шахцёр» Салігорск - ФК «Нафтан» Наваполацк. Прамая трансляцыя.
**22.30** «Арт-хаўс»: фільм рэжысёра Джыма Джармуша «Па-за законам». ЗША - Германія, 1986 г.
**00.20** СТБ прадстаўляе: Пераможцы «Зорнага рынга». Група «Stokes».
**01.30** «Чэркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**07.05** Прыгоды Агента 007. Баявік «Дыяменты назаўжды» (Вялікабрытанія).
**08.45** «Правы чалавека». Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
**09.00** Мір вашаму дому.
**09.10** Гаспадар.
**09.40** Камедыя для ўсёй сям’і. «Шалёныя скокі» (ЗША).
**11.30** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**11.40** Тэлебарометр.
**11.45** Нашы тэсты.
**12.20** Рэальны свет.
**12.50** Серыял «Страхоцце Бэці-3» (ЗША).
**13.40** «Жарсці па культуры».
**14.20** Канцэрт ансамбля песні і танца Грузіі. Частка 2-я.
**15.25** Серыял «Маргоша» (Расія).
**18.50** Прыгоды Агента 007. Баявік «Дыяменты назаўжды» (Вялікабрытанія).
**21.00** «Спортлато 5 з 36».
**21.05** КЕНО.
**21.10** «Навіны надвор’я».
**21.40** «Смешная часіна».
**22.10** Камедыйны баявік «Рабаванне па-французску» (ЗША- Францыя-Вялікабрытанія).

### РОССИЯ

**07.00** «Пакой смеху».
**07.40** Павел Баршак і Фёдар Лаўраў у фільме «Трава пад снегам». 2010 г.
**11.00, 14.00, 20.00** Весці.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «З новым домам!». Ідэі для вас.
**12.20** Мультфільмы.
**12.40** Фільм «Жыццё спачатку «.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка раманса».
**15.30** «Іван Грозны з душой Дон Кіхота. Мікалай Чаркасаў». Дакументальны фільм.
**16.20** Дэтэктыў «Лекі супраць страху».
**18.00** «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.35** Фільм «З прывітаннем, Казаностра». 2010 г.
**22.20** Фільм «Злачынны запал». 2008 г.
**23.55** «Новая хваля-2011». Трансляцыя з Юрмалы.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне адмысловай рызыкі».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ядзім дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.50** «Тры кіта» савецкага спорту» з дакументальнага цыклу «Ўласны гонар».
**11.35** «Дачны адказ».
**12.35** «Хвацкія 90-я».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Кропка незвароту. Аляксандр Галіч». Дакументальны фільм.
**14.10** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**15.40** «Развод па-руску».
**16.30** «Следства вялі…».
**17.15** «І зноў добры дзень!».
**18.10** Дэтэктыўны серыял «УГРО».
**19.00** Сёння.
**19.20** Дэтэктыўны серыял «УГРО».
**20.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**21.45** Прэм’ера. «Геймер».
**23.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**00.10** «Гульня».
**01.00** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**04.00** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 16-ы.
**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Warm Up (Германія).
**10.00** Аўтаспорт. Гран-пры - 3 (Будапешт, Венгрыя). 1-я гонка.
**10.30** Аўтаспорт. Гран-пры - 3 (Будапешт, Венгрыя). 2-я гонка.
**11.00, 13.00** Плаванне. Чэмпіянат свету (Шанхай, Кітай). Дзень 16-ы.
**12.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» (Германія). Раўнд 15-ы.
**15.00** Супербайк. Чэмпіянат свету (Вялікабрытанія). Заезд 1-ы.
**15.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» (Германія). Раўнд 16-ы.
**16.50** Суперспорт. Чэмпіянат свету (Вялікабрытанія).
**17.30** Супербайк. Чэмпіянат свету (Вялікабрытанія). Заезд 2-і.
**18.30** Мотаспартовы часопіс.
**18.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў. Жанчыны. (Швейцарыя). Фінал.
**20.45** Тэніс. Турнір WTA. Стэнфард (ЗША). 1/2 фіналу.
**22.00** Тэніс. Турнір WTA. Стэнфард (ЗША). Фінал.
**23.45** Футбол. Кубак свету 20 гадоў. Групавы этап. Іспанія - Коста Рыка. Калумбія.
**01.00** Футбол. Кубак свету 20 гадоў. Групавы этап. Нігерыя - Гватэмала. Калумбія.
**02.15** Мотаспартовы часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб’ектыў.
**07.15** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 24 серыя.
**07.00** Калыханка для самых маленькіх.
**07.45** Рэпартэр.
**09.05** Еўропа сёння.
**09.35** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**10.20** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.50** Госць «Белсату»: Радзім Гарэцкі.
**11.05** Беларускія лёсы: «Аляксандр Ісачоў. Майстар і Афрадыта», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**11.30** «Грыф: звышсакрэтна», дак. фільм, 2007 г., Германія: 2 серыя, «Шпіянаж у часе «халоднай вайны».
**12.15** «Смяротная нявіннасць», маст. фільм, рэж. Гэлен Ўітні, 1991 г., ЗША.
**13.40** Еўропа сёння.
**14.10** «Марцэла», дак. фільм, рэж. Гэлена Тршэшцікава, 2006 г., Чэхія.
**15.05** «Глядзі, Літва!», дак. фільм, 1996 г., Польшча.
**16.15** «Грыф: звышсакрэтна», дак. фільм, 2007 г., Германія: 3 серыя.
**17.00** Прыватная калекцыя.
**17.20** «Праведнікі», тэлесерыял, рэж. Вальдэмар Кшыстэк, 2010 г.: 1 серыя.
**18.05** Чаму дэмакратыя? 9 серыя: «Крывавыя карыкатуры».
**19.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.05** Басанож па свеце.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.55** На колах.
**20.30** Вагон.
**20.35** Без рэтушы: «Радаводны знак», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**21.00** Тыдзень у «Аб’ектыве».
**21.35** Эксперт.
**21.50** Фільматэка майстроў: «Знакамітасць», маст. фільм, рэж. Ўудзі Ален, 1998 г., ЗША.
**23.35** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.45** Тыдзень у «Аб’ектыве».

## Шаноўныя чытачы!

**На жаль газету «Новы час» не магчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый.
Бабруйск:(8 029) 628 75 01, Вольга
Мінск: (8 029) 178 31 68, Вольга
Слуцк 8-044 755 66 48 Марына

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)
Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня
Всего
Кассир

Для тых, хто прымае рашэнні!
НОВЫ ЧАС
www.novychas.org

ВЫБАРЫ

# СЮРПРЫЗ АД КЛОЎНА

Алег НОВІКАЎ

**З'яўленне кандыдата ад Зялёных змяніла фармат прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ў Францыі.**



Раней французская прэса называла Еву Жалі «клоўнам». Усё з-за таго, што яна носіць чырвоныя акуляры, падобныя на тыя, што носяць у цырку. Цяпер у Жалі новая мянушка — «сюрпрыз». Спачатку яна нечакана здолела выйграць партыйныя праймерыз у Нікаля Уло — вядучага папулярнага ў 1980-я гады тэлевізійнага шоў пра прыроду. Выбар сяброў партыі «Еўропа. Экалогія. Зялёныя» (EELV) на карысць Евы падаваўся абсурдам. Уло — мегазорка. Яго неаднаразова спрабавалі ўцягнуць у свае выбарчыя штабы абедзве вядучыя партыі Францыі: галісты і сацыялісты. Адпаведна апытанням, 58 працэнтаў французаў хацелі б, каб прозвішча Уло прысутнічала ў выбарчым бюлетэні (толькі 28 жадалі падобнай перспектывы для мадам Жалі).

Сама Ева Жалі таксама мала пасуе стэрэатыпным уяўленням пра тое, якім павінен быць правадыр экалагаў. Яна нават ніколі сур'ёзна не займалася экалогіяй. Ева нарадзілася ў беднай нарвежскай сям'і ў 1943 годзе. Каб вырвацца з беднасці, выкарыстоўвала любы шанец. Так, удзельнічала ў конкурсах прыгажунь, і нават заняла трэцяе месца.

У 1964 годзе ў Осла Ева заключыла шлюб са студэнтам Паскалем Жалі, які паходзіў з вельмі багатай сям'і. Яны скончылі юрыдычны факультэт. Пасля Ева зрабіла кар'еру пракурора, кульмінацыяй якой стала афера Elf (1996 год), у якой былі замешаныя буйныя бізнэсмэны краіны. У той час прэса называла Еву іконай вайны з карупцыяй, а праціўнікі пагражалі расправай. У выніку гэта падкасіла сямейныя адносіны Жалі. У 2001 годзе Паскаль Жалі паконччыў з жыццём. Ева ў стане дэпрэсіі збегла ў Нарвегію, аднак пазней вярнулася, каб паспрабаваць сябе ў палітыцы. Спачатку яна фліртавала з лібераламі, аднак пасля яе перацягнулі Зялёныя. Тут яна, здаецца, знайшла сябе. Два гады таму Жалі стала дэпутатам Еўрапарламента.

Хуткі ўздым звязаны з яе здольнасцямі цвяроза аналізаваць сітуацыю і пераконваць аўдыторыю. Менавіта гэта рабіла Жалі падчас праймерыз. Яна пераканала ўсіх, што на гэтым этапе для EELV важней сініца ў руцэ. Сутнасць яе паслання да аднапартыйцаў такая: спачатку трэба адбудаваць структуры, сфармаваць электаральную базу, засведчыць, што EELV — партыя прынцыпаў, а толькі пасля шукаць харызматычнага палітыка — кандыдата ў прэзідэнты. Адным словам, Нікаля Уло з яго мегавядомасцю пакуль павінен пачакаць. Большасць Зялёных (58 працэнтаў) пагадзіліся з такой стратэгіяй і прагаласавалі за Еву.

Выхад Евы Жалі на авансцэну французскай палітыкі цікавіў публіку выключна ў кантэксце магчымага блоку экалагаў з сацыялістамі падчас выбараў 2012 года. Зялёныя не хаваюць, што будуць патрабаваць за сваю падтрымку забароны АЭС у Францыі. Для памяркоўных сацыялістаў гэта вельмі радыкальны выбрык. Ева лічыцца жорсткім перамоўшчыкам.

Аднак скандалы з Евай пачаліся значна раней. Не паспелі медыя цалкам пераварыць факт яе абрання на пасаду кандыдата, як Эва зрабіла скандальную заяву адносна вайсковага параду ў дзень узяцця Бастыліі. Па яе словах, парад ёсць не што іншае, як «вялікая антымонія». На думку Евы, было б лагічней замяніць вайсковы парад — «рудымент каланіялізму» — на «праход грамадзян». Дарэчы, традыцыя вайсковых парадаў на 14 ліпеня ўзнікла толькі ў 1880 годзе, калі Францыя марыла ўзяць у немцаў рэванш за паразу ў вайне 1871 года. Раней усё абыходзілася народнымі гуляннямі.

Прэм'ер ураду Франсуа Фійон у адказ назваў мадам Жалі «хіпі», і дадаў: «Я лічу, што гэтая дама не разумее традыцыі французскай культуры, нашы каштоўнасці і нашу гісторыю». Фактычна прэм'ер прадубляваў тэзісы Марына Ле Пэн, лідара правага Нацыянальнага Фронту, якая раней патрабавала не рэгістраваць Жалі ў якасці кандыдата, паколькі яна мае падвойнае грамадзянства. Марына Ле Пэн казала: «У яе (Евы Жалі) няма радзімы ў сапраўдным разуменні гэтага слова».

Ева сапраўды дасюль мае скандынаўскі акцэнт. Цяжка сказаць, наколькі яна разумее некаторыя аспекты французскай вулічнай культуры. Так, на пытанне журналістаў, ці ведае яна Дамініка Строс-Кана (былога дырэктара МВФ, вядомага сваімі сэксуальнымі прыгодамі), Ева сумленна адказала: «Зразумела. Я брала ў яго іспыт». Па апытаннях, гэты выраз прызнаны самай смешнай фразай, якую французскі палітык сказаў у 2010 годзе.

У гэтым плане не дзіўна, што Ева застаецца іншаземкай для шматлікіх простых французаў. Сярод іх хапае шавіністаў, якія зразумелі словы Фійона і Ле Пэн літаральна. У твітары і на інтэрнэт-сайтах дастаткова заклікаў да таго, каб проста выкінуць Еву з Францыі. Еве таксама прыгадалі, што яна крытыкавала інстытут арміі ў той жа самы дзень, калі ў Афганістане загінула сем французскіх салдат.

Затое Ева стала кумірам левых, для якіх наяўнасць французскага пашпарту значыць прыналежнасці да французскай нацыі. «Словы Фійона цяжка зразумець. Гэта ксенафобія ў самым чыстым выглядзе», — кажа Жан-Люк Меленсон, кандыдат у прэзідэнты ад кааліцыі радыкальных левых партый. Франсуа Аланд, адзін з магчымых кандыдатаў ад партыі сацыялістаў, не падтрымлівае погляды Евы адносна параду. Аднак лічыць ненармальным, калі ў палеміцы, дзе кожны мае права на свой пункт гледжання, аргументам з'яўляецца спасылка на этнічнае паходжанне апанента. «Няма французаў розных катэгорый», — кажа Аланд. Іншы фаварыт сацыялістычнага праймерыз Марцін Абры лічыць, што сваімі словамі Фійон «руйнуе рэспубліканскія прынцыпы». Праўда, не ўсе сацыялісты на баку Евы. Былы кандыдат Сігален Руаяль кажа, што выказванні Жалі «ставяць пад сумнеў тое, што армія стаіць на абароне інтарэсаў французскага народа».

Адным словам, выхад у свет у кандыдата ад Зялёных атрымаўся. Зразумела, яе не ўсе палюбілі, затое лідар EELV змог захапіць дзве важныя для грамадства тэмы — антыміліатарызм і ксенафобію. У дадатку з экалагічнымі лозунгамі, магчыма, гэтага будзе дастаткова, каб набраць на выбарах запаветных 10 працэнтаў, што, па словах Евы, цалкам зменяць французскую палітыку.

Ну а пакуль Ева працягвае сварку з Фійонам. У першым каментары на тыраду Фійона пра свае іншаземнае паходжанне, яна рашуча заявіла: «Я жыву 50 гадоў у Францыі і я француженка. Перадайце Фійону — я не пакіну свой дракар» (дракар — вайсковы карабель вікінгаў).

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Лукашэнка можа пакінуць усё як ёсць: працягваць душыць хвалю незадаволенасці і спрабаваць пасварыць Расію і Захад у надзеі на тое, што на фоне геапалітычнай канкурэнцыі яму перападуць патрэбныя сродкі. Але гэта самы малаверагодны варыянт, паколькі на абодвух кірунках беларускі прэзідэнт перагнуў палку. Пры гэтым без фінансавай дапамогі сітуацыя пагражае хутка пагоршыцца, і тады выбух народнага гневу будуць не ў сілах стрымаць нават спецслужбы. Шматлікія назіральнікі ў Беларусі баяцца, што Лукашэнка не спыніцца ні перад чым — у тым ліку перад загадам адкрыць агонь па пратэстуючых. Тым не менш, ужо сёння варта задумацца над тым, што будзе пасля сыходу Лукашэнкі і як дапамагчы краіне, пераўтварэнні ў якой могуць стаць такімі ж цяжкімі, як былі ў Польшчы і краінах Балтыі.

**«Frankfurter Allgemeine Zeitung» (Германія)**

У падыходах Расіі ў адносінах да Беларусі цяпер цікавая сітуацыя. З аднаго боку, ясна, што Расія не зацікаўлена ў якой-небудзь каляровай дэмакратычнай рэвалюцыі ў Беларусі, хаця б беручы пад увагу цесную ваенна-стратэгічную інтэграцыю абедзвюх дзяржаў. З іншага боку, менавіта Лукашэнка цяпер з'яўляецца самай вялікай праблемай Крамля і перашкодай для яго (і для расійскіх алігархаў) у перадзеле беларускай эканомікі. У прынцыпе, у інтарэсах Расіі быў бы нейкі палацавы пераварот: пазбавіцца ад Лукашэнкі, захаваўшы створаную ім вертыкаль улады. Узнікае пытанне, што ў гэтай сітуацыі робяць Еўрапейскі Саюз і NATO, усходнім суседам якіх з'яўляецца Беларусь? Проста глядзяць на тое, як эканамічны, а потым і цалкам палітычны суверэнітэт губляе адна з краін на карце свету?

**«Diena» (Латвія)**

Цяпер мы бачым, што адзінай лініі паводзін у адносінах Мінску і Масквы няма: ёсць кампанейшчына — то сябруем, то не сябруем. А што будзе далей, мы не ведаем. У выпадку сыходу Лукашэнкі, мы, хутчэй за ўсё, Беларусь страцім. Да ўлады там з вялікай верагоднасцю прыйдуць людзі, якія да нас павернуцца спінай. І тут не павінна быць ніякіх ілюзій. А нашы гутаркі, што мы там працуем з нейкімі кандыдатамі, — гэта тыповы самападман. Прарасійскіх лідараў апазіцыі ў Мінску няма. Калі рэжым у Беларусі паваліцца ў фармаце чарговай «рэвалюцыі», з вялікай верагоднасцю разваляцца праекты саюзнай дзяржавы і адзінай мытнай прасторы.

**«Профиль» (Расія)**

РБ — патрымоніум Лукашэнкі. Лукашэнка — не ўладальнік тэрыторыі, а праваднік антыкаланіяльных поглядаў і глыбокі патрыёт. Аднак гэта не сацыялізм — і Чавес, і Маралес, і Артэга, і Кадафі, і Лукашэнка — нацыяналісты. Праблема Лукашэнкі ў тым, што ён з'яўляецца знакам, сімвалам беларускай дзяржавы. І калі ён не пачне кантраляваны пераход да перадачы ўлады парламенту ці будаўніцтва партыі, якая магла б узяць уладу легітымна праз нейкі час, Беларусь як дзяржава можа разбурыцца.

**«Хвиля» (Украіна)**

У беларускай інфармацыйнай прасторы апошніх некалькіх тыдняў неаднаразова з'яўлялася інфармацыя пра тое, што ў той эканамічнай сітуацыі, якая склалася, Аляксандр Лукашэнка лічыць меншым злом з'яўленне беларускіх алігархаў, чым прыход у рэспубліку расійскіх. Доказам гэтага з'яўляецца той факт, што на абвешчаных аўкцыёнах асноўнымі пакупнікамі прапанаваных прадпрыемстваў з'яўляюцца мясцовыя бізнэсмэны. Сённяшні працэс перадачы шэрагу заводаў беларускім бізнэсмэнам падобны, хутчэй, на спробу ўтрымаць у руках дзяржавы як мага больш прыбытковых прадпрыемстваў, якія даюць рэальныя грошы ў рэспубліканскі бюджэт. Менавіта таму дзяржава з лёгкім сэрцам і практычна за бесцань раздае свае невялікія актывы тым, хто знаходзіцца побач з кіраўніцтвам краіны, але не ў ім самім. Лукашэнка сапраўды баіцца наменклатурнай прыватызацыі, здольнай стварыць прамую пагрозу яго палітычнай уладзе.

**«Регнум» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ФРАНЦЫЯ. СВАБОДА! РОЎНАСЦЬ! АДЗІНОТА!

Грамадскія арганізацыі Францыі пачалі незвычайную кампанію супраць адзіноты. Аказваецца, з пачаткам летніх вакацый у французскім соцыуме назіраецца рост дэпрэсій, выкліканых слабай камунікацыяй людзьмі. На глебе адзіноты людзі часам робяць самыя дурныя рэчы, кшталту самазабойстваў. Увогуле, адпаведна даследаванням, ад гэтай хваробы пакутуюць 9 працэнтаў французаў, старэйшых за 18 гадоў. Самае цікавае, што тут слаба дапамагаюць рознага кшталту сацыяльныя сеткі. Маладыя французы, для якіх інтэрнэт-частка жыцця, таксама ахвяры з'явы. 52 працэнта людзей ва ўзросце 18–24 год маюць праблемы на глебе сацыяльнай ізаляцыі. Праблема настолькі цяжкая, што кампанію супраць адзіноты сімвалічна ўзначаліў прэм'ер міністр Франсуа Філон.

**Па матэрыялах французскай прэсы**

### ГРЭЦЫЯ. ЧЫСТКА Ў САЦІНТЭРНЕ

У Афінах адбыўся З'езд Сацыялістычнага Інтэрнацыяналу, які прыняў вельмі знакавае для сацыялістаў СНД рашэнне. А менавіта — выключэнне некаторых партый з шэрагаў Сацінтэрну за неадпаведнасць дзеяннях каштоўнасцям і прынцыпам інтэрнацыяналу. Сярод пазбаўленых сяброўства і Сацыялістычная партыя Украіны (СПУ) Мароза. Рашэнне, безумоўна, цікавае. СПУ доўгі час была адзінай больш-менш адэкватнай сацыялістычнай ідэалогіі і, галоўнае, масавай партыяй у Садружнасці. На выбарах яна збірала стабільна 5–7 працэнтаў галасоў. Усе, аднак, змянілася ў 2006 годзе, калі Аляксандр Мароз пагадзіўся ўвайсці ў кааліцыю з Януковічам. Электарат адвярнуўся ад сацыялістаў, якія хутка дэградавалі да карлікавай партыі алігарха Сушко. Самае цікавае, што ўкраінскія радыкальныя левыя, якія заўсёды крытыкавалі Мароза за гульні з алігархамі, выступілі супраць выключэння марозаўцаў з Інтэрнацыяналу. Ім не падабаецца, што адным з ініцыятараў выключэння СПУ была ПАСОК — Партыя сацыялістаў Грэцыі, якая нядаўна падтрымала антысацыяльны план выратавання грэчаскай эканомікі.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### ЯПОНІЯ. СПОРТАМ ПА РАДЫЯЦЫІ

Японцы прыдумалі, як забыць пра жудаснае цунамі і аварыі на АЭС — наступствы катастрофы. Токіа падаў афіцыйную заяўку на правядзенне алімпійскіх гульняў 2020 года. Па словах японскіх чыноўнікаў, гэта стане лепшым сродкам калектыўнай псіхічнай тэрапіі супраць траўмы, якая ўзнікла пасля апісаных трагічных падзей. Нагадаем, што ў 1964 годзе японская сталіца ўжо прымала алімпійскія гульні. Яна таксама была кандыдатам на правядзенне алімпіяды ў 2016-м, аднак прайграла конкурс Рыа-дэ-Жанейра. Цяпер галоўнымі канкурэнтамі японцаў будуць Мадрыд і Рым. Магчыма, свае кандыдатуры таксама выставяць Доха і Стамбул. Пакуль эксперты крытычна разглядаюць шансы Токіа. Прынамсі пакуль не вырашыцца сітуацыя на аварыйных АЭС, ніводны алімпійскі функцыянер не будзе галасаваць за японскую сталіцу.

**Па матэрыялах «Figaro» (Францыя)**

### КАЗАХСТАН. СТЫНГ – АПОШНЯЯ НАДЗЕЯ КАЗАХАЎ



Гісторыя пра тое, як Стынг, брытанская рок-зорка, адмяніў канцэрт у Астане ў знак салідарнасці з бастуючымі нафтавікамі, нарабіла сярод казахаў шмат шуму. Здаецца, перапалохаліся і ўлады. Яны перасталі цiснуць на забастоўшчыкаў і зараз шукаюць з імі кампраміс. Гэты факт адразу надаў Стынгу рэнаме абаронцы народу. Як перадае казахская прэса, на адрас музыкі цяпер пішуць усе пакрыўджаныя ўладай. Так, ліст у брытанскае пасольства з паметкай «Для Стынга» даслалі двое былых міліцыянераў, якіх, па іх словах, незаконна звольнілі з працы.

**Па матэрыялах казахскай прэсы**

### ІСПАНІЯ. ФРАНКА ПЛАНАВАЎ НАПАД НА ПАРТУГАЛІЮ

Сталі вядомыя некаторыя моманты рэакцыі дыктатуры Франка на рэвалюцыю ў Партугаліі ў красавіку 1974 года. Нагадаем, што ў той час у Партугаліі ў выніку выступу вайскоўцаў была знішчаная дыктатура, устаноўленая яшчэ ў 1930-я гады Антоніа Салазарам. Франкісты ў суседняй Іспаніі вельмі баяліся, што рэвалюцыя можа прыняць міжнародны характар. На ўсялякі выпадак у вайсковай акадэміі аператыўна быў распрацаваны план вайны з партугальцамі. Адпаведна яму, іспанцы збіраліся з дапамогаю паветранага дэсанту захапіць Лісабон. У лістападзе 1975 года яго ледзь не пачалі рэалізоўваць, пасля таго, як у Лісабоне камуністы атакавалі іспанскае пасольства. Аднак Франка ў апошні момант адмяніў загад. Дарэчы, іспанскі план атакі на Партугалію існаваў і ў часы Другой сусветнай вайны. Нашто яго прыдумалі, не вядома. З іншага боку, дыктатары ніколі не давяраюць адзін аднаму.

**Па матэрыялах «Lewica» (Польшча)**

---

ГЕАПАЛІТЫКА

# ХТО БУДЗЕ 194-м?

*Алег НОВІКАЎ*

**8 ліпеня Паўднёвы Судан стаў 193-й афіцыйна прызнанай дзяржавай у свеце. Хто будзе наступным, 194-м? Прапануем вашай увазе топ непрызнаных краін, якія з'яўляюцца фаварытамі на афіцыйнае прызнанне з боку міжнароднага грамадства.**

## 1. Палесцінская дзяржава

Незалежнасць Палесціны была абвешчана яшчэ ў 1988 годзе кіраўніцтвам Палесцінскай вызвольнай арганізацыі (PLO). Праўда, на той момант PLO не кантралявала ніводнага метра зямлі, якая ўваходзіла ў склад абвешчанай імі дзяржавы. Адпаведна дамове ў Осла, у 1994 годзе была заснаваная Палесцінская Нацыянальная Адміністрацыя, якая цяпер кантралюе Заходні Бераг Палесціны. Другая частка Палесцінскай дзяржавы — Сектар Газа — знаходзіцца ў руках ісламісцкай арганізацыі «Хамаз». На першы погляд, гэта стварае адмысловую праблему. Што будзе, калі «Хамаз» абвесціць Сектар Газа асобнай краінай? Аднак, дыпламаты, здаецца, лічаць гэта ўнутранай справай адміністрацыі. Палесціну ўжо прызналі 130 краін. У дадатак Палесціна мае прадстаўніцтва ў ААН як назіральнік і ўдзельнічае ў міжнародных арганізацыях кшталту Арабскай Лігі і Арганізацыі Ісламскай кааперацыі. Лічыцца, што краіна падасць заяўку на поўнафарматнае сяброўства ў ААН у гэтым годзе. Працэдура разгляду заяўкі абяцае быць вельмі цікавай, паколькі на днях у ізраільскім МЗС мела месца уцечка інфармацыі. Усім пасольствам Ізраілю дасланыя загады любым чынам зрываць прыём Палесціны ў ААН.

## 2. Рэспубліка Косава

Гісторыя косаўскай незалежнасці пачалася ў 2008 годзе, калі ў краіне знаходзіліся блакітныя каскі ААН. Услед за імі сюды прыехалі заходнія палітыкі і чыноўнікі, якія фактычна і стварылі каркас косаўскай незалежнасці (так, яны дабіліся таго, каб Косава не ўваходзіла ў склад Албаніі). З улікам таго, што бацькамі косаўскай незалежнасці былі заходнія дыпламаты, асаблівых праблем з міжнародным прызнаннем у касавараў няма. Сёння Косава прызнаюць 76 краін — сяброў ААН. Край з'яўляецца сябрам Міжнароднага валютнага фонду і Сусветнага банку. Праўда, да канца не зразумела, як будуць будаваца адносіны з Сербіяй (сербы лічаць, што Косава — гістарычная частка Сербіі). Аднак з часам, магчыма, кантакты наладзяцца. Сімвалічна, што не так даўно адбыўся першы афіцыйны візіт сербскага прэм'ера ў Боснію, якую сербы таксама доўга не жадалі прызнаваць. Таксама варта ўзгадаць, што ЕС намагаецца як мага хутчэй уключыць усе балканскія краіны ў склад Еўропы. Так што кантактаваць касаварам і сербам усё роўна прыйдзецца, хаця б і праз Брусэль.

## 3. Тайвань

У наш час дзяржаўны суверэнітэт Кітайскай Рэспублікі (так афіцыйна называецца Тайвань) прызнаюць 34 краіны. У дадатак Кітайская Рэспубліка Тайвань ажыццяўляе дыпламатычныя адносіны праз свае «эканамічныя і культурныя прадстаўніцтвы» (фактычна, пасольствы). Як вядома, праблемы Тайваня пачаліся ў 1971 годзе, калі яго месца сябра Савету бяспекі ААН вырашылі перадаць КНР. Тайвань згубіў не толькі месца ў Саўбезе, аднак аўтаматычна і сяброўства ў арганізацыі. Пасля краіна 12 разоў падавала заяўку на тое, каб вярнуць сабе месца ў ААН, і 12 разоў з-за ўпартай пазіцыі Пекіну ёй адмаўлялі. Не дапамагло нават тое, што ў 2007 годзе Кітайская Рэспубліка падала заяўку на ўступленне ў ААН ужо пад назвай «Тайвань», а не як «Кітайская Рэспубліка Тайвань», як было раней. Дарэчы, Кітай — не адзіны, хто не ў захапленні ад прысутнасці Тайваня ў ААН. Ёсць яшчэ і Расія. Тайваньскі ўрад, які разглядае сябе адзінай легітымнай кітайскай уладай, лічыць, што Аўтаномная Тувінская Рэспубліка — не суб'ект РФ, а спрадвечны кітайскі край, акупаваны рускімі. Раней тайванцы таксама не прызнавалі незалежнасць Манголіі, якая дабілася самастойнасці ў выніку антыкітайскага паўстання. Але ў 2002 годзе тайванцы ўсё ж дазволілі манголам быць суверэннымі.

## 4. Самаліленд

Дзяржаўнае фармаванне ў Афрыцы, заснаванае ў 1991 годзе пасля фактычнага краху дзяржавы Самалі, якая ў сваю чаргу ўзнікла ў 1960-м шляхам аб'яднання двзюх былых калоній — Брытанскага Самалі і Італьянскага Самалі. «Брытанцы», у адрозненні ад «італьянцаў», хуценька знайшлі агульную мову і наладзілі дзяржаўнае жыццё. У гэтай частцы Самалі няма піратаў, палявых камандзіраў, грамадзянскіх войнаў і г.д. Прыкладна з 2005 года ў Самаліленда пачаліся адбудоўваца асцярожныя кантакты з Еўрасаюзам. Прадстаўнікоў Самаліленда таксама запрашаюць на саміты брытанскай супольнасці, куды ўваходзяць былыя калоніі Вялікабрытаніі. Цікава, што Вялікабрытанія вядзе дыялог з Самалілендам праз парламент Уэльса. У 2007 годзе адбыўся першы афіцыйны візіт прэзідэнта самаабвешчанай краіны ў Эфіопію. Галоўны бар'ер на шляху міжнароднага прызнання — самалійскі пераходны ўрад, які з дапамогаю Захаду змагаецца з ісламскімі фундаменталістамі ў «італьянскай» частцы Самалі і лічыць, што яго кампетэнцыя распаўсюджваецца на тэрыторыю ўсёй былой Самалі. Наўрад ці пераходнаму ўраду спадабаецца падтрымка «сепаратыстаў» з боку Захаду.

## 5. Абхазія

Пры ўсёй знешняй фіктыўнасці абхазскай дзяржаўнасці (як вядома, яе жыхары маюць расійскія пашпарты, тут ходзяць расійскія рублі і стаяць расійскія вайсковыя базы) перспектывы Абхазіі атрымаць міжнароднае прызнанне не такія ўжо і кепскія. Безумоўна, прызнанне з боку Венесуэлы, Нікарагуа, Науру і Паўднёвай Асеціі — гэта не сур'ёзна. А вось вялікая актыўнасць у краі турэцкага бізнэсу шмат пра што кажа. Існуе таксама версія ў падтрымку абхазскай незалежнасці ў Еўропе: на думку шэрагу палітыкаў, гэта паскорыць інтэграцыю Грузіі ў склад ЕС, якая для пачатку інтэграцыі павінна вырашыць усе памежныя канфлікты. У гэтым плане цікавыя цяперашнія дэбаты ў Грузіі, выкліканыя публікацыяй палітолага Мамукі Арэшыдзэ. Ён першым заклікаў Тбілісі прызнаць незалежнасць Абхазіі. Мяркуючы па рэакцыі, прапанова ўспрынятая не так ужо і адмоўна. Шмат у гэтай вобласці будзе залежыць ад вынікаў выбараў прэзідэнта Абхазіі, якія прызначаныя на жнівень.

## 6. Заходняя Сахара

Афіцыйная назва дзяржавы Арабская Дэмакратычная Рэспубліка (SADR). Рэгіён быў іспанскай калоніяй. Але 6 лістапада 1975 года Кароль Марока Хасан II арганізаваў так званы «Зялёны марш». Па яго закліку 350 тысяч беспрацоўных мараканцаў, сярод якіх былі жанчыны і дзеці, увайшлі на тэрыторыю Заходняй Сахары, не сустракаючы супраціву. У лютым наступнага года Фронт «Polisario», які вёў партызанскую вайну супраць мараканскіх войскаў, абвясціў Заходнюю Сахару незалежнай дзяржавай. Яе прызналі 49 дзяржаў свету. Рэспубліка з'яўляецца сябрам Афрыканскага Саюзу. Улады SADR кантралююць усходнюю частку Заходняй Сахары, названую Вольнай зонай, хаця сам урад знаходзіцца на тэрыторыі Алжыру, які з'яўляецца спонсарам «Polisario». Пазіцыя ААН па SADR наступная: анексія з боку Марока — кепска, аднак і самаабвяшчэнне незалежнасці на базе адной партыі таксама кепска. Трэба правесці рэферэндум. Пакуль што ні партызаны, ні мараканцы на гэта не згодныя. Хаця апошнія ў 2007 годзе прызналі магчымасць надання Сахары аўтаноміі. Магчыма, сітуацыя вакол Сахары зменіцца пасля нядаўняга пачатку ў Марока асцярожных дыпламатычных рэформ.

**Кітай — не адзіны, хто не ў захапленні ад прысутнасці Тайваня ў ААН. Ёсць яшчэ і Расія. Тайваньскі ўрад лічыць, што Аўтаномная Тувінская Рэспубліка — спрадвечны кітайскі край**

ІНТРЫГІ

# МАСКВЕ НАДАКУЧЫЎ СМІРНОЎ

**За пяць месяцаў да выбараў прэзідэнта Прыднястроўя Масква пачала беспрэцэдэнтна актыўную працу ў падтрымку кандыдата ад апазіцыі. Пра тое, чаму прэзідэнт Ігар Смірноў, які кіраваў краем 20 гадоў, трапіў у апалу, журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з малдаўскім журналістам Сяргеем Дворскім.**



***— 15 ліпеня Цэнтральны Савет вядучай прыднястроўскай апазіцыйнай партыі «Абнаўленне» прыняў рашэнне рэкамендаваць восеньскаму з'езду партыі высунуць Анатоля Камінскага ў кандыдаты на пасаду прэзідэнта. Гэтую навіну прэса тлумачыць як пачатак непасрэднага працэсу адхілення Крамлём ад улады Смірнова. Гэта праўда?***

— Думаю, так. Падзеі 15 ліпеня — лагічны працяг той тэндэнцыі, якую мы назіраем з пачатку года. Увесну ў ПМР (Прыднястроўская Малдаўская Рэспубліка) прыязджаў вялікі дэсант расійскіх дэпутатаў і супрацоўнікаў апарату «Адзінай Расіі», якія шмат казалі пра неабходнасць перамен, сустракаліся з апазіцыяй. Пасля рэгіён наведалі некалькі вядучых расійскіх палітолагаў і журналістаў, у тым ліку «гаворачая галава» Крамлю Міхаіл Лявонцьеў. Апошні прамым тэкстам звярнуўся да Смірнова наконт таго, што, маўляў, трэба саступіць месца каля руля сучасным палітыкам. Смірнова праз месяц выклікалі ў Маскву, дзе ён меў сур'ёзную размову, пасля якой сказаў, што падумае наконт сваёй балаціроўкі ў прэзідэнты. І апошняя кропка — у сустрэчы 15 ліпеня прымаў удзел Валеры Багамолаў, намеснік фракцыі «Адзінай Расіі», і Генадзь Букаеў, прадстаўнік кіраўніка расійскага ўраду. Фінальную фразу выступу Багамолава на Цэнтральным савеце трэба працытаваць асобна: «Я спадзяюся, што ў снежні мы з задавальненнем увойдзем у новы 2012 год з новым прэзідэнтам Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікі Камінскім Анатолем Уладзіміравічам».

***— Чаму Смірноў калібру 2005 года быў у вачах расійскіх палітыкаў «сучасным» і яму аказвалі падтрымку на выбарах, а зараз раптам стаў «несучасным»?***

— Зразумела, што гэта папросту дэмагогія. У Масквы ёсць як мінімум два чыннікі патрабаваць сыходу Смірнова на пенсію. Па-першае, Расію, якая не пакідае надзеі вырашыць канфлікт у Прыднястроўе, раз'юшвае ўпартае нежаданне Цiраспалю весці перамовы пра ўрэгуляванне адносін з Кішынёвам на аснове атрымання аўтаноміі ПМР. Па-другое, да прыднястроўскага гаранту ў Маскве ёсць пытанні фінансавага характару: з нагоды неплацяжоў рэспублікі за расійскі газ, а таксама размеркавання ў 2006–2007 гадах расійскай гуманітарнай дапамогі. Нарэшце, Смірноў — для ўсіх маскоўскі васал, які павінен ведаць сваё месца. А паколькі спадар Смірноў дасюль плануе зноў высунуць сваю кандыдатуру, у Маскве дэманстратыўна падтрымалі Камінскага.

***— Ігар Смірноў вядомы як вельмі вопытны папуліст і дэмагог. Ці здольны Камінскі, які, мяркуючы па біяграфіі, звычайны чыноўнік, цягацца з ім?***

— Фігура Анатоля Камінскага, сапраўды, не так раскручана. Чалавеку яго складу няпроста цягацца з супернікамі, якія доўга практыкаваліся ў дэмагогіі. Але прыднястроўцы за дваццаць гадоў стаміліся ад адных і тых жа слоў і лозунгаў, прычым адных і тых жа людзей. У грамадства адна патрэба — жыць па-чалавечы, не горш, прынамсі, чым суседзі. Па-другое, супраць Смірнова таксама выступае Юры Шаўчук, які мае імідж празаходняга палітыка. Пры такім раскладзе Камінскі займае нішу цэнтрыста, які задавальняе і патрыётаў-пенсіянераў і маладых, якія патрабуюць перамен.

***— Якія глабальныя перамены ў ПМР трэба чакаць у выпадку перамогі Камінскага?***

— Прыход Камінскага ва ўладу мае хоць нейк анімаваць грамадскую палеміку, адрадзіць давер людзей у праект ПМР. Праект ПМР, у які Масква інвеставала вялізныя сумы, рэзервы, свой аўтарытэт, цяпер можна параўнаць з часамі зеніту брэжнеўскага застою. Няма ратацыі эліты. Патрыятычная афіцыйная агітацыя ўсім надакучыла, паколькі не можа кампенсаваць эканамічных правалаў. Знешняя ізаляцыя кепска паўплывала на прамысловы сектар — былы гонар Прыднястроўя. Ужо шмат гадоў на прадпрыемствах не закупляецца новае абсталяванне, няма сучасных тэхналогій. Сапраўдная трагедыя ў тым, што даўно не рыхтуюць кадры для прамысловасці. Адсюль беспрацоўе і феномен масавай эміграцыі моладзі. Патрэбныя сур'ёзныя інвестыцыі, трэба тэрмінова памяняць падыход да падрыхтоўкі і замацавання на прадпрыемствах малодых спецыялістаў. Патрэбна хоць бы ілюзія мадэрнізацыі, каб спыніць працэс эрозіі грамадства і дзяржавы. Трэба як мінімум пацягнуць час.

***— Пацягнуць час у надзеі на што?***

— Мяркуючы па серыі сустрэч Мядзведзева з нямецкім кіраўніцтвам, на якіх узнімалася таксама пытанне ПМР, Крэмль разлічвае ўшчыльную заняцца палітычным урэгуляваннем канфлікту рэспублікі з Кішынёвам і ўз'яднаць два берагі Днястра. У якасці бонуса Крэмль мог бы атрымаць павелічэнне прэстыжу расійскай дыпламатыі, адмову Малдовы ад уступлення ў склад NATO і пашырэнне ўплыву на палітычны працэс у самой Малдове.

***— Як да такой перспектывы маглі б паставіцца ў Кішынёве?***

— Гэта складанае пытанне. Для некаторых нашых партый з'яўленне прыднястроўскай партыі або нават групы партый пайшло бы на карысць. А вось праруминскім сілам у Малдове ўжо складана было б кантраляваць большасць дэпутацкага корпусу. У любым выпадку, калі Германія і Расія знойдуць кампраміс, думка асобных малдаўскіх палітыкаў папросту не будзе такой важнай.

***— Між тым, пакуль Смірноў не змяніў сваё рашэнне — ісці на пяты тэрмін.***

— Магчыма, нейкія перамовы наконт элегантнага сыходу Смірнова з палітычных падмосткаў яшчэ працягваюцца. Як прыклад, нядаўна Камінскі не скарыстаўся магчымасцю нейтралізаваць спадара Смірнова, перашкодзіўшы яму пайсці на новы пяцігадовы тэрмін. Нядаўна парламент ПМР, дзе канстытуцыйная большасць належыць «Абнаўленню», прыняў папраўкі да канстытуцыі, якія павінны былі скараціць неабмежаваныя прэзідэнцкія паўнамоцтвы. Аднак у выніковым варыянце не апынулася абмежаванняў, што тычыліся ўсталявання максімальнага ўзроставага цэнзу для кіраўніка дзяржавы на ўзроўні 65 гадоў (Ігару Смірнову ўвосень спаўняецца 70 гадоў).

***— Калі ўсё ж Смірноў праігнаруе «чорную метку» з Масквы, ці магчымы на берагах Днястру свой прафінансаваны Масквой Майдан?***

— Натуральна, Смірноў можа мабілізаваць на выбары адміністратыўны рэсурс. Намалявацць лічбу. І што далей? 70 працэнтаў бюджэту ПМР фарміруецца за кошт расійскіх датацый. Акрамя таго, Смірноў цудоўна ведае, якую ролю ў ПМР, з яго, дарэчы, згоды, у свой час пачалі гуляць ФСБ і расійская контразведка.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ГЕНАДЗЬ ЗЮГАНАЎ



Лідар Кампартыі Расійскай Федэрацыі (КПРФ) вырашыў стаць адначасова рэінкарнацыяй Мініна і Пажарскага. У Ніжнім Ноўгарадзе на тым самым месцы, дзе ў 1611 годзе пачалася фармавацца армія для барацьбы з войскамі Рэчы Паспалітай, што захапілі Маскву, камуністы абвясцілі пра стварэнне Агульнарасійскага Народнага Апалчэння (ОНО). ОНО будзе альтэрнатывай ОНФ — Агульнарасійскі Народны Фронт — шырокая версія пуцінскай «Адзінай Расіі». Выгнаць Пуціна з Крамля Зюганаў збіраецца з дапамогаю нацыяналізму. Праграмныя пазіцыі ОНО папросту дублююць заклікі нацыяналістычных груповак: вяртанне ў пашпарт пятай графы «нацыянальнасць», барацьба з каналамі «иноэтнической колонизации» ў гістарычных рускіх землях, забарона дыскрымінацыі рускіх і, нарэшце, квота для прадстаўнікоў нацый у дзяржаўных структурах. Чым абумоўлены відавочны адыход КПРФ ад левай лексікі, пакуль не зразумела. Эксперты кажуць, што, магчыма, гэта звязана з відавочным ростам нацыяналістычных настрояў, якія КПРФ жадае выкарыстаць. У любым выпадку, каб такая формула спрацавала, трэба вырашыць праблему Жырыноўскага, які традыцыйна ідзе на выбары як галоўны расійскі патрыёт.

### МАРЫЯ РАУХ-КАЛАТ




Дэпутат аўстрыйскага парламента ад хрысціянскіх дэмакратаў дамагалася змены гімну Аўстрыі, які даўно не падабаўся такім, як яна, феміністкам. Галоўная прычына — другая страфа песні: «Heimat bist du grosser Sohnne» («Ты радзіма вялікіх сыноў»). Чаму выключна сыноў, а таксама не дачок, не зразумелі прыхільнікі канцэпцыі роўнасці палоў. Мужчынская частка парламенту была ўвогуле не супраць карэкцыі, аднак асабліва не спяшалася. Акрамя таго, быў яшчэ адзін рэзон пакінуць рэчы ў тым выглядзе, як ёсць, — аўтарам гімну была жанчына — Паула фон Прэдадовіч. Калі ўжо яна лічыла, што Аўстрыя радзіма вялікіх сыноў, якія могуць быць прэтэнзіі. Тады Марыя вырашыла пайсці на дэмарш. Яна на знак пратэсту супраць старога гімну паклала на стол свой дэпутацкі мандат і заклікала іншых жанчын-дэпутатак зрабіць тое ж самае. Каб не будзіць ліха, лідар кансерватыўнай фракцыі (менавіта кансерватары былі супраць змен) даў згоду на рэформу. Праўда, дасюль невядомая новая версія гімна. Хутчэй за ўсё, у тэкст проста ўваткнуць слова пра дачок (нем: Toehter). Такім чынам, у выніку аўстрыйцы пачнуць спяваць: «Heimat bist du grosser Toehter, Sohnne».

### ГЕНАДЗЬ КЕРНЕС

Мэр Харкава дае майстар-клас наконт таго, як трэба творча асвоіць грошы, якія УЕФА дала на падрыхтоўку Украіны да турніру Еўра–2012. Гарадскі галава нечакана прапанаваў знесці мемарыял незалежнасці Украіны, які стаіць на галоўнай плошчы першай сталіцы Украіны (спачатку цэнтр УССР быў у Харкаве). І гэта напярэдадні 20-годдзя абвяшчэння ўкраінскай дзяржаўнасці! Сваё рашэнне Кернес тлумачыць мастацкай і эстэтычнай слабасцю твору, хаця ў свой час ён быў адным з аўтараў ідэі. Эксперты кажуць, што мэр проста задумаў радыкальную перабудову цэнтру гораду, і для будаўніцтва падземнага камерцыйнага цэнтру трэба пазбавіцца ад усіх помнікаў наверсе. Па разліках, калі Кернес даб'ецца свайго, у яго кішэні асядзе вялікая частка з 20 мільёнаў еўра, якія выдаткаваны на падрыхтоўку гораду да турніру. Хаця чаму тут здзіўляцца? Генадзь Адольфавіч Кернес перад тым, як падаца ў палітыку, спекуляваў чэкамі з «Бярозкі» і гуляў у напарсткі. У крымінальным свеце Харкава мэра некалі звалі Гепа. Удалы шлюб у 2000 годзе з дачкой пракурора Украіны зрабіў яго багатым чалавекам і адчыніў шлях у палітыку. Аднак часам, здаецца, Кернесу хочацца ўзгадаць маладосць.



ПАМЯЦЬ

# ШЛЯХАМ РАССТРАЛЯНЫХ КАЛОН

Таццяна УЛАСЕНКА

**28 чэрвеня 2011 года сябры секцыі «Мемарыял» і Руху Салідарнасці «Разам» наведалі мясціны, дзе напачатку Другой сусветнай вайны супрацоўнікі НКУС расстралялі калоны зняволеных беларускіх турмаў. Актывісты праехалі некалькімі «дарогамі смерці» — да народных помнікаў і магіл, каб ускласці вянкі і кветкі, запаліць знічкі і памаліцца за людзей, якія сталі закладнікамі крывавай палітыкі сталінскага рэжыму.**



Бешанковіцкі раён, бліз в. Мікалаева. Мемарыял забітым вязням Глыбоцкай і Беразвецкай турмаў, усталяваны пры дапамозе польскай грамадскасці



На месцы першага масавага расстрэлу вязняў вілейскай калоны. Злучаныя паміж сабою праваслаўны і каталіцкі крыжы — як сімвал памяці вернікаў розных канфесій, якіх аб'яднала смерць

Тэма злачынстваў сталінскага рэжыму і яго карных органаў супраць уласнага народа, на вялікі жаль, не страціла сваёй актуальнасці.

Напачатку Другой сусветнай вайны ні ў чым не вінаватых людзей, вязняў савецкіх турмаў, сярод якіх былі сяляне, рабочыя, святары розных канфесій, дактары, настаўнікі, моладзь, расстрэльвалі калонамі. Большая частка з іх нават не ведала, за што была асуджана. Артыкулы, як мы ведаем, кляпалі на жонак, дзяцей, сваякоў так званых «ворагаў народа». Па закону «аб трох каласках» каралі нават галодных дзяцей.

Напачатку выправы намеснік старшыні Руха Салідарнасці «Разам» Аляксандр Макаеў адзначыў: «На жаль, тэма масавых забойстваў і рэпрэсій уласнага насельніцтва ў першыя дні вайны не стала рэзананснай у грамадстве. На афіцыйным узроўні прынята думаць, што вайна ўсё спіша. І раней, ведаючы гэта, НКУСаўцы бязбоязна забівалі людзей. Немагчыма даць ацэнку дзеянням камуністаў, якія ўзялі на сябе ролю суддзяў і катаў. Сярод тых, каго яны забілі, былі смелыя, сумленныя і шчырыя людзі. Я лічу сваім доўгам праехаць па «дарогах смерці», каб яшчэ раз нагадаць грамадству пра тыя злачынствы, аб якіх нельга забывацца. Тэме забойства вязняў беларускіх турмаў трэба надаваць больш увагі. Каб не толькі відавочцы ды гісторыкі ўзгадвалі пра тыя страшныя падзеі, але каб і маладое пакаленне, якому выбіраць свой шлях, ведала сапраўдную гісторыю Беларусі».

Удзельнікі жалобнай выправы накіраваліся ў Бешанковіцкі раён, дзе на ўзлеску ля вёскі Мікалаева высілкамі польскага грамадства быў усталяваны помнік забітым вязням Глыбоцкай і Беразвецкай турмаў.

Беларускі дысідэнт Сяргей Ханжанкоў распавёў прысутным, што як толькі супрацоўнікам НКУС быў дадзены загад аб эвакуацыі вязняў з Беразвецкай і Глыбоцкай турмаў, то значную частку людзей адразу расстралялі на месцы. Астатніх пашыхтавалі ў калону і пагналі на ўсход. Калона прайшла Глыбокае, Ушачы і рухалася ў бок Мікалаева. Змучаныя катаваннямі людзі валіліся ад голаду і стомы. Такіх адразу забівалі. 26 чэрвеня 1941 года, калі калона праходзіла каля Вулы, наляцелі нямецкія самалёты, і канваіры вырашылі пазбавіцца ад усіх вязняў — расстралялі іх на месцы. Сярод зняволеных былі ў асноўным падазроныя ў «антысавецкай» і «контррэвалюцыйнай» дзейнасці — жыхары Глыбоччыны, Браслаўшчыны, Міёраў. Значную частку вязняў складалі былыя служачыя Польскай арміі, якіх схапілі яшчэ ў 1939 годзе. Вялікая колькасць вязняў Беразвецкай і Глыбоцкай турмаў яшчэ не атрымалі прысуды, чакалі разгляду сваіх спраў.

Далейшы шлях экспедыцыі ляжаў у вёску Касута, дзе ўдзельнікаў жалобнай выправы сустрэлі актывісты Вілейкі, каб паказаць месцы масавага забойства канвойнымі войскамі НКУС і месца пахавання вязняў Вілейскай турмы.

Ля мемарыяльных крыжоў у памяць аб ахвярах сталінскага генацыду былі ўскладзены кветкі і запалены знічкі. Старшыня мінскай абласной арганізацыі «Партыя БНФ» Аляксей Сюдак распавёў пра лёс вязняў Вілейскай турмы.

— Калі быў дадзены загад аб эвакуацыі вязняў з Вілейкі ў Разанскую турму, іх пашыхтавалі ў калону, каб накіраваць па 120-кіламетроваму шляху ў Барысаў да эшалонаў. Тых вязняў, якія хадзіць не маглі, — расстралялі каля засценкаў. Частку знямоглых арыштантаў расстрэльвалі па дарозе на Барысаў. У пяці кіламетрах ад Вілейкі, ля Касуты падчас налёту нямецкай авіяцыі адбыўся першы масавы расстрэл канвоем калоны зняволеных. Па «дарозе смерці» было забіта каля 150–200 чалавек. Большую частку ахвяр скідвалі ў бульбяныя ямы, нават не закапваючы. Жыхары мясцовых вёсак прыйшлі на гэтае месца і пазнаходзілі сваіх родных, вывезлі іх і пахавалі. Ямы, у якіх спачылі ахвяры, цяпер паглынула пабудаванае на гэтым месцы Вілейскае вадасховішча.

Калі калону падводзілі да Барысава, то высветлілася, што чыгунка перарэзана. Канвойныя войскі развярнулі калону вязняў і зноў пагналі ў Вілейку. А на падыходзе былі нямецкія войскі. Таму было прынята рашэнне ўсіх вязняў расстраляць. Каля турмы было забіта больш за тысячу чалавек.

Сведкі тых падзей распавядаюць, што пасля таго, як савецкая ўлада збегла з Вілейкі, мясцовыя жыхары падышлі пацікавіцца на турму. Камеры былі залітыя крывёю, стаяў жудасны смурод. У яме побач з турмою людзі раскапалі трупы, якія пластамі былі скінуты адзін на аднаго і прысыпаны пяском.

Уладзімір Малярчук паказаў прысутным памятны валун на «лясных могілках», усталяваны на месцы перазахавання ахвяраў. У будынку былой Вілейскай турмы зараз знаходзіцца анкалагічны дыспансер.

КАМЕНТАР

# РАССТРАЛЯЦЬ ПА ДАРОЗЕ

Ігар КУЗНЯЦОЎ, гісторык

**23 чэрвеня 1941 года, на другі дзень вайны, у Мінску адбылося тэрміновае пасяджэнне Бюро ЦК Кампартыі Беларусі на чале з Панамарэнкам, дзе першай была зацверджана дырэктыва аб расстрэле палітычных зняволеных турмаў Заходняй Беларусі.**



Памятны валун на месцы перазахавання астанкаў вязняў Вілейскай турмы

Заўважу — не аб эвакуацыі насельніцтва, не аб стварэнні Камітэта абароны, а менавіта аб расстрэле палітвязняў. Сачылі за выкананнем гэтай дырэктывы наркам НКУС БССР Цанава і НКДБ БССР Матвееў.

Прыклад таго, як праводзіўся адбор на расстрэлы, прывёў у сваіх успамінах адзін з відавочцаў трагедыі ў Трасцянцы. Успаміны сведкі па прозвішчу Цодзік запісаў напачатку 1990-х гадоў журналіст Анатоль Майсеня.

У ноч з 26 на 27 чэрвеня 1941 года зняволеных мінскіх турмаў пасадзілі ў машыны і павезлі ў бок Магілёва. Недзе на 18-м кіламетры ад Мінску машыны павярнулі ўлева. Зняволеных вывелі, выстраілі ў калону і пачалі пытацца, хто з вязняў крымінальнікі (злодзеі, забойцы, гвалтаўнікі і г.д.), а хто палітычныя. Так праводзілася селекцыя. Крымінальнікаў, якіх было няшмат, адвялі ўбок. А палітычных скруцілі дротам і вывелі ў ельнік, там жа адразу і расстралялі. На гэтым месцы зараз знаходзіцца гарадскі сметнік, якім улады пахавалі сляды злачынстваў.

У ліку так званых «палітычных» былі ў асноўным тыя, хто патрапіў пад шырокія і неканкрэтныя артыкулы 58 УК РСФСР і 63–74 УК БССР — «контррэвалюцыйнае злачынства». Для вызначэння пакаранняў яны з'яўляліся базавымі і прадугледжвалі вышэйшую меру. Па гэтых артыкулах праходзілі асуджаныя па так званых законах ад 7 жніўня 1932 года «аб трох каласках», за «падрыў дзяржаўнай гаспадаркі», напрыклад, «нявыплату сельгаспадаткаў» і г.д. Сярод зняволеных у асноўным былі людзі, якія толькі чакалі выраку суду ці рашэння «асобай нарады НКУС СССР», «палітычныя», віна якіх не была даказана. Усе яны былі пушчаны пад расстрэл. Сярод расстраляных Беразвецкай турмы было шмат палонных салдат Польскай арміі, якія трапілі ў савецкі палон у верасні 1939 года.

На шмат якія пытанні афіцыйныя дакументы не даюць адказаў. Па статыстыцы НКУС БССР атрымоўваецца шмат нестыковак, скажэнняў у лічбах і фактах. Прывяду некаторыя цікавыя дадзеныя. Напачатку вайны, па дакументах НКУС 23 чэрвеня 1941 года, на тэрыторыі Беларусі налічвалася: 30 турмаў агульнага тыпу, 24 выпраўленча-працоўных калоній, 32 следчыя і тэрміновыя турмы, у якіх налічвалася 26 237 вязняў. З турмаў, па афіцыйнай статыстыцы ад 1 верасня 1941 года, быў эвакуяваны 11 161 вязень. У дакументах НКУС таксама ўжываецца тэрмін «паспелі эвакуяваць» — што на самай справе азначала: вывесці на задворак турмы і расстраляць альбо расстраляць па дарозе. З акупаванай тэрыторыі, па дадзеных НКУС ад 22 студзеня 1942 года, з Беларусі было эвакуявана 9 573 зняволеных. Не было эвакуявана — 16 048. Засталося ў турмах — 13 950.

Але як маглі застацца ў турмах? На той момант турмы засталіся пустыя, альбо каля іх знаходзілі трупы расстраляных! Вось яшчэ лічбы з тых жа крыніц. Уцяклі — 775 чалавек. Вызвалена «налётам банды» — 76 чалавек. Па ўсёй верагоднасці, мясцовым жыхарам удавалася адбіць зняволеных. Расстраляна ў турмах — 530 чалавек.

Наколькі вядома з дакументаў НКУС, толькі ў Глыбоцкай турме было расстраляна 600 чалавек. Але гэтая лічба заніжаная ў два разы. Бо калі немцы прыйшлі ў Глыбокае, ля сцен турмы яны знайшлі 1,5 тысячы трупаў! У двары Вілейскай турмы было забіта больш за тысячу чалавек — гэта былі тыя, якіх канвойныя войскі НКУС не паспелі расстраляць па дарозе. А былі яшчэ турэмныя калоны, якія былі расстраляны ў раёнах Трасцянца, Жлобіна, Оршы, Віцебска, Гомеля, Чэрвеня і шэрагу іншых. Па ўсіх калонах, якія я пералічыў, у агульнай колькасці было расстраляна не менш 11 000 вязняў. Гэтыя лічбы могуць быць і большыя.

Сёння прынята шмат гаварыць пра цяжкія ваенныя ўмовы, недахоп тэхнікі, боепрыпасаў і г.д. Але ж ці было матэзгодным траціць тыя боепрыпасы на расстрэлы тысяч сваіх людзей, якія маглі ваяваць з нацыстамі і паскорыць перамогу! 22 чэрвеня 1941 года пачалося наступленне на Беларусь — а тут навокал масавыя расстрэлы сваіх жа грамадзян! Ацэнка падзей аб масавых расстрэлах супрацоўнікамі НКУС калон з вязнямі падчас Другой сусветнай вайны будзе самай апошняй, на якую афіцыйныя ўлады дадуць адказ. Нават калі будуць адчынены ўсе архівы.

ФЭСТ

# ГРУНВАЛЬД АДКРЫВАЕ ТАЛЕНТЫ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Быў час, калі «Грунвальдскі фэст» заставаўся для беларускага грамадства, моладзі адзіным напамінам пра вялікую Перамогу нашых продкаў над тэўтонцамі. Цяпер, у шасцісот першую гадавіну Грунвальда, можна канстатаваць, што ў напрамку ўшанавання ваярскага чына беларусаў зроблена не так ужо і мала: адбылося агульнабеларускае святкаванне 600-гадовага юбілею бітвы, ёсць першы помнік героям Грунвальда і яго трыумфатарам — Вітаўту і Ягайлу, — які ўсталяваны сябрамі клуба «Спадчына» ў Старых Дарогах, створаны шматлікія літаратурныя і выяўленчыя творы на гэтую тэматыку, а ў нашых гарадах паступова з'яўляюцца вуліцы з назвай «Грунвальдская», як гэта нядаўна адбылося ў Магілёве.**


Гурт «Рокаш»


Гурт «P.L.A.N.»


Гурт «ROSY»


Танцы ад гурта «Гістрыён»

І ўсё ж «Грунвальдскі фэст» да гэтага часу застаецца буйнейшай культурніцкай акцыяй, мэта якой — прапаганда сярод моладзі слаўных старонак айчыннай гісторыі, а таксама музычных твораў розных напрамкаў, якія ўслаўляюць мужнасць і рыцарскі дух герояў Грунвальда. Менавіта выкананню гэтай місіі і быў прысвечаны чарговы, трэці па ліку, «Грунвальдскі фэст–2011», удзельнікі якога 15 ліпеня нагадалі слухачам пра знакамітую дату ў беларускай гісторыі.

Афіша «Грунвальдскага фэста–2011» абяцала ў гэтым годзе шмат цікавых музычных сустрэчаў з мінулагоднімі ўдзельнікамі гэтай музычна-гістарычнай імпрэзы і нават прэзентацыю альбомаў некаторых з іх, так і незабыўныя выступленні калектываў, якія прадстаўляюць рэгіёны нашай краіны. Гэтыя акалічнасці і штрухнулі аматараў айчыннага рока да таго, каб у летнюю спёку прыйсці на адкрытую пляцоўку парка Чалюскінцаў, дзе быў запланаваны канцэрт «Грунвальдскага фэста–2011».

Першымі на сцэну былі запрошаны музыкі мінскага гурта «UNIA», якія адзін за адным выканалі некалькі сваіх хітоў, каб «разагрэць» публіку. Музыканты змаглі надаць «Грунвальдскаму фэсту» святочны настрой і зрабіць так, каб канцэрт трошкі пазней ператварыўся ў моладзевы танцавальны марафон. Для гэтага музыкі «UNIA» адыгралі адна за адной некалькі сваіх самых завадных кампазіцый: «Вясна», «Ульяна», «Калядо» і іншыя, якія выклікалі гарачыя апладысменты слухачоў.

Фестывальную эстафету падхапілі музыкі гурта «Testamentum Terrae», якім кіруе самавіты і калярытны Юрась Панкевіч. Цікава тое, што нават пры адсутнасці ў афішы ветэранаў «Грунвальдскага фэсту» — гурта «Стары Ольса», «Testamentum Terrae» аднаасобна змог узяць на сябе хэдлайнерскія функцыі і стварыць на фэсце незабыўную атмасферу сярэднявечнага свята, закружыць ахвочых у танцавальнай віхуры. Гэтым разам музыкантам дапамагалі дзяўчаты з танцавальнага гурта «Гістрыён», якія пад рытмы і мелодыі «Беларускай полечкі», «Гандзюленькі», «Кракавяка» і «Рыцара вераб'я», развучвалі старадаўнія па, а потым і пускаліся ў агульныя скокі разам са сваімі «вучнямі». Такая ўжо спецыфіка супольных канцэртаў гуртоў «Testamentum Terrae» і «Гістрыён».

Адной з нечаканасцяў сёлетняга «Грунвальдскага фэсту» стаў удзел у ім гурта «P.L.A.N.» і яго лідара рок-барда Андрэя Плясанава. Чаму нечаканасць? Мо таму, што ў апошні час гэты знаны гурт, адзін з ветэранаў айчыннай рок-сцэны, не так часта клічуць на такія імпрэзы, хоць у рэпертуары гурта «P.L.A.N.» шмат цікавых твораў рок- і фолк-рок тэматыкі, беларускамоўных кавераў на сусветна вядомыя рок-хіты...

Як толькі на сцэну выйшлі музыканты «P.L.A.N.», сярод якіх быў баяніст Анатоль Стэцэнка, то сярод наведвальнікаў фэсту можна было пачуць пытанне: «Што гэта: рок пад баян?» Але, як паказалі далейшыя падзеі, гэты інструмент у таленавітых руках толькі дадаваў свежыні аранжыроўкам гурта «P.L.A.N.», як і іншым удзельнікам канцэрта, якія ў сваім складзе маюць гэты ўніверсальны інструмент нароўні з гітарамі і сінтэзатарамі.

Андрэй Плясанаў разам з сябрамі нагадалі слухачам колькі песень з розных альбомаў гурта, «грунвальдскую» песню «Выправа» на верш Я. Малішэўскага. Але найбольшыя апладысменты выпалі на долю знакамітага хіта «P.L.A.N.» «Добрай табе раніцы, Беларусь!», якую хораша і ўзнёсла заспявалі ўсе ўдзельнікі фестывалю. Гэтыя творы далі падставу слухачам выклікаць кіраўніка гурта Андрэя Плясанава на «біс», і той зрабіў падарунак слухачам — сола выканаў вострасацыяльны зонг «Даміно».

Сярод тых, хто стаяў ля вытокаў многіх медыявальна-музычных фестываляў і акцый, быў і застаецца гурт «Рокаш». Гэтым разам у музыкантаў была падвоеная нагода для святкавання — слаўная дата 601-х угодкаў Грунвальда і прэзентацыя іх доўгачаканага альбома «Запалі агонь». Таму музыканты гурта «Рокаш» з асаблівым пачуццём у гэты дзень выйшлі на сцэну: ім было што прапанаваць слухачам. Адзін за адным прагучалі песні «Рокаша» з новага альбома, якія вельмі спадабаліся тым, хто прыйшоў на «Грунвальдскі фэст». Сапраўднай зоркай прэзентацыі стала вакалістка гурта «Рокаш» Паліна Дулінец, якая дэманстравала цудоўныя вакальныя і артыстычныя здольнасці. Гэта дапамагала Паліне больш яскрава раскрыць унутраны патэнцыял музычных твораў гурта.

Трэба адзначыць, што гучанне гурта апошнім часам стала больш шчыльным і «цяжкім», не ў апошнюю чаргу намаганнямі басіста Лявона Казакова. Відавочна, што альбом «Запалі агонь» стаў для гурта «Рокаш» новай прыступкай для выканаўчага ўдасканалення і творчага росту.

Зноў здзівіў слухачоў і сталічны гурт «Кашлаты Вох»: гэтым разам было значна менш панкаўстага шоў, затое з музычнага і выканаўчага боку гурт падаўся больш сталым і разнастайным. Магчыма, зараз у музыкантаў адбываецца пераацэнка каштоўнасцяў. Не хацелася, каб «Кашлаты Вох» згубіў тое, за што іх любіць публіка. Але відавочна, што гурту трэба шукаць шляхі ў будучыню. І яшчэ, трэба падзякаваць музыкам за тое, што нягледзячы на стылістычныя пошукі, «Кашлаты Вох» не адмаўляецца ад беларускай дуды і ўвесь час выкарыстоўвае ў сваіх канцэртах, адкрывае новыя грані выканаўчых магчымасцяў гэтага нацыянальнага інструмента ў сучасным музычным кантэксце.

Для сталічных слухачоў да часу заставаліся таямніцай імёны іншых удзельнікаў «Грунвальдскага фэсту–2011» — гуртоў «ROSY» са Стоўбцаў і «ОМУТ» (Драгічын—Мінск). І вось вядучы запрасіў на сцэну першых гасцей — гурт «ROSY», які ўжо вядомы слухачам па ўдзелу ў хіт-парадзе партала «Тузін гітоў». А сёння ім выпала магчымасць прадставіць сталічным слухачам у «жывым» гучанні. З першым акордам стала зразумела: «ROSY» — калектыў вопытны і творча ўсталяваны. У музыцы каманды можна адчуць уплывы традыцыйнага рок-н-рола і музыкі кантры. Прынамсі, так падалося слухачам, калі тыя слухалі кампазіцыю гурта пад назвай «Аршанская» і іншыя творы гурта. Але музыкантам блізкія лірычныя і баладныя тэмы і мелодыі. Іх выдатна выконваюць вакалісты (адначасова і гітарысты) гурта Віталь Чарняўскі і Ягор Касцюкоў, дзякуючы якім гучанне гурта набывае мастацкую завершанасць.

І ўсё ж найбольш вольна музыканты сябе пачуваюць у блюзавай стыхіі. Пра гэта засведчыў жартоўны блюз «Чыкага-Стоўбцы», які быў віртуозна выкананы музыкантамі гурта «ROSY» пад несціхальныя апладысменты сталічных слухачоў. «ROSY» зноў засведчылі вялікі патэнцыял рок-музыкантаў з рэгіёнаў, якіх абавязкова трэба прыцягваць да музычных фестываляў і канцэртаў, што праводзяцца ў сталіцы, дапамагаць ім выданні сольных альбомаў.

Яшчэ адно адкрыццё сёлетняга «Грунвальдскага фэсту» — лідары «палескага металу», фолк-рок-гурт з Драгічына «ОМУТ». Тут таксама саліруюць два вакалісты: Эльвіра Стэльмашук — уладальніца магутнага опернага сапрана і штатны «гроўліст» Алесь Максімовіч. Менавіта на спалучэнні здавалася б неспалучальнага: класічнага і рок-вакалу ў яго экстрэмальным выглядзе і базуецца вакальная частка гучання гурта. Да таго ж, гэтыя музыканты, бывае, выкарыстоўваюць у сваіх творах такі рэдкі ў нас еўрапейскі духавы інструмент, як вістл. Калі ён гучыць разам з баянам, то і «металічныя» рыфы «ОМУТа» не падаюцца такімі ўжо неарыгінальнымі. Дакладна, музычныя творы драгічынскіх музыкантаў (гурт быў створаны ў 2009 годзе) былі ўспрыняты з вялікім энтузіязмам, што не магло не адбіцца на настроі музыкаў.

На адным дыханні яны выканалі фальклорныя песні «Ой, у полі рэчанька», «Шэры гусі», аўтарскія песні («Спявай, Зямля»), прадставілі слухачам сваю новую кампазіцыю, якая пакуль не мае назвы. Сэт гурта «ОМУТ» стаў цудоўнай кодай усяму «Грунвальдскаму фэсту–2011». Бо яшчэ раз прадэманстраваў слухачам важкі патэнцыял айчынных выканаўцаў, якія, нягледзячы ні на якія неспрыяльныя ўмовы, зрабілі стаўку на родную беларускую мову.

ПРЭМ'ЕРА

# АЛЯХНОВІЧ ВЯРНУЎСЯ «ШЧАСЛІВЫМ МУЖАМ»

Андрэй РАСІНСКІ

**У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі — летняя прэм'ера. Сын Леаніда Дранько-Майсюка паставіў густоўную музычную камедыю па п'есе выкрасленага аўтара.**







«Шчасліваму мужу» доўга не шанцавала. Спачатку п'есу, якая пабачыла свет у 1922 годзе, назвалі бездзэйнай, пазбаўленай філасофскіх ды сацыяльных падтэкстаў. Потым «бацька беларускай драматургіі» Францішак Аляхновіч, які трапіў у жорнавы таталітарнага стагоддзя, быў наўмысна забыты. Васіль Дранько-Майсюк, які абраў рэжысёрскі псеўданім Мюр Фарыдовіч, напоўніў лёгкую камедыю пра падманутага мужа крохкай настальгіяй па зніклай культуры.

Мешчанін Гаўдэнт Залепка (Зміцер Мядзведзеў) шчаслівы са сваёю жонкаю Магдаленай. Але летуценная Магдалена (Марыя Пятровіч) з падачы прыяцелькі Фэлькі вырашае закруціць амуры з графам Ільдэфонсам Мацальскім. Толькі Ільдэфонс — зусім не той, за каго сябе выдае. Дый муж Магдалены не збіраецца здавацца без бою.

П'еса казыча гледача дасціпнымі спевамі, танцамі, дэкламацыямі. Заліваецца музыка Максіма Іўкіна, грае на скрыпачцы Алена Карагіна, паддаюць жару Раман Лугавы на акардэоне і Уладзімір Такарчук на кантрабасе.

Але «Шчаслівы муж» — густоўная стылізацыя пад нямое кіно і старасвецкую фатаграфію. Апавядальнік — Міхал Зубей (у выкананні Цімоха Ткачова) — фатограф з двума памагатымі-акрабатамі. Цені на шырмах, карункі, вытанчаная мода стогадовай даўніны — гэта эпоха фатальных меладрамаў на белых прасцінах (падзяка бутафорам і сцэнографам Івану Марцінчыку і Волі Вячорцы). Харызматычна-вульгарная Бэла Шпінэр, якая грае прыяцельку гераіні, — гэта драпежная жанчына-вамп з кінасеансаў (дэбютант Дранько-Майсюк прызнаўся, што згадваў Веру Халодную, але Шпінэр болей пасуе сваяцтва з Полаю Нэгры). А два дурня Шышка і Пышка (Ігар Вяпшкоўскі і Кірыл Навіцкі) — гэта раннія кінакамічныя дуэты, якія даставаць публіцы радасць.

Лёгкі дыетычны гратэск: манерная пані Уршуля (Алена Баярава) у пошуках мужчынаў, на якіх можна павесіцца, астраномаматар і алканаўт Калістрат Мяшочак (Максім Паніматчанка) з маленькаю жонкай (Вераніка Буслаева) і дылдаватай дачкой (Юлія Шаўчук). Сямейны кантраст выклікаў шчырае захапленне залі, а палымяныя астранамічныя развагі (пад градусам), пераплюнуць марсіянскую лекцыю з «Карнавальнай ночы».

У арнамент п'есы ўплеценыя і вершы Леаніда Дранько-Майсюка «Усё падман, усё падман» і ў «Вашым голасе квітнеюць астры». Трэба чуць, з якім завываннем чытае іх фальшывы граф Ільдэфонс, каб ацаніць мужнасць паэта. Леанід Дранько-Майсюк аддаў сыну-рэжысёру сваю візітоўную картку на залімітнае камедыйнае гвалтаванне.

Граф Ільдэфонс Галчынскі, сыграны Сяргеем Шымко, — духоўны сваяк Адольфа Быкоўскага: ён такі ж манюка, выхваляка і прайдзісвет. Але Аляхновіч з Купалам спрачаецца; у іх былі, мякка кажучы, сур'ёзныя творчыя разыходжанні (Купала, увогуле, збіраўся прыдушыць Аляхновіча за працяг «Паўлінкі»). І калі Купала пісаў пра вёску, то Аляхновіч — пра горад. З «простага народу» — лёкая, які выдае сябе за графа, дый ягонай жонкі-кухаркі — Аляхновіч кпіць так, як Купала з арыстакрата Быкоўскага.

П'есы Аляхновіча — гэта гарадская культура Беларусі, якая магла быць, але так і не здзейснілася. Летуценныя Магдалены, хвацкія на выдумкі і падман, недарэкі Гаўдэнты, якія пры ўсялякай нагодзе моляцца святому Язэпу, рамеснікі фатаграфіі з выкшталцонымі звычкамі — знесеныя, знішчаныя і забытыя. Вёска захапіла горад і затаптала яго. А зляканым гарадскім сценям, якія ўпотайкі прабраліся на сцэну, застаецца толькі імпэтна спяваць пра шчасце, бо «пытанні за іх вырашаюць».

Радасныя сцені маскуюцца — і пацяшаюць нас. Яны жывуць забытым мяшчанскім побытам, але ён даўно знік — і глебы пад іхнімі нагамі няма. Але сцені ўсё роўна спяваюць.

Пастаноўка, што вярнула іх з забыцця, — ідэальны твор амнезіі. Мы аніяк не сумуем на п'есе, але адразу забываем яе па праглядзе. Тут спрацоўваюць некалькі момантаў.

Твор — не благі і не занадта добры (каб памяць не займаць). Аўтарскія эксперыменты саступаюць месца жанру. Нарэшце, каб на самой п'есе мы не нудзіліся ад звыкласці і прадказальнасці — пануе стыль, а дакладней, стылізацыя; ёсць устаўныя нумары — і лёгкае, амаль эратычнае казытанне ад карункаў, арнаментаў і віньетак.

Такі пяшчотны кіч — глеба гарадское культуры, якой служыў Аляхновіч. Ён вярнуўся сёння «Шчаслівым мужам» — кантрабандаю, летуценна. Але ў гэтых неабавязковых мройлівых летуценнях і пачынаецца горад.




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284—85—11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 793

Падпісана да друку 22.07.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.